**Прыклад з літаратуры**

Падобны настрой мае літаратурны твор паэта Алеся Барскага, прысвечаны гэтай жа тэме, – верш *Беластоцкі край*. У творчасці вядомага "белавежца" можна знайсці шмат вершаў, прысвечаных малой Айчыне, можна сцвярджаць, што гэтая тэма – адна са скразных тэм у паэзіі Алеся Барскага.

Верш *Беластоцкі край* мае падобны настрой, што і карціна Фердынанда Рушчыца. Так як мастак мовай жывапісу, паэт Алесь Барскі з дапамогай паэзіі прызнаецца ў бязмежнай любові да сваёй малой Айчыны. Падобна як жывапісец паказвае канкрэтны дом у Багданаве, паэт таксама канкрэтызуе вобраз Радзімы, пералічваючы дакладныя мясцовасці: Саколку, Бельск, Гайнаўку і іншыя.

Істотную ролю ў паэтычным вобразе малой Айчыны ў вершы *Беластоцкі край* адыгрывае таксама прырода. З вялікай любоўю і пяшчотай паэт апісвае мясцовыя пейзажы, якія складаюцца з лясоў, палёў, далін Беласточчыны. Верш пакідае ўражанне магічнай еднасці чалавека і прыроды, якая акаляе месца, дзе ён нарадзіўся і жыве.

**Падсумаванне**

І карціна Фердынанда Рушчыца *Дом у Багданаве*, і верш Алеся Барскага *Беластоцкі край* раскрываюць вобраз Радзімы праз вобразы малой Айчыны. Гэтыя творы паказваюць, што кожны чалавек перажывае выключныя эмоцыі ў дачыненні да месца, дзе ён нарадзіўся. Нават калі ён жыве далёка ад сваёй малой Айчыны, яна назаўсёды застаецца ў ягоным сэрцы. Паэты і мастакі ўслаўляюць малую Айчыну ў сваёй творчасці, пакідаючы нам узрушлівыя вобразы цішыні і спакою, блізкія кожнаму чалавеку, неабыякаваму да прыгажосці родных мясцін.

**Przykładowa realizacja (2)**

**Уступ**

Нацыянальнае мастацтва, у тым ліку жывапіс і літаратура, немагчымае без элементу, які з'яўляецца яе сэрцам, коранем самасвядомасці народу, – без рэфлексіі

над вобразамі Радзімы. Гэтыя вобразы, у залежнасці ад таго, якія мэты ставіць перад сабой творца, якія думкі і пачуцці хоча выклікаць у адрасатаў сваёй творчасці, бываюць вельмі розныя. У сваім выказванні я хачу звярнуць увагу на дзве розныя перспектывы, з якіх зыходзяць творцы, калі звяртаюцца да тэмы Радзімы.

**Асноўная частка**

Першая перспектыва прадстаўлена на карціне Фердынанда Рушчыца *Дом у Багданаве.* Тут мы маем дачыненне з вельмі асабістым вобразам Радзімы, увасобленым у вясковай хаце мастака. Родная хата, свой кавалак зямлі – гэта тое, з чаго пачынаецца фарміраванне пачуцця нацыянальнай тоеснасці кожнага чалавека. Таму вобраз вясковай хаты, прадстаўлены на карціне *Дом у Багданаве*, адклікаецца ў кожным чалавеку ўспамінамі пра сваю малую Радзіму, асабістымі перажываннямі і асацыяцыямі.

На карціне мы бачым вясковы дом з драўляным плотам, з-за дрэў выглядаюць белыя вокны. Сонца не бачна, але ад белых хмарак адбіваецца сонечнае святло, якое падае на дом. Мяркуючы па надвор'і і зелені, прадстаўленай на карціне, мне падаецца, што гэта летняя пара. У мяне гэта выклікае асацыяцыі з дзяцінствам і сям'ёй, якая, несумненна, з'яўляецца першай крыніцай нацыянальнай свядомасці, якая перадаецца праз матчыну мову і сямейныя традыцыі. Такім чынам, тут мы маем дачыненне з асабістым вобразам Радзімы, жывапісным гімнам малой Айчыне, увасобленай у бацькоўскім доме.

З іншай перспектывы пададзены вобраз Радзімы ў вершы Уладзіміра Караткевіча *На Беларусі Бог жыве*. У ім беларускі пісьменнік другой паловы XX стагоддзя стварае ўзнёслы мастацкі партрэт хараства роднай зямлі і прыгажосці цэлага народа. У адрозненне ад акцэнту на прыватным, адзінкавым на карціне Фердынанда Рушчыца, верш *На Беларусі Бог жыве* звяртае ўвагу на супольнасць, на беларусаў як нацыю, на тое, што ўласціва ўсім беларусам.

У вершы ўжытыя абагульненні: гаворка вядзецца пра ўвесь народ, пра ўвесь край. Падкрэсліваючы еднасць беларусаў як нацыі, Уладзімір Караткевіч абагульняе, што няма прыгажэйшых жанчын, чым беларускія, няма вярнейшых сяброў, чым беларусы. Паэт не пакідае па-за ўвагай і краявіды, аднак гэта не канкрэтныя пейзажы адной мясцовасці, а агульны краявід беларускай зямлі, бо ў вершы згадваюцца і адзінаццаць тысяч азёр, і дваццаць тысяч рэк, і дубровы, і палі ўсёй беларускай зямлі. Вобраз Радзімы тут таксама вельмі ўзнёслы і замілаваны, што пацвярджае яшчэ і тытульнае сцвярджэнне пра тое, што на Беларусі жыве Бог. Такое сцвярджэнне сімвалізуе Божую ласку да беларусаў як нацыі.

**Заключэнне**

Такім чынам, вобразы Радзімы ў тэкстах культуры могуць быць прадстаўлены з розных перспектыў. Напрыклад, на ўзроўні пачуццяў асобнага чалавека да канкрэтнага куточка на зямлі, як гэта зрабіў мастак Фердынанд Рушчыц на карціне *Дом у Багданаве*, і агульна, на ўзроўні пачуццяў да ўсёй беларускай зямлі ў беларускага народа, – як пісьменнік Уладзімір Караткевіч у вершы *На Беларусі Бог жыве*.

Przykład 3.

**Што такое маўленчы этыкет? Адкажы на аснове фрагмента артыкула Лены Леванцэвіч *Маўленчаэтыкетныя сітуацыі “прывітанне”, “развітанне”* і ўласнага камунікатыўнага досведу.**

Лена Леванцэвіч

***Маўленчаэтыкетныя сітуацыі “прывітанне”, “развітанне”***

Сітуацыі маўленчага этыкету дзеляцца на дзве групы: адны з іх з’яўляюцца ўзаемнымі – вітанне, развітанне, удзячнасць і прабачэнне. Другая група маўленчых актаў – выражэнне спачування, віншаванне і інш.– функцыянуе аднабакова.

Маўленчаэтыкетная сітуацыя “прывітанне” – адна з самых распаўсюджаных формул ветлівасці. Вітаючыся са знаёмым, мы пацвярджаем гэтым сваё знаёмства і выражаем жаданне працягнуць яго. Перастаць вітацца – значыць перапыніць адносіны, знаёмства. І наадварот, калі з вамі вітаецца незнаёмы, то гэты чалавек жадае вам лепшага і хоча кантактаваць. Заходзячы ў кабінет, вітаюцца, заходзячы ў купэ вагона, таксама вітаюцца. На вёсцы існуе традыцыя вітацца з усімі, хто ідзе, нават з незнаёмымі.

Нацыянальная адметнасць назіраецца ў формулах маўленчага этыкету. Так, старажытныя грэкі, сустракаючыся, казалі: Радуйся!, старажытныя егіпцяне пыталіся: Як вы пацееце? Сучасныя жыхары Грэцыі кажуць: Будзь здароў!, Манголіі – Як зімуеце? Як качуеце? Як ваша жывёла? Пры вітанні яўрэі жадаюць: Мір вам!, кітайцы пытаюцца: Ці еў ты?, персы зычаць: Будзь вясёлы!, зулусы – Я цябе бачу!, арабы гавораць: Мір з табой!, індзейцы – Усё добра! Расіяне пры сустрэчы жадаюць здароўя: Здравствуйте!, палякі – добрага дня ці вечара: Dzień dobry! Dobry wieczór! […]

Вітанне – знак добразычлівасці, дружалюбнасці, добрага пажадання і пад., якія выражаецца праз словы, рух, жэст, звернутыя да каго-небудзь […]. Кожная формула мае сваю сферу выкарыстання, выражае асаблівыя адносіны. Выбар прывітання залежыць не толькі ад узросту, полу, ступені збліжэння, а таксама ад часу і роду дзейнасці.

Л. Леванцэвіч, *Маўленчаэтыкетныя сітуацыі “прывітанне”, “развітанне”* [у:] *Маўленчы этыкет і культура зносін*, Брэст 2017, с. 36–37.

## Wymagania ogólne

II. Kształcenie językowe.

1. Rozumienie wartości języka ojczystego oraz jego funkcji w budowaniu wspólnoty rodzinnej, narodowej i kulturowej.
2. Kształtowanie odpowiedzialności za świadome posługiwanie się językiem ojczystym.
3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.
4. Zdobycie funkcjonalnej wiedzy na temat wybranych zagadnień z zakresu gramatyki.
5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (słuchania, mówienia, czytania i pisania) w sytuacjach prywatnych i publicznych […].
6. Pogłębianie umiejętności poprawnego mówienia i pisania zgodnego z zasadami poprawności językowej.

## Wymagania szczegółowe

II. 2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
1) […] rozróżnia treści wprowadzane do komunikatu za pomocą znaków werbalnych i niewerbalnych, mając świadomość różnych sposobów ich odbioru i interpretacji;
4) rozpoznaje funkcję języka w tekście;
5) dostrzega zróżnicowanie słownictwa: rozpoznaje słownictwo ogólnonarodowe i słownictwo o ograniczonym zasięgu (wyrazy gwarowe, terminy naukowe, archaizmy i neologizmy, eufemizmy i wulgaryzmy);
6) rozpoznaje wyrazy rodzime i zapożyczone, rozumie ich funkcję w tekście.

II. 3. Komunikacja językowa i kultura języka. Zdający:
1) sprawnie posługuje się oficjalną i nieoficjalną odmianą języka narodowego;
6) rozpoznaje typ nadawcy i adresata tekstu;
9) stosuje zasady etyki i etykiety językowej, wie, w jaki sposób zwracać się do rozmówcy w zależności od sytuacji i relacji z rozmówcą.

II. 4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
2) odczytuje sens tekstu […];
3) dokonuje logicznego streszczenia tekstu argumentacyjnego (wyróżniając kluczowe pojęcia, twierdzenia i sposób ich uzasadnienia);
4) odczytuje sens tekstów […] popularnonaukowych, […] uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte;
5) nazywa swoje reakcje czytelnicze (np. wrażenia);
6) formułuje wnioski wynikające z przesłanek zawartych w tekście;
8) rozpoznaje wypowiedź o charakterze informacyjnym, ekspresywnym i impresywnym;
9) rozpoznaje manipulację językową;
10) odróżnia opinię od faktu;

### Przykładowa realizacja (1)

**Уступ**

У кожным грамадстве і кожнай культуры існуюць свае нормы паводзін, што вызначаюць правілы, паводле якіх адбываецца камунікацыя ў грамадстве. Нормы, якія датычаць слоўнага афармлення паводзін у грамадстве, называюцца маўленчым этыкетам. Прыкладам такіх моўных формул з'яўляюцца ветлівыя звароты, якія ўжываюцца ў сітуацыі прывітання і развітання. На падставе фрагмента артыкула Лены Леванцэвіч *Маўленчаэтыкетныя сітуацыі "прывітанне", "развітанне"* я паразважаю над універсальнымі формамі маўленчага этыкету, а на падставе ўласнага камунікатыўнага досведу – над багаццем ветлівых зваротаў у беларускай мове.

**Асноўная частка**

У фрагменце артыкула Лены Леванцэвіч гаворка вядзецца пра такія ўзаемныя сітуацыі маўленчага этыкету, як прывітанне і развітанне. Аўтарка акцэнтуе ўвагу на значэнні формул маўленчага этыкету ў гэтых сітуацыях: іх ужыванне абазначае жаданне падтрымаць ці наладзіць кантакт з чалавекам, хоць, як далей падкрэслівае навуковец, у некаторых сітуацыях павітацца выпадае і з незнаёмым чалавекам. Як прыклад прыводзіцца факт, што ў вёсцы прынята вітацца таксама з незнаёмымі людзьмі, акрамя гэтага, некаторыя сітуацыі абавязваюць нас павітацца з незнаёмцамі. Лена Леванцэвіч у сваім артыкуле прыводзіць сітуацыю, калі чалавек заходзіць у кабінет ці купэ вагона. Тут можна яшчэ дадаць іншыя падобныя сітуацыі, якія

вымагаюць прывітання з незнаёмымі людзьмі: у краме з касірам, у аптэцы, у ліфце можна і трэба сказаць універсальнае “Добры дзень!”.

У прыведзеным фрагменце артыкула звяртаецца ўвага таксама на тое, што формулы маўленчага этыкету неаднолькавыя ў розных нацыянальных мовах і культурах. Таксама яны адрозніваюцца ў межах адной мовы ў залежнасці ад узросту, полу, ступені збліжэння, роду дзейнасці канкрэтных людзей, якія бяруць удзел у размове. Некаторыя формы прывітання наўпрост залежаць яшчэ і ад пазамоўнай рэчаіснасці, у якой адбываецца акт камунікацыі. Прыкладам на развітанне, у залежнасці ад сітуацыі, мы можам сказаць “Да пабачэння!”, “Да сустрэчы!”, “Пакуль!”, “Бывай!”.

Прывітанні таксама залежаць ад пазамоўнай рэчаіснасці. Напрыклад, калі селянін сустракаў аднавяскоўца, занятага працай, мог павітацца наступным чынам: “Памагай Бог!”. Такая формула таксама азначае добразычлівае стаўленне да таго, з кім вітаешся, а акрамя гэтага – пажаданне Божай дапамогі ў працы. Рэлігійны характар маюць і ветлівыя звароты “Пахвалёны ў хату!” або “Хрыстос ускрос!”. Апошняя форма звязаная з хрысціянскім святам Вялікадня і для яе існуе спецыфічны адказ “Сапраўды ўскрос!”.

Лена Леванцэвіч згадвае таксама пра ветлівыя звароты, якія ўжываюцца аднабакова ў сітуацыях выражэння спачування і віншавання. Я прывяду прыклады такіх ветлівых зваротаў. У сітуацыі спачування можна выкарыстаць такія ветлівыя звароты, як “Прыношу мае сардэчныя спачуванні”, “Смуткую разам з вамі”, “Падзяляю ваша гора”. Гэтыя ветлівыя звароты павінны выказвацца з усёй шчырасцю, інакш яны губляюць сэнс, як і ў сітуацыі віншавання. Для яе ў беларускай мове існуюць такія ветлівыя звароты, як “Сардэчна віншую з …” або больш афіцыйнае “Ад імя … дазвольце павіншаваць з …”.

**Заключэнне**

Такім чынам, галоўным элементам маўленчага этыкету з’яўляюцца ўстойлівыя формулы, ветлівыя звароты, якімі мы карыстаемся ў адпаведных сітуацыях. Беларуская мова вельмі багатая на розныя ветлівыя звароты, а выбар канкрэтнага залежыць не толькі ад сітуацыі, але і ад розных чыннікаў: узросту, сацыяльнага статусу ўдзельнікаў, а нават ад прыналежнасці да пэўнай рэлігіі.

**Przykładowa realizacja (2)**

**Уступ**

Маўленчы этыкет – вельмі важны элемент маўлення, а таксама неад’емная частка нашага штодзённага жыцця. Сутнасць маўленчага этыкету заключаецца ў тым, што існуюць канкрэтныя моўныя звароты, з дапамогай якіх мы афармляем штодзённыя сітуацыі пры камунікацыі. У кожнай мове існуе свой маўленчы этыкет. На падставе фрагмента артыкула Лены Леванцэвіч *Маўленчаэтыкетныя сітуацыі “прывітанне”, “развітанне”* і ўласнага камунікатыўнага досведу я раскажу пра маўленчы этыкет беларусаў і значэнне, якое ён мае для штодзённай камунікацыі.

**Асноўная частка**

У прадстаўленым фрагменце артыкула Лены Леванцэвіч расказваецца пра тое, што маўленчы этыкет у розных нацыянальных мовах бывае розны. Гэта значыць, што ў кожнай мове існуюць свае формулы, якімі людзі карыстаюцца ў розных сітуацыях,

і гэтыя формулы не заўжды азначаюць адно і тое ж. У тэксце навукоўца праводзяцца паралелі моўных формул пры сітуацыі прывітання як самай распаўсюджанай форме ветлівых зваротаў. У сітуацыі прывітання беларусы і палякі найчасцей зычаць добрага дня ці вечара (“Добры дзень!”, “Dzień dobry!”), а, напрыклад, арабы зычаць міру: “Мір вам!”.

Навуковец звяртае ўвагу на тое, што ветлівыя звароты ў адной і той жа сітуацыі могуць адрозніваціца і ў залежнасці ад таго, хто бярэ ў ёй удзел. Прыкладам, вітаючыся з сябрамі і людзьмі майго ўзросту, па-беларуску я кажу “Прывітанне!”, “Здароў!”, а вітаючыся са старэйшымі, ужо не магу так сказаць, а абяру больш фармальныя ветлівыя звароты: “Добры дзень!”, “Добрай раніцы!”, “Добры вечар!”.

У іншай сітуацыі, нават калі мы вітаемся з людзьмі нашага ўзросту, няма магчымасці выкарыстоўваць нефармальныя прывітанні ці развітанні. Лена Леванцэвіч звяртае ўвагу на тое, што формула ветлівага звароту можа залежаць ад роду дзейнасці і іншых акалічнасцей. Да прыкладу, калі наш равеснік адначасова з’яўляецца нашым кіраўніком на працы, то нельга сказаць яму на развітанне нефармальнае “Пакуль!”, а трэба выкарыстоўваць больш нейтральнае і афіцыйнае “Да пабачэння!”.

У прыведзеным фрагменце артыкула даследчыца звяртае ўвагу таксама на важнасць гэтых формул. Паводле яе, невыкарыстанне ветлівых зваротаў у адпаведнай сітуацыі азначае нежаданне падтрымання добрых адносін. Часам здараецца, што пасля невыбачальнай крыўды людзі перастаюць вітацца, але я лічу, што выкарыстанне асноўных ветлівых зваротаў з’яўляецца абавязковым для культурнага і выхаванага чалавека. Па гэтай прычыне нельга адмаўляцца ад выканання правіл элементарнага этыкету. Гэтым мы паказваем не толькі свае адносіны да чалавека, але і ўзровень сваёй культуры. Невыкананне правіл этыкету могуць адмоўна адбіцца на меркаванні ўсіх людзей пра нас, таму нават у цяжкіх сітуацыях варта трымацца правіл нацыянальнага моўнага этыкету.

**Заключэнне**

Такім чынам, маўленчы этыкет – гэта сістэма ўстойлівых моўных зваротаў, прынятых у канкрэтным грамадстве, якія выкарыстоўваюцца ў тыповых сітуацыях камунікацыі. Прыкладам такіх формул з’яўляюцца тыповыя ветлівыя звароты ў сітуацыях прывітання і развітання. Яны афармляюць штодзённую размову, прычым у розных абставінах, у залежнасці ад сацыяльнага статусу, пары дня і іншых абставін у беларускай мове ўжываюцца розныя ветлівыя звароты.

# 2.2. Przykładowe zadania z rozwiązaniami. Część pisemna na poziomie podstawowym

W *Informatorze* dla każdego zadania podano:

- liczbę punktów możliwych do uzyskania za jego rozwiązanie (po numerze zadania)
- najważniejsze wymagania ogólne i szczegółowe, które są sprawdzane w tym zadaniu
- zasady oceniania rozwiązań zadań
- poprawne rozwiązanie każdego zadania zamkniętego oraz przykładowe rozwiązania każdego zadania otwartego.

## Część 1. *Test językowy*

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

### Tekst 1.

Паводле Марыны Хоміч

***Маўленчы этыкет***

Этыкет узнік як цырымонія дэманстрацыі іерархічнай улады. Само слова “этыкет” узнікла ў Францыі і ўжываецца з часоў Людовіка XIV. Сучаснае разуменне паняцця этыкету, як падае “Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы” (Мінск, 1999) значыць ‘устаноўлены парадак паводзін, формы абыходжання ў якім-небудзь асяроддзі, грамадстве’.

Сёння ў грамадстве вылучаецца вялікая колькасць этыкетных знакаў. Агульнанацыянальныя знакі і знакі сацыяльнага асяроддзя (сацыяльнай групы, вузкага кола людзей) заўсёды нясуць важную інфармацыю: свой – чужы, далёкі – блізкі, знаёмы – незнаёмы і інш.

У маўленчым этыкеце важна вылучыць правілы, якіх павінны прытрымлівацца суразмоўцы, паколькі ў непасрэдным кантакце тэкст нараджаецца спантанна і не падлягае хуткаму выпраўленню.

Да асноўных правілаў моўцы можна залічыць наступныя:

- Забараняецца сваім маўленнем шкодзіць адрасату (крыўдзіць, зневажаць, абражаць). Неабходна пазбягаць прамых негатыўных ацэнак асобы субяседніка, якія не спрыяюць дасягненню камунікатыўнай згоды.
- Камуніканты павінны быць ветлівымі: неабходна ўлічваць узрост, пол, службовае і грамадскае становішча адрасата, іншыя яго сацыяльныя пазіцыі і ролі. Трэба добра ведаць, што можна сказаць добраму знаёмаму ў неафіцыйных абставінах і што непажадана гаварыць малазнаёмаму ў афіцыйных абставінах.
- Моўцу не рэкамендуецца ставіць у цэнтр увагі сваё “я”, не навязваць субяседніку асабістых меркаванняў.

- Моўца павінен памятаць, што слухач у непасрэдных зносінах не толькі чуе яго, але і бачыць, прымае мноства сігналаў невербальнай камунікацыі (жэсты, позы, міміку).

Слухача дыскусіі таксама абавязваюць асобныя правілы:

- Неабходна перапыніць свае справы і ўважліва выслухаць тое, пра што паведамляе моўца.
- Слухаючы, неабходна добразычліва, з павагай і цярпліва ставіцца да моўцы: слухаць тактоўна, уважліва і да канца.
- Слухаючы моўцу, неабходна пастарацца не перапыняць яго, не рабіць няслушных заўваг.

Сацыяльныя ролі камунікантаў маюць вялікае значэнне ў этыкеце маўлення, паколькі ў вызначэнні сацыяльнай ролі чалавека ў грамадстве вельмі важнымі з'яўляюцца паняцці пазіцыі і функцыі. Пазіцыя выяўляецца агульным становішчам у сацыяльным асяроддзі – статус дзіцяці, школьніка, студэнта, чалавека дарослага або састарэлага, бацькі, маці, сына, служачага, працоўнага і г.д. Для ўсіх гэтых відаў сацыяльных пазіцый характэрны спецыфічныя функцыі, пры гэтым тая ці іншая сацыяльная роля ў свядомасці людзей звязана з пэўным узорам паводзін. Для нас важна ўлічваць найперш пастаянныя (сталыя) прыкметы: пол, узрост, месца жыхарства, ступень адукаванасці, прафесію, становішча чалавека ў сям'і.

Адным з найбольш стабільных паказчыкаў пасляховасці маўленчага акта з'яўляецца ступень выхаванасці і адукаванасці камунікантаў. Па гэтай прыкмеце людзі падзяляюцца на носьбітаў літаратурнай мовы і прастамоўя. Заўважым, што гэтыя прыкметы не ізаляваныя адна ад другой, яны складаюцца разам, утвараючы так званы ланцужок: інтэлігент старэйшага пакалення, вясковы чалавек з вышэйшай адукацыяй, хатняя гаспадыня і інш. Да сталых прыкмет суразмоўцаў дадаюцца пераменныя, сітуацыйныя. Іх мы таксама выкарыстоўваем кожны дзень: гэта пасажыр, пацыент, кліент, пакупнік і інш. Ад сталых прыкмет яны адрозніваюцца тым, што могуць хутка змяняцца. У маўленчых паводзінах чалавека пастаянна адбываецца выкананне сацыяльных і сітуацыйных роляў, арыентацыя ў агульнасацыяльным становішчы і ў ролях адрасата, ацэнка афіцыйнасці і неафіцыйнасці камунікацыйнай сітуацыі.

Такім чынам, у маўленчых паводзінах кожны чалавек застаецца непаўторнай індывідуальнасцю, але ў той жа час знаходзіцца ў межах сацыяльных узаемадачыненняў з іншымі людзьмі. Веданне этыкетных норм з'яўляецца неабходным элементам у маўленні свядомага, адукаванага чалавека, бо ў гэтым адлюстроўваецца культура і выхаванне чалавека.

М. Хоміч, *Маўленчы этыкет беларусаў і палякаў* [у:]
http://elib.bsu.by

## Zadanie 1. (0–1)

**У кантэксце ўсяго тэксту М. Хоміч растлумач значэнне словазлучэння *маўленчы этыкет*.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

## Wymagania szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   2) odczytuje sens tekstu (a w nim znaczenia wyrazów, związków frazeologicznych, zdań, grup zdań porządkowanych w akapicie), potrafi wydzielić jego fragmenty i objaśnić ich sens oraz funkcję na tle całości;
   6) formułuje wnioski wynikające z przesłanek zawartych w tekście.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Маўленчы этыкет – гэта правілы маўленчай камунікацыі, якіх прытрымліваюцца суразмоўцы. У працэсе маўленчай камунікацыі пад увагу бяруцца сацыяльныя ролі камунікантаў.

## Zadanie 2. (0–1)

**Ацані праўдзівасць пададзеных ніжэй сцверджанняў на падставе тэксту *Маўленчы этыкет*. Выберы П, калі сцверджанне праўдзівае, або Н – калі сцверджанне непраўдзівае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Аўтар тэксту прааналізаваў дыялагічнае маўленне. | **П** | **Н** |
| **2.** | У тэксце аўтар падаў нормы маўленчай камунікацыі. | **П** | **Н** |
| **3.** | Аўтар тэксту прааналізаваў моўныя сітуацыі, у якіх выкарыстоўваюцца крыўдныя, зняважлівыя выслоўі. | **П** | **Н** |
| **4.** | Аўтар тэксту сцвярджае, што ў працэсе камунікацыі пад увагу слухачом бяруцца не толькі словы, але і міміка, жэсты. | **П** | **Н** |

## Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

## Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   4) odczytuje sens tekstów [...] popularnonaukowych, [...] uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

**1.** Н
**2.** П
**3.** Н
**4.** П

## Zadanie 3. (0–1)

**Да якой групы слоў належаць лексемы *адрасат* і *адрасант*? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** сінонімы
**Б.** антонімы
**В.** амонімы
**Г.** паронімы

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
    3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
    5) dostrzega zróżnicowanie słownictwa, rozpoznaje słownictwo ogólnonarodowe [...].

### Zasady oceniania

1 pkt – zaznaczenie poprawnej odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

Г

## Zadanie 4. (0–1)

**З прапанаваных пытанняў выберы тыя, на якія можна знайсці адказ у канкрэтных абзацах (іх нумары пададзены ў табліцы) тэксту *Маўленчы этыкет*. Упішы ў табліцу літару, якая адпавядае пытанню.**

**а)** Ці існуе залежнасць паміж адукаванасцю і культурай маўлення?
**б)** Ці бярэцца пад увагу ў працэсе маўленчай камунікацыі сацыяльнае становішча суразмоўцаў?
**в)** Ці тон нашага голасу ўплывае на развіццё маўленчай сітуацыі?
**г)** Чаму ў маўленчым этыкеце так важна захоўваць ролі моўцы і слухача?
**д)** Чым адрозніваюцца ролі моўцы і слухача ў працэсе камунікацыі?
**е)** Калі ў Еўропе з’явіўся маўленчы этыкет?

| абзац | пытанне |
|---|---|
| 4 | |
| 6 | |
| 7 | |

## Wymaganie ogólne
II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

## Wymaganie szczegółowe
4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   4) odczytuje sens tekstów [...] popularnonaukowych, [...] uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte.

## Zasady oceniania
1 pkt – podanie trzech poprawnych odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie
**4** – г;
**6** – б;
**7** – а.

## Zadanie 5. (0–2)
**У якім стылі напісаны тэкст *Маўленчы этыкет?* Падай дзве характэрныя асаблівасці гэтага стылю.**

стыль – ...........................................................................................................................

асаблівасці:

**1.** ...........................................................................................................................

**2.** ...........................................................................................................................

## Wymaganie ogólne
II. Kształcenie językowe.
   3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

## Wymaganie szczegółowe
4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   1) wskazuje charakterystyczne cechy stylu danego tekstu, nazywa zastosowane w nim środki językowe i określa ich funkcje w tekście.

### Zasady oceniania
2 pkt – wskazanie stylu tekstu oraz dwóch jego cech gatunkowych.
1 pkt – wskazanie stylu tekstu oraz jednej jego cechy.
0 pkt – odpowiedź niepełnaą lub błędnaą albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie
Стыль – навуковы.
Асаблівасці:
1. Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі;
2. Паслядоўнасць перадачы думак.

## Zadanie 6. (0–1)
**Напішы, якому слову з 2 абзаца адпавядае значэнне:**

“Сукупнасць людзей, аб'яднаных пэўнымі адносінамі, якія абумоўлены спосабам вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей // Эканамічны лад і адпаведная яго надбудова”*

..................................................................................................................................

**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* [online]

### Wymaganie ogólne
II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

### Wymaganie szczegółowe
2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   6) rozpoznaje wyrazy rodzime i zapożyczone, rozumie ich funkcję w tekście.

### Zasady oceniania
1 pkt – podanie poprawnego wyrazu.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie
грамадства

## Zadanie 7. (0–1)
**У першым сказе 7 абзаца выкарыстана слова *акт.* З якім з трох значэнняў, пададзеных у *Тлумачальным слоўніку беларускай мовы*, яно суадносіцца? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**1.** Адзінкавае праяўленне якой-небудзь дзейнасці, дзеянне, учынак.
**2.** Афіцыйны дакумент: пратакол, запіс аб якім-небудзь юрыдычным факце.
**3.** Закончаная частка драматычнага твора або спектакля.

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   6. Pogłębianie umiejętności poprawnego [...] pisania zgodnego z zasadami poprawności językowej.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   6) rozpoznaje wyrazy rodzime i zapożyczone, rozumie ich funkcję w tekście.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

1

## Zadanie 8. (0–1)

**Ад якога слова нельга ўтварыць форму адзіночнга ліку? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** людзі
**Б.** знакі
**В.** паводзіны
**Г.** функцыі.

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   4. Zdobycie funkcjonalnej wiedzy na temat wybranych zagadnień z zakresu gramatyki.

### Wymaganie szczegółowe

1. Gramatyka. Zdający:
   1) odmienia części mowy.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

B

## Zadanie 9. (0–1)

**Якія з пададзеных ніжэй слоў з’яўляюцца сінонімамі? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**1)** этыкет – эстэт
**2)** этыкет – цырымонія
**3)** этыкет – бірка
**4)** этыкет – урачыстасць

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   5) dostrzega zróżnicowanie słownictwa, rozpoznaje słownictwo ogólnonarodowe [...].

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

2

## Zadanie 10. (0–3)

**Напішы рэзюмэ аб’ёмам 40–60 слоў да тэксту *Маўленчы этыкет*.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   6. Pogłębiania umiejętności poprawnego [...] pisania zgodnego z zasadami poprawności językowej.

### Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   3) dokonuje logicznego streszczenia tekstu argumentacyjnego (wyróżniając kluczowe pojęcia, twierdzenia i sposób ich uzasadnienia).

### Zasady oceniania

3 pkt – ze streszczenia wynika, jaki jest temat tekstu i co na ten temat powiedziano w tekście; adekwatny poziom uogólnienia, streszczenie logicznie spójne, właściwa liczba słów.
2 pkt – ze streszczenia wynika, jaki jest temat tekstu i co na ten temat powiedziano w tekście, ALE występują zaburzenia dotyczące poziomu uogólnienia LUB logicznej spójności streszczenia.
1 pkt – ze streszczenia wynika, jaki jest temat tekstu i co na ten temat powiedziano w tekście, ALE występują zaburzenia dotyczące poziomu uogólnienia ORAZ logicznej spójności streszczenia.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna LUB brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Маўленчы этыкет – гэта правілы паводзін людзей падчас вербальнай камунікацыі. Гутарку варта весці так, каб адбылася эфектыўная і паспяховая размова. У маўленчым этыкеце ролі моўцы і слухача рэгулююцца пэўнымі правіламі. Супольнымі для іх з’яўляюцца пашана, добразычлівасць і ветлівасць падчас размовы. Веданне этыкетных нормаў сведчыць аб асабістай культуры і адукацыі чалавека.

## Tekst 2.

Паводле Моргана Вікэрса

***Кніжная крама на колах, або Як стаць шчаслівым***

Два гады таму Мелані Мур выглянула ў акно і пабачыла “Фольксваген Транспарцёр” 1962 года. Аўтамабіль стаяў у яе двары ўжо даўно, але гэтым разам дзяўчына паглядзела на яго іншымі вачыма.

Мелані, 25-гадовая настаўніца, даўно марыла прадаваць кнігі і нават збіралася падпісаць кантракт з адной кніжнай крамай. Аднойчы ёй у рукі трапіла кніга Крыстафера Морлі “Парнас на колах” пра кніжнага гандляра, які развозіў тавар у павозцы. Таму, паглядзеўшы ў акно, Мелані вырашыла, што яна таксама можа прадаваць кнігі, толькі з аўтобуса, больш за тое, яна можа паехаць куды захоча. Ад ідэі да яе ўвасаблення прайшоў год. […]

І хаця аўтобус цалкам незалежны і мабільны, Мур шукае партнёраў сярод уладальнікаў кавярняў, дамаўляецца з рынкамі ў Цынцынаці, каб запаркаваць там аўтобус і прадаваць кнігі дзень або два. Узімку або ў спёку яе запрашаюць кавярні і дазваляюць прадаваць кнігі ўнутры. У добрае надвор’е Мур выстаўляе кнігі на адкрытым паветры, запрашае наведвальнікаў пазнаёміцца з яе прапановамі.

І для бізнесу, і для дзяўчыны такія адносіны выгадныя. Яе аўтобус злучае праз сябе мясцовых прадпрымальнікаў, выбудоўвае сацыяльныя сувязі не горш за сацыяльныя сеткі. Больш за тое, аўтобус мае сваіх сталых кліентаў, якія чакаюць яго і прыводзяць сваіх знаёмых. Для кавярняў прыняць Мелані і яе аўтобус – своеасаблівы сацыяльны бізнес. Шмат хто з супрацоўнікаў кавярні рэгулярна набывае кнігі ў дзяўчыны. […]

А яшчэ Мелані падабаецца пачуццё супольнасці, якое дае крама на колах. Яе муж часта ездзіць у камандзіроўкі, і ёй падабаецца суправаджаць яго, наведваць кніжныя крамы і выбіраць кнігі для сваіх пакупнікоў з самых розных раёнаў Амерыкі. У яе нават ёсць паліца з кнігамі, якіх не набудзеш у ЗША, бо Мелані прывозіць іх з іншых краін.

Яе гонар – цікавыя і ўнікальныя кнігі і гэта не заўсёды бестселеры паводле New York Times. Каб прапанаваць нешта вартаснае сваім чытачам, Мур вымушаная чытаць амаль кожную кнігу, што стаіць на паліцы яе крамы. Часта Мелані набывае кнігі на адмысловыя мерапрыемствы, што ладзяць яе партнёры па бізнесе. Напрыклад, калі праходзіла канферэнцыя па хатнім навучанні дзяцей, яна прывезла шмат дзіцячай і адукацыйнай літаратуры. А калі яна наведвала парад класічных машын, то прывезла кнігі пра машыны і вандроўкі.

Мур стварае вакол сябе супольнасць з прыхільнікаў літаратуры. Яна разумее, што не можа пазнаёміць чытачоў з многімі кнігамі, таму яна актыўна карыстаецца сацыяльнымі сеткамі, дзе публікуе паведамленні пра цікавыя кніжныя крамы, якія сустракае на сваім шляху.

І хаця Мелані больш не настаўніца, яе жыццё па-ранейшаму звязанае са школай. Падчас сваіх паездак яна набывае кнігі для школьных бібліятэк і вучняў у раёнах штата, дзе цэны ніжэйшыя, і такім чынам дапамагае навучальнаму працэсу і знаёмству дзяцей з літаратурай. Для яе найбольшае задавальненне – бачыць дзіця, якое трымае ў руках кнігу. Яна шчаслівы чалавек, бо змагла спалучыць для сябе важныя рэчы – навучанне і продаж кніг.

Паводле roadtrippers.com [у:] https://budzma.by

## Zadanie 1. (0–2)

**З 1 абзаца тэксту *Кніжная крама на колах, або Як стаць шчаслівым* выпішы фразеалагізм і растлумач яго значэнне.**

фразеалагізм:

……………………………………………………………………………………………………

значэнне:

……………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

### Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   2) odczytuje sens tekstu (a w nim znaczenia […] związków frazeologicznych […]), potrafi wydzielić jego fragmenty i objaśnić ich sens oraz funkcję na tle całości.

### Zasady oceniania

2 pkt – podanie poprawnego frazeologizmu i jego znaczenia.
1 pkt – podanie poprawnego frazeologizmu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Фразеалагізм: паглядзела (на яго) іншымі вачыма.

Значэнне: інакш ставіцца да каго-небудзь, чаго-небудзь, ацэньваць з іншага пункту погляду.

## Zadanie 2. (0–1)

**На аснове ўсяго тэксту прывядзі два прыклады, з якіх вынікае, што кнігарня на колах спрыяе развіццю іншых ініцыятыў:**

**1.** ........................................................................................................................

**2.** ........................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

### Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   3) dokonuje logicznego streszczenia tekstu argumentacyjnego (wyróżniając kluczowe […] twierdzenia i sposób ich uzasadnienia).

### Zasady oceniania

1 pkt – podanie dwóch poprawnych przykładów.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

**1.** Кнігарня на колах дапамагае пазнаёміцца мясцовым прадпрымальнікам.
**2.** Кнігарня наладжвае сацыяльныя сувязі.

## Zadanie 3. (0–1)

**Сфармулюй і запішы пытанні да наступных абзацаў:**

*3 абзац:* ........................................................................................................................

*6 абзац:* ........................................................................................................................

*8 абзац:* ........................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

## Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   4) odczytuje sens tekstów [...] publicystycznych, [...] uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte.

## Zasady oceniania

1 pkt – sformułowanie trzech poprawnych pytań.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

3 абзац – Дзе адбываецца продаж кніг, калі на дварэ дрэннае надвор’е?
6 абзац – Якім чынам адбываецца падборка кніг для продажу?
8 абзац – Ці дапамагае гераіні тэксту папярэдні прафесійны досвед у продажы кніг?

## Zadanie 4. (0–1)

**Ці пададзеныя ў табліцы сцвярджэнні адпавядаюць зместу 4 і 5 абзацаў тэксту? Падкрэслі ТАК, калі сцвярджэнне адпавядае зместу, альбо НЕ, калі не адпавядае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Кнігарню на колах Мелані Мур атрымала ў спадчыну ад Крыстафера Морлі. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Такі спосаб гандлю дазваляе Мелані Мур плаціць менш падаткаў. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Папярэдні прафесійны досвед гераіні тэксту дапамагае ёй у працы на колах. | **ТАК** | **НЕ** |

## Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

## Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   4) odczytuje sens tekstów publicystycznych, uwzględniając zawarte w nich informacje zarówno jawne, jak i ukryte.

## Zasady oceniania

1 pkt – trzy poprawne odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

**1.** НЕ
**2.** НЕ
**3.** ТАК

## Zadanie 5. (0–1)

**Падбяры на аснове тэксту антонімы да пададзеных ніжэй слоў:**

*халадэча* - ............................................................................................................

*рэдка* - ..................................................................................................................

*разбураць* - ...........................................................................................................

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   6) rozpoznaje wyrazy rodzime i zapożyczone, rozumie ich funkcję w tekście.

### Zasady oceniania

1 pkt – podanie trzech poprawnych antonimów.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

халадэча – спёка
рэдка – часта
разбураць – будаваць

## Zadanie 6. (0–1)

**Вызнач, да якой часціны мовы адносяцца словы *па-ранейшаму, узімку, даўно.***

..................................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

I Kształcenie językowe.
   4. Zdobycie funkcjonalnej wiedzy na temat wybranych zagadnień z zakresu gramatyki.

### Wymaganie szczegółowe

1. Gramatyka. Zdający:
   1) rozpoznaje części mowy .

### Zasady oceniania

1 pkt – podanie właściwej części mowy.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

прыслоўе

## Zadanie 7. (0–2)

**На аснове 3 і 4 абзацаў тэксту *Кніжная крама на колах, або Як стаць шчаслівым* запоўні табліцу. Падбяры слова да значэння, або значэнне – да слова.**

| Lp. | значэнне | слова |
|---|---|---|
| **1.** | Стан атмасферы ў пэўны час у пэўным месцы. | |
| **2.** | | упершыню |
| **3.** | Камерцыйная, біржавая або прадпрымальніцкая дзейнасць. | |
| **4.** | | мабільны |

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
 2. Kształtowanie odpowiedzialności za świadome posługiwanie się językiem ojczystym.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
 5) dostrzega zróżnicowanie słownictwa, rozpoznaje słownictwo ogólnonarodowe i słownictwo o ograniczonym zasięgu.

### Zasady oceniania

2 pkt – cztery poprawne odpowiedzi.
1 pkt – trzy poprawne odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

**1.** надвор’е;
**2.** першы раз;
**3.** бізнес;
**4.** здольны хутка перамяшчацца; рухомы.

## Zadanie 8. (0–1)

**Пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў. Да якога тыпу лексікі адносіцца вылучанае слова ў наступным сказе:**

*Яе гонар – цікавыя кнігі, але яны не заўжды **бестселеры** паводле New York Times.*

**А.** грэцызм
**Б.** эўфемізм
**В.** неалагізм
**Г.** жарганізм

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   2. Kształtowanie odpowiedzialności za świadome posługiwanie się językiem ojczystym.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   5) dostrzega zróżnicowanie słownictwa, rozpoznaje słownictwo ogólnonarodowe i słownictwo o ograniczonym zasięgu […].

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

В

## Zadanie 9. (0–1)

**Якое з прапанаваных ніжэй слоў з'яўляецца сінонімам да слова *арыгінальны*? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** аўтэнтычны;
**Б.** самавызначальны;
**В.** артадаксальны;
**Г.** своеасаблівы.

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

### Wymaganie szczegółowe

2. Zróżnicowanie języka. Zdający:
   2) rozpoznaje wyrazy wieloznaczne i rozumie ich znaczenia w tekście.

### Zasady oceniania

1 pkt – podanie poprawnej odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

Г

## Zadanie 10. (0–2)

**З прыведзеных ніжэй сказаў выберы і пазнач два складаназалежныя.**

**А.** І для бізнесу, і для дзяўчыны такія стасункі выгадныя.
**Б.** А яшчэ Мелані падабаецца пачуццё супольнасці, якое дае крама на колах.
**В.** Яе гонар – цікавыя кнігі, але яны не заўжды бестселеры паводле New York Times.
**Г.** Для яе найбольшае задавальненне – бачыць дзіця, якое трымае ў руках кнігу.

## Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.
   3. Poznawanie pojęć służących do opisywania języka jako narzędzia komunikacji.

## Wymaganie szczegółowe

1. Gramatyka. Zdający:
   4) analizuje zdania złożone współrzędnie i podrzędnie […].

## Zasady oceniania

2 pkt – wskazanie dwóch poprawnych odpowiedzi.
1 pkt – wskazanie jednej poprawnej odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

Б, Г.

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

### Zadanie 1. (0–3)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент *Прадмовы да ўсёй Біблii* Францыска Скарыны і выканай заданні 1.1. і 1.2.**

Біблія – грэчаскае слова, па-руску гэта азначае – кнігі. Так святы апостал Мацвей пачынае Хрыстова дабравесце: “Біблос генезеос Ісусу Хрысту”, па-руску гэта значыць “Кніга народзін Ісуса Хрыста”. Так з-за іх асаблівай значнасці можаце называць усе кнігі Старога і Новага Запавету, бо поўная Біблія ўсё гэта змяшчае...

Біблія дзецям і людзям простым – кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым – для захаплення.

Біблія – дзівосная рака! Яна бывае мелкай, і нават авечка можа перайсці! Але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе! У гэтай кнізе – пачатак і канец усёй існуючай мудрасці, бо толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-усетрымальніка! **У гэтай кнізе** – усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! **У гэтай кнізе** – усе лякарствы душэўныя і цялесныя разам знойдзеце! Тут – навучанне філасофіі дабранраўнае: як Бога любіць для самога сябе і для бліжняга свайго! **Тут** – справа ўсялякага збору людскога і гораду, якія праз веру, ласку і згоду паспалітую дабро памнажаюць. **Тут** – поўнае навучанне сямі навук вызваленых!

Жадаеш ведаць Граматыку, ці, па-нашаму кажучы, грамату, якая вучыць правільна чытаць і гаварыць, – звяртайся да Бібліі. Чытай у ёй кнігу “Псалтыр”.

Наважышся асвоіць Логіку, што вучыць пры дапамозе аргументаў адрозніваць праўду ад хлусні, – чытай “Кнігу святога Іова” [...].

У Бібліі – сутнасць сямі навук вызваленых!

*пераклад са старабеларускай І. Саверчанкі*

Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Біблii* [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2013, с. 214–218.

**1.1. Твор Францыска Скарыны належыць да эпохі Адраджэння. Якія ідэалы Адраджэння адлюстроўваюцца ў прыведзеным фрагменце і ўсёй прадмове? Назаві два ідэалы і коратка давядзі, што яны прысутнічаюць у *Прадмове*....**

**1)** ……………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

**2)** ……………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   2) zna prądy literackie i artystyczne w epokach literackich, określa ich cechy.
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] kulturowy, filozoficzny [...].

## Zasady oceniania

2 pkt – podanie dwóch poprawnych cech Odrodzenia z uzasadnieniem.
1 pkt – podanie jednej cechy z uzasadnieniem.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

**1)** Гуманізм. Ф. Скарына ставіць чалавекалюбства ў цэнтр сваёй *Прадмовы…* : “Тут – навучанне філасофіі дабранраўнае: як Бога любіць для самога сябе і для бліжняга свайго!”

**2)** Культ навукі і навучання. Ф. Скарына прапануе выкарыстоўваць яго пераклады Біблії для адукацыі: “Біблія дзецям і людзям простым – кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым – для захаплення”.

**1.2. Які стылістычны сродак выдзелены тлустым шрыфтам у трэцім абзацы пададзенага тэксту? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** метафара
**Б.** рытарычнае пытанне
**В.** антытэза
**Г.** анафара

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu [...].

## Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie anafory.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

Г

## Zadanie 2. (0–1)

**Растлумач значэнне асобных элементаў пададзенай ніжэй алегорыі ў кантэксце ўсёй *Прадмовы да ўсёй Біблії* Францыска Скарыны.**

Біблія – дзівосная рака! Яна бывае мелкай, і нават авечка можа перайсці! Але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе!

“Авечка” абазначае …………………….....……………..………………………………………

“Слон” абазначае …………………………....…….…………………………………………..

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu [...].
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki, kulturowy [...].

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna interpretacja alegorii.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

“Авечка” абазначае чытача наіўнага і малаадукаванага.
“Слон” абазначае чытача дасведчанага і адукаванага.

## Zadanie 3. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент апавядання *Плачка* Яна Баршчэўскага і выканай заданні 3.1. і 3.2.**

Непадалёку ад дарогі, калі едзеш на Віцебск, стаіць пустая капліца. Там, пасля захаду сонца, бачылі, што яна плакала, седзячы на парозе, і яе маркотны голас далёка адзываўся.

Рознае думалі людзі пра гэтую Плачку. Адны баяліся, што яна вяшчуе нейкае вялікае няшчасце, вайну, паморак або голад ва ўсім краі.

Па вёсках старыя людзі гаварылі між сабою пра гэтую кабету, заўсёды прадказваючы нешта дрэннае. Некаторыя ж з маладых мелі зусім іншую думку. Яны даводзілі, што там, дзе з’яўляецца Плачка, напэўна, скарб у зямлі. І ўся ваколіца ўпадабала гэтую думку.

На канцы тае вёскі жыў убогі чалавек, які даўней абышоў увесь свет. Вярнуўшыся да свае сям’і, жыў толькі з міласціны. Ён часта паўтараў усім: “Браты! Слёзы і нараканні гэтае жанчыны абяцаюць вам не золата і срэбра. Кабета плача на парозе забытае вамі святыні. Вы думаеце толькі пра багацце, а вас чакаюць няшчасці і пакуты.” […]

Я. Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях*, укладанне, пераклад і каментар М. Хаўстовіча, Варшава 2012, с. 459–460.

**3.1. Ацані праўдзівасць пададзеных ніжэй сцверджанняў. Выберы П, калі сцверджанне праўдзівае, або Н, калі сцверджанне няпраўдзівае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Апавяданне *Плачка* Я. Баршчэўскага напісана ў рэчышчы рамантызму. | **П** | **Н** |
| **2.** | Вобраз Плачкі – гэта алегарычны вобраз Беларусі, пра якую забыліся яе грамадзяне. | **П** | **Н** |

**Wymaganie ogólne**

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.
3. Pogłębianie zdolności rozumienia wartości o charakterze narodowym [...].

**Wymaganie szczegółowe**

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy (np. ojczyzny [...]).
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki, kulturowy [...], biograficzny.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

**1.** П
**2.** П

**3.2. На падставе пададзенага фрагмента і ўсяго апавядання растлумач, у чым заключаецца сімвалізм месцаў, у якіх звычайна бачаць Плачку?**

……………………………………………………………………………………………………...

……………………………………………………………………………………………………...

……………………………………………………………………………………………………...

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.
3. Pogłębianie zdolności rozumienia wartości o charakterze narodowym [...].

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, [...] słowa-klucze, [...] puenta)
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki [...].

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawnie uzasadnienie.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Плачку звычайна бачаць на месцах пакінутых беларускіх святыняў ці пахаванняў нацыянальных герояў, што сімвалізуе дакор усім людзям, якія выракліся сваёй гісторыі і, адпаведна, беларушчыны.

## Zadanie 4. (0–3)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент паэмы *Тарас на Парнасе* Канстанціна Вераніцына і апішы, чыімі вачыма чытач бачыць багоў у паэме Канстанціна Вераніцына? Адкажы на падставе пададзенага фрагмента і ўсёй паэмы.**

Вось б'юцца Марс ды з Геркулесам,
А Геркулес, як той мядзведзь, –
Каб цешыць старага Зевеса,
Хахол ён Марсу добра мнець.
Зевес жа наўзніч лёг на печы,
Сярмягу ў голавы паклаў...
Ён грэў на печы стары плечы
І нешта ў барадзе шукаў.
Во перад люстрам задам меліць
І маслам мажа валасы
Ды нечым белым твар свой беліць
Вянера, знаць, дзеля красы.
Амур жа з дзеўкамі жартуе,
Ну, проста смех ажно бярэ!
То ён знянацку пацалуе,
То хустку з галавы здзярэ;
То на гармоніку зайграе,
То німфам песню запяе,
То адным вокам заміргае,
Як быццам бы каго заве. […]

К. Вераніцын, *Тарас на Парнасе* [у:] Я. Грыгарук, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 2 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2016, с. 63.

…………………………………………………………………………………………………...

…………………………………………………………………………………………………...

…………………………………………………………………………………………………...

…………………………………………………………………………………………………...

**Wymaganie ogólne**

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

**Wymaganie szczegółowe**

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, [...] słowa-klucze, [...] puenta)

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У паэме *Тарас на Парнасе* на Парнас і яго насельнікаў, багоў і літаратараў, чытач глядзіць вачыма наратара – палясоўшчыка Тараса, які выпадкова трапляе на Парнас.

## Zadanie 5. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент *Ліста з-пад шыбеніцы* Кастуся Каліноўскага. Напішы, з якой гістарычнай падзеяй звязана творчасць Кастуся Каліноўскага.**

**Ліст другі**

Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, – но не жаль згінуць за тваю праўду.

Прыймі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як з таго света толькі для дабра твайго напісана. […]

Для таго, Народзе, як толька калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б’юцца за праўду й свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, за касу, сакеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную.

Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасліва, калі над табою Маскаля ўжэ не будзе.

Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні

К. Каліноўскі, *Лісты з-пад шыбеніцы* [у:] http://knihi.com/

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego.
   2. Pogłębianie znajomości historii narodowej [...].

## Wymaganie szczegółowe

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego. Zdający:
   3) rozumie związek poznanych utworów z życiem narodu [...].

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wskazanie wydarzenia historycznego.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Творчасць Кастуся Каліноўскага звязана з паўстаннем 1863–1864 гадоў.

## Zadanie 6. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент п'есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча *Пінская шляхта* і выканай заданні 6.1. і 6.2.**

*Марыся:* […] Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу найяснейшая карона на прасоку. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў пояс ды будзем прасіць ды маліць, […]. А ён такі сярдзіты, не дапускай ты госпад! Як наставіць адзін вус угору, а другі ўніз ды крыкне: па найяснейшаму ўказ–! − то бацькі спалохаюцца ды зладзяць нам вяселле...[…]

*Дзесяцкі:* Усе сабраліся, хто з курыцаю, хто з кадобчыкам мёду, а хто з сушонай рыбай. Чакаюць, што ваша міласць ім прыкажа.

*Кручкоў:* Добра! Няхай усе аддадуць хурману, ды спакуйце там харашэнька ў возе... Ты пакліч сюды Ціхона Пратасавіцкага з кабетаю. А Цюхай-Ліпскі з сынам ёсць?[…] Добра, добра! Усё ўпакаваць асцярожна! Ды кліч усіх сюды![…]

*Кручкоў:* Ну, дык добра! Следства кончана, цяпер будзе суд, а наўперад: па указу всеміласцівейшай гасударыні Елісаветы Петровны 49-га апреля 1893-га года і всеміласцівейшай Екацярыны Вялікай от 23-го сенцябра 1903-га года, а равномерно в смысле Статута літоўскаго раздзела 8-га, параграфа 193-га, коім назначается в пользу суда от цяжушчыхся грывны. […] Жалуюшчыйся Ліпскі ў палавіне того; сведкі, каторыя бачылі драку, а не баранілі, – па 9-ці рублёў, а вся прочая шляхта, што не бачыла дракі, за тое, што не бачыла, – па 3 рублі. Плаціце!

*Ціхон:* Э... глядзі ты! Як ён на бяду нашу ўсе ўказы і законы як рэпу грызе і не заікнецца, – хрэн яму ў вочы!

*Куліна:* Чаго тут дзівіцца? Відаць, судовы чалавек, дык ён на тым і зубы згрыз, – такая, бач, парода. […]

*Кручкоў:* Вот я тут зараз цэлую справу кончу. Налівайце кубкі! […]

В. Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта* [у:] http://knihi.com

**6.1. Дакажы, што ў творы *Пінская шляхта* выступаюць тры віды камізму, падаючы прыклады з усяго твора.**

камізм характару……………………………………………………………………………………

камізм сітуацыі……………………………………………………………………………………

камізм слова………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego […].

## Zasady oceniania

1 pkt – przytoczenie poprawnych przykładów do każdego z trzech typów komizmu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Камізм характару – абмежаванасць, невуцтва, свавольства шляхты ў час суда.
Камізм сітуацыі – залёты старога Куторгі да маладой Марысі.
Камізм слова – выказванні Ціхона: хрэн табе ў вочы.

**6.2. Да якога жанру драматычнай літаратуры належыць п'еса Вінцэнта Дуніна-Марцікевіча *Пінская шляхта*? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** трагікамедыя
**Б.** трагедыя
**В.** бурлеск
**Г.** фарс-вадэвіль

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) rozpoznaje gatunki literackie, potrafi wymienić ich cechy.

## Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie poprawnej odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

Г

## Zadanie 7. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент *Прадмовы да “Дудкі беларускай”* Францішка Багушэвіча і выканай заданні 7.1. і 7.2.**

Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! […] Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. **Чытаў я ці мала старых папераў**, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася.

Францішак Багушэвіч, *Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”* [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ*, Warszawa 2001, с. 74–75.

**7.1. Акрэслі, пра які гістарычны перыяд ідзе гаворка ў сказе, пачатак якога вылучаны тлустым шрыфтам.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego lub etnicznego.
   2. Pogłębianie znajomości historii narodowej [...].

## Wymaganie szczegółowe

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego lub etnicznego. Zdający:
   7) rozumie związek poznanych utworów z życiem narodu [...].

## Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie poprawnego okresu historycznego.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У *Прадмове…* гаворыцца пра перыяд Вялікага Княства Літоўскага.

**7.2. На падставе ўсёй *Прадмовы…* абгрунтуй думку, што тэкст напісаны ў форме заклiку. Падай дзве рысы, якiя сведчаць на карысць гэтай тэзы.**

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje gatunki literackie, potrafi wymienić ich cechy.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawne podanie dwóch cech apelu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Тэкст напiсаны ў форме заклiку, таму што аўтар непасрэдна i з хваляваннем звяртаецца да сваiх землякоў, маючы на мэце паўплываць на iх стаўленне да беларускай мовы.

## Zadanie 8. (0–1)

**Прачытай фрагмент верша *Ахвяра* Францiшка Багушэвiча.**

Малiся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам нiколi не быў:
Не жадаў бы нiколi чужога,
Сваё дзела як трэба рабiў.
Каб праз меншым я носу не драў,
А прад большым не корчыў спiны,
Каб грэх свой прад сабой я пазнаў,
У другiх каб не вiдзеў вiны;
Чужых жон каб не вёў да граху,
А сваю каб як трэба любiў,
Каб мне дзецi былi у слуху,
Каб я бацькам для iх век дажыў.
Каб людзей прызнаваў за братоў,
А багацтва сваё меў за iх,
Каб за край быў умёрцi гатоў,
Каб не прагнуў айчызны чужых. […]

Ф. Багушэвiч, *Ахвяра* [у:] http://knihi.com

**Выберы і пазнач два з прыведзеных ніжэй загалоўкаў твораў, дзе таксама раскрываецца вобраз селяніна.**

**А.** Максім Багдановіч, *Хто мы такія*.
**Б.** Якуб Колас, *Новая зямля*.
**В.** Змітрок Бядуля, *Пяць лыжак заціркі*.
**Г.** Максім Гарэцкі, *Рускі*.

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...] oraz ich funkcje w utworze.
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] literacki.

### Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie dwóch poprawnych utworów.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

Б, В.

## Zadanie 9. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент апавядання Змітрака Бядулі *Пяць лыжак заціркі*.**

Яшчэ не паспела яна адказаць свайму Антосю, які ляжаў на пяколку і стагнаў, – а то ад болю, не то ад голаду – як з усіх бакоў апанавалі яе дзеці – немаведама, хлопчыкі ці дзяўчынкі, бо яны былі адзеты ўсе ў доўгія да пят кашулькі... Запішчэлі яны ўсе ў адзін голас:

– Мамка зацільку гатуе!

І блішчэлі іх галодныя вочы ад радасці...

Гэта было вясной, якраз у тую пару, калі галадуха пануе па вёсках, калі няма чым і муху накарміць. Апошні запас выйшаў, хоць зубамі ляпай; шчаўя яшчэ нямашака... Горкае цяпер жыццё ў хворага Антося. Ён сам рабіць не можа. Адна толькі жонка працуе на яго і дзяцей.

Учора ёй, Агаце, пашанцавала. Яна выенчыла ў суседа фунт мукі на зацірку.

Вось і гатуе яна для сямейкі снеданне... У цёмнай малой хатцы вялікае свята... давай скакаць вакол маці і цягнуць за фартух і спадніцу, як галодныя ваўчаняты. [...]

*

Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце...

*

І шчаслівая сямейка хваталася за лыжкі.

– Ай! Ай! – запішчэлі дзеткі...

Пазіралі, пазіралі яны на гарачую зацірку і не вытрывалі – зноў давай есці... Ажно слёзы каціліся з вачэй...

З. Бядуля, *Пяць лыжак заціркі* [у:] http://knihi.com

**На падставе ўсяго апавядання патлумач, чаму аўтар падкрэслівае: “кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце”.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

### Wymagania ogólne

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego.
   2. Pogłębianie znajomości historii narodowej [...].

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   2. Rozumienie zależności między wydarzeniami historycznymi a literaturą [...].

### Wymagania szczegółowe

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego. Zdający:
   3) rozumie związek poznanych utworów z życiem narodu [...].

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

У апавяданні Змітрака Бядулі паказана праблема голаду ў беларускай вёсцы пачатку XX стагоддзя. У галодны час і пяць лыжак заціркі становяцца ўвасабленнем шчасця, якім беларусы, згодна з традыцыйным правілам гасціннасці, дзеляцца з такой жа галоднай суседкай.

## Zadanie 10. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент апавядання Змітрака Бядулі *На каляды к сыну.***

Смачна ёй была сухая скарынка хлеба, а без хлеба таксама было добра... […]
І давай, быццам гарачыя вуголлі, закрытыя попелам, выгартаць з сэрца наверх свае захаваныя жаданні, сваю глыбокую веру ў даражэнькага сына... […]
Цешылася маці:

– Во будзе падмога на старасць!
Цыпрук на гэта ёй часта гаварыў:
– Эт, дурная ты авечка. Яго падмогу сарока хвастом замяце. Чакай ад яго пад старасць пацехі, як ад рабой сучкі яек!
– Замаўчы ўжо! Стары, як малы! […]
Стукалася, стукалася яна ў дзверы, пакуль нехта адчыніў. […]
Тым часам адчыніліся дзверы з другой стараны ды ўвайшоў малады пан у чорным сурдуце...
– Лаўручок мой! Сынок! – як непрытомная, кінулася да яго Тэкля...
– Роднен...
Ён раптам пачырванеў, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:
– Чаму вы пускаеце ў пакой розных жабрачак шалёных?!
– Ідзі! ідзі! – звярнуўся ён да яе глуха, адрывіста, – ідзі, старушка! Я цябе... не знаю...
– А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?! Гэта ж...
Ён бразнуў дзвярамі і пайшоў у пакоі... […]
– Ад пана!..
Яна нават не чула, як з яе акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына. Некалькі трохрублёвых прыліплі да макраватага тратуара...

З. Бядуля, *На каляды к сыну* [у:] https://knihi.com

**На падставе ўсяго твора давядзі, што апавяданне належыць да літаратуры рэалізму, падаючы дзве рысы рэалістычнага твора, якія прысутнічаюць у тэксце.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne
III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe
1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   2) zna prądy literackie i artystyczne w epokach literackich, określa ich cechy.
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki [...].

## Zasady oceniania
1 pkt – poprawne wskazanie dwóch cech realizmu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У творы паказваецца жыццё чалавека ў суаднесенасці з канкрэтнай эпохай з яе канкрэтнымі з'явамі і праблемамі: сялянскі сын, які знайшоў працу ў горадзе, выракаецца сваёй старой і неадукаванай маці. Шмат увагі надзяляецца ў апавяданні псіхалагічнаму вобразу герояў – Тэклі і Цыпрука.

## Zadanie 11. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент адозвы Цёткі *Шануйце роднае слова*.**

Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здалее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы, – гэта вялікае мілаванне чалавека, – слабога, пакрыўджанага. […]

Да нашай моладзі звяртаемся мы з гэтымі словамі. Вы, маладыя, найчасцей пападаеце між чужых людзей, што вашай мовы не шанують, "простай", "мужыцкай" завуць. З вас часта насмяхаюцца, калі гаворыце па-свойму. І вы, чуючы гэта, пачынаеце саромецца матчынай мовы, свайго народа, сваёй радні. Так разрываецца тая жывая звязь, што злучае вас з беларускім народам. Аб ім вы забываеце. Чужых багоў прымаеце: чужую гутарку, звычаі, чужое імя. […]

Быў у нас пясняр, што ў час спячкі народнай першы адважыўся клікаць беларусаў, каб шанавалі мову бацькоў і дзедаў сваіх. **"Не кідайце мовы сваёй, каб не ўмёрлі"**… […]

На вас – моладзі – ляжыць вялікая павіннасць: развіваць далей родну мову, узбагачываць свой народ знаннем і культурай. Вы здабываеце навуку для сябе, дык дзяліцеся ёю з тымі, хто для вас цяжкай працай здабывае кусок хлеба. Толькі не кідайце роднай мовы: бо запраўды для свайго народа тады вы ўмёрлі!

Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды галасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя, зразумеюць, што шчырае сэрца беларускае б'ецца не толькі пад мужыцкай сярмягай, павераць у ўласныя сілы свае і пойдуць цвёрдай ступой да лепшай будучыны, да ясных зор шчасця народнага.

Цётка, *Шануйце роднае слова!* [у:] https://knihi.com

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

**1.** Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (puenta, motto);
10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki [...]

### Zasady oceniania

1 pkt – podanie poprawnego tytułu i autora.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

Прадмова да “Дудкі беларускай” Мацея Бурачка (Францішка Багушэвіча).

## Zadanie 12. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент апавядання *Апокрыф* Максіма Багдановіча і выканай заданні 12.1. і 12.2.**

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...
2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў
3. зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі пракрокі.
4. І хадзіў Ён па ўсім Забраным Краі і па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі.
5. І разам з ім святы Пётра і святы Юр’я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго. […]
7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падышоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.
8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх.
9. Бо няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе.
10. І навучаючы яго, казаў: пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго. […]
27. І, кажучы так, пачуў Ён песню жнеек, і прамовіў: слухайце, што кажуць словы гэтай песні. Яе складалі людзі, якія ведаюць, чаго варты хлеб.
28. Яны ж пачулі, што словы тэй песні кажуць: няма лепш цвяточка над васілёчка. І далей ужо моўчкі ішлі яны.
29. І босыя ногі Хрыста пакідалі на цёплым, мяккім пылу дарогі сляды.
30. Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх.

Амін.

*Рукапіс гэты адшукаў Максім Багдановіч*

М. Багдановіч, *Апокрыф* [у:] Я. Грыгарук, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 2 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2016, с. 197–198.

**12.1. Якую праблему ставіць Максім Багдановіч у апавяданні *Апокрыф*? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** Вера і бязвер’е ў сучасным свеце.
**Б.** Абыякавасць людзей да Бога.
**В.** Роля мастацтва ў жыцці чалавека.
**Г.** Роля працы ў жыцці чалавека.

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (puenta, motto);

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

В

**12.2. На падставе ўсяго апавядання Максіма Багдановіча растлумач значэнне загалоўка.**

……………………………………………………………………………………………………...

……………………………………………………………………………………………………...

……………………………………………………………………………………………………...

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania utworu (tytuł [...]).

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie tytułu opowiadania.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

**Przykładowe rozwiązanie**

Апокрыфам называецца твор на біблейскую тэматыку, не ўключаны ў канон пэўнай рэлігіі. Максім Багдановіч, выкарыстоўваючы фармальныя прыкметы Бібліі (нумарацыя радкоў, інверсія ў сказах, галоўныя героі – Хрыстос і святы Пётра), стварае апакрыфічную гісторыю пра Хрыста, які апраўдвае музыку, што не працуе фізічна, але стварае нешта важнае – мастацтва.

## Zadanie 13. (0–2)

**Прачытай *Санет* Максіма Багдановіча і выканай заданні 13.1. і 13.2.**

Ахвярую А. Пагодзіну

*Un sonnet sans défaut*
*vaut seul un long poème.*
*Boileau**
*Беззаганны санет*
*варты адзін цэлае паэмы.*
*Буало (фр.)*

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршку насення жменю там знайшлі.

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясновай збожжа на раллі.

Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў, крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

М.Багдановіч, *Санет* [у:] М. Багдановіч, *Вянок. Кніжка выбраных вершаў*, Вільня 1913, с. 92.

**13.1 Вызначы галоўную думку верша.**

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
 1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (puenta, motto);

## Schemat punktowania

1 pkt – poprawne ujęcie przesłania utworu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У творы М. Багдановіч сцвярджае думку, што беларускі народ, нягледзячы на шматгадовы “сон”, знойдзе ў сабе сілы (як засохлыя зернейкі з магілы), каб адрадзіцца да нацыянальнага жыцця.

**13.2. Напішы, хто з’яўляецца адрасатам верша. Свой адказ абгрунтуй.**

…………………………………………………………………………………………………….

…………………………………………………………………………………………………….

…………………………………………………………………………………………………….

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
 1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu (z zakresu podstaw wersyfikacji [...]) i określa ich funkcje.
   9) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego (sytuacja liryczna [...]).

## Schemat punktowania

1 pkt – poprawne określenie adresta wiersza z uzasadnieniem.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

**Przykładowe rozwiązanie**

Адрасатам верша з'яўляецца беларускі народ, на што ўказвае метанімія "забыты краю родны".

## Zadanie 14. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй верш *Спадчына* Янкі Купалы і пазнаёмся з карцінай Уладзіміра Сулкоўскага *Зямля беларуская*.**

Янка Купала
***Спадчына***

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пастбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладзьбішчы.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

Я. Купала, *Вершы*, Мінск 1988.



Уладзімір Сулкоўскі, *Зямля беларуская* [у:] Ян Карчэўскі, *Родная літаратура, Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класа агульнаадукацыйнага ліцэя,* Беласток 2019.

**У чым заключаецца падабенства матыву роднай старонкі ў вершы Янкі Купалы і на карціне Уладзіміра Сулкоўскага? Абгрунтуй сваё меркаванне.**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy […] oraz ich funkcje w utworze,
   9) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania […] świata przedstawionego […].
2. Odbiór tekstów kultury. Zdający:
   1) interpretuje dzieła sztuki.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wskazanie podobieństwa.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Падабенства матыву роднай старонкі ў вершы Янкі Купалы і на карціне Уладзіміра Сулкоўскага заключаецца ў карцінах прыроды. Як у адным, так і ў другім творы выяўлены тыповыя беларускія пейзажы, сагрэтыя ўсведамленнем таго, што яны – частка пакінутае продкамі спадчыны.

## Zadanie 15. (0–1)

**Прачытай верш Янкі Купалы *Лета.***

Лета ты, лета прыгожа-квяцістае,
Колькі ты ўносіш аздобы з сабой!
Цягнуцца стройна шнуры каласістыя,
Пахне павабна трава над ракой.

Гнуцца на лузе касцы немарудныя,
Дзе-нідзе ў постаці серп заскакаў;
Песня пачулася наская, нудная, –
Рэха панеслася – бор адказаў.

Шум пакаціўся ад лесу адзетага;
Сонца купаецца ў полыску рос;
Эх! каб, здаецца, ды шчасце да гэтага!
Эх, каб, здаецца, менш гора і слёз!..

Я. Купала, *Вершы*, Мінск 1988.

**Адкажы, якая тэма, акрамя прыроды, закранута ў творы. Абгрунтуй свой адказ.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
8) rozpoznaje podstawowe motywy […];
11) dostrzega obecne w utworach literackich oraz innych tekstach kultury wartości narodowe i uniwersalne.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

У вершы Янкі Купалы *Лета*, акрамя апісання прыгажосці прыроды ўлетку, прысутнічае матыў занепакоенасці грамадскай сітуацыяй і лёсам чалавека, на што ўказваюць заключныя радкі: “Эх! каб, здаецца, ды шчасце да гэтага!//Эх, каб, здаецца, менш гора і слёз!..”.

## Zadanie 16. (0–3)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент паэмы *Курган* Янкі Купалы і выканай заданні 16.1. і 16.2.**

VII
“Гэй ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел свет,
Не такую задумаў ты думу, –
Не дае гуслярам сказу золата цвет,
Белых хорамаў п’яныя шумы.

Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая,
Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.

Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, –
Ім пакорны я толькі з гуслямі,
Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

Славен, грозен і ты, і твой хорам-астрог,
Б’е ад сцен-цэгел лёдам зімовым;
Сэрца маеш, як гэты цагляны парог,
І душу – як скляпоў гэтых схові […]

IX
Стол ты ўставіў ядой, косцей шмат пад сталом, –
Гэта косці бядноты рабочай;
Пацяшаешся белым, чырвоным віном, –
Гэта слёзы нядолі сірочай.

Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
Адшліфованы цэгла і камень, –
Гэта – памяткі-пліты з няўчасных магіл,
Гэта – сэрцаў скамененых пламень.

Люба чуці табе скочнай музыкі звон:
Ты, дружына п’яце асалоду, –
А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
Стогн пракляцця табе, твайму роду?!

Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны княжа-ўладар!
Госці хмурны, а дворня знямела...
Ну, што, княжа? пара даць за песню мне дар!
Выбачай, калі спеў мо няўмела”.

Янка Купала, *Курган* [у:] http://knihi.com

**16.1. Апішы, у чым заключаецца драматызм канфлікту паміж галоўным героем і князем у паэме *Курган*.**

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu (z zakresu podstaw wersyfikacji [...]) i określa ich funkcje.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Князь мае ўладу і чакае ад беднага гусляра абсалютнае пакоры, але гусляр, ведаючы, што чакае яго суровае пакаранне, не можа здрадзіць свайму народу і сваім гуслям (як сімвалу мастацтва), бо лічыць сваім абавязкам (і абавязкам мастацтва) заўсёды казаць праўду.

**16.2. Які момант з жыцця гусляра адлюстраваны мастаком Міхаілам Басалыгам у пададзенай ніжэй ілюстрацыі да паэмы? Апішы момант на падставе ўсёй паэмы і абгрунтуй свой адказ.**



Я. Купала, *Курган*, мастак М.С. Басалыга, Мінск, 1987.

Момант: ………………………………………………………………………………..………………

Абгрунтаванне: ……..…………………………………………………………………………..…

………………………………………………………………………..……………….………

………………………………………………………………………..……………….………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki, kulturowy […].
2. Odbiór tekstów kultury. Zdający:
   1) interpretuje dzieła sztuki.

## Zasady oceniania

2 pkt – poprawne wskazanie wydarzenia z uzasadnieniem.
1 pkt – poprawne wskazanie wydarzenia bez uzasadnienia.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

**Момант:** Ілюстрацыя паказвае момант, калі па загадзе князя гусляра “вядуць на згубу”: “Падхапілі, ўзялі гусляра-старыка./Гуслі разам яго самагуды:/Па-над бераг круты, дзе шумела рака,/Павялі, паняслі на загубу.”
**Абгрунтаванне:** На карціне бачна, як гусляра хапае княжацкая стража, у яго няма ўжо гусляў у руках, значыць, ён скончыў сваю песню. Твар ягоны ўказвае на разуменне непазбежнай згубы.

## Zadanie 17. (0–2)

**У лісце ў “Нашу ніву” ад 1 жніўня 1912 года Максім Багдановіч пісаў, што Янка Купала паэмай *Курган* “уваскрашае сто гадоў назад пахаваны рамантызм”. Пагадзіся або аспрэч ацэнку Максіма Багдановіча, падаючы дзве характэрныя рысы рамантызму і іх суаднесенасць з паэмай Янкі Купалы.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

Рысы рамантызму:

**1)** ……………………………………………………………………………………………

**2)** ……………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
  1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   2) zna prądy literackie i artystyczne w epokach literackich, określa ich cechy,
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki [...].

### Zasady oceniania

2 pkt – podanie dwóch poprawnych cech romantyzmu z odniesieniem do poematu.
1 pkt – podanie jednej poprawnej cechy romantyzmu z odniesieniem do poematu.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Паэма *Курган* сапраўды мае рысы рамантызму.
**1)** Выкарыстанне фальклорных матываў (у паэме аўтар стварае на ўзор фальклорнай сваю легенду пра паўстанне кургана).
**2)** Стварэнне вобраза рамантычнага героя (Гусляра), які валодае незвычайнаю сілаю духа.

## Zadanie 18. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй верш Наталлі Арсеннeвай *Малітва*.**

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхай і ветлай
рассып праменне Свае хвалы.

Дай спор у працы штодзённай, шэрай.
На хлеб штодзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць – дай!

Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
Краіну нашу і наш народ!

Н. Арсеннева, Малітва [у:] http://www.laidinen.ru

**Адкажы, ці адлюстроўвае загаловак верша яго форму і змест? Абгрунтуй свой адказ.**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu […].

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne uzasadnienie.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Назва верша адлюстроўвае яго форму і змест. Ён вытрыманы ў форме і духу малітоўнае паэзіі. Гэта зварот-малітва да Бога з просьбаю дапамагчы ў працы як “на хлеб штодзённы”, так і “на родны край”.

## Zadanie 19. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент верша Наталлі Арсенневай *Ускрэсні* і выканай заданні 19.1. і 19.2.**

Ён уваскрос,
Ён – дзесь між намі, […]
Ідзе Хрыстос... Над Ім дугою
ўстае густы блакіт нябёс,
а ногі ў ранах незагойных
кладуць сляды на шэрань рос...[…]
ускрэсне Край,
бо й Ён ускрос!
Мацней за смерць,
за ўсё,
каханне
зямлі, дзе ад дзіцяці ўзрос...
Устань жа, ўстань,
ускрэсні сёння,
мой Край, як уваскрос Хрыстос!

Н. Арсеннева, *Выбраныя творы*, Мінск 2002, с. 259–260.

**19.1. Акрэслі, якую функцыю ў вершы выконвае біблейскі матыў уваскрашэння.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy (np. ojczyzny, poety, matki, ziemi, inne) oraz ich funkcje w utworze.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie funkcji biblijnego motywu.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Уваскрашэнне Хрыста сімвалічна атаясамліваецца з уваскрашэннем (адраджэннем) Беларусі. Верш, напісаны ў 1953 г. (пасля смерці Сталіна), закранае тэму “двайнога” ўваскрашэння: “духоўнага” (як вызваленне ад расійска-савецкага бальшавізму), так і “фізічнага” (як адбудаванне разбуранае фашызмам і сталінізмам Беларусі).

**19.2. Выпішы з пададзенага фрагмента верша па аднаму прыкладу для кожнага мастацкага сродка.**

Эпітэт – ..........................................................................................................................

Метафара – .......................................................................................................................

Параўнанне – ....................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu […].

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne podanie trzech środków artystycznych.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Эпітэт – “у ранах незагойных”.
Метафара – “устае густы блакіт нябёс”.
Параўнанне – “ускрэсні сёння,/ мой Край, як уваскрос Хрыстос!”.

## Zadanie 20. (0–2)

**Прачытай верш *Рукі маці* Максіма Танка і выканай заданні 20.1. і 20.2.**

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі
Іх цалавала.

Пража нямала
З іх выпіла ў ночы бяссонныя
Свежасці ранняй.
Колькі яны запалілі світанняў,
Зораў над намі.

Колькі сягоння на іх
Віднеецца чорных, глыбокіх
Шрамоў і маршчынаў,
Гэта сляды, што навекі пакінуў
Шлях наш суровы.

Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
**Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее** ў хаце
І ў сэрцы.

М. Танк, *Рукі маці* [у:] М. Танк, *Выбранае. Вершы*, Мінск 1993, с. 64–65.

**20.1. З пададзеных ніжэй загалоўкаў твораў выберы і пазнач той, у якім таксама прысутнічае вобраз маці.**

**А.** *Санет*, М. Багдановіч
**Б.** *Спадчына*, Я. Купала
**В.** *На каляды к сыну*, З. Бядуля
Г. *Што яны страцілі*, Я. Колас

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy (np. matki [...]),
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] literacki.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

B

**20.2. Якi стылістычны сродак вылучаны тлустым шрыфтам у перадапошнім радку прыведзенага верша? Выберы і пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў.**

**А.** параўнанне
**Б.** парафраза
**В.** паўтарэнне
**Г.** метафара

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego oraz inne wyznaczniki poetyki danego utworu.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie

A

## Zadanie 21. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент верша Ларысы Геніюш *Князь Усяслаў Чарадзей* і на яго падставе адкажы, ці паэтычны вобраз князя Усяслава супадае з постаццю, вядомай з летапісаў. Падай дзве гістарычныя падзеі, якія ўказваюць на гэта.**

[…]
У кіеўскім замку Ўсяслаў Чарадзей
змагаецца з духам бурлівым,
і ўздох гладзінёю калыша грудзей,
бы вецер даспелаю нівай. […]
Мілейшы той Полацкі край дарагі
і пушчы з пахучай жывіцай...
Нядаўна Нямігі ціхой берагі

крывёю зліліся крывіцкай. […]
Нядарам казалі, што князь – чарадзей...
Хто ж, духам прабіўшы прасторы,
у Кіеве чуў бы, як звон свой гудзе,
хто б знаў, што ён сэрцу гавора?
Вялікае сэрца мець трэба ў грудзёх
і духа магутныя чары,
каб чуць, як у полацкіх гордых мурох
у звон святой Сафіі ўдараць.
Агнём палымяным трэ край свой кахаць,
трэ вырасці з ніваў, загонаў,
каб славу, багацце – ўсё кінуць, аддаць
за кліч свайго роднага звона...

Л. Геніюш, *Князь Усяслаў Чарадзей* [у:] Я. Карчэўскі, *Сучасная беларуская літаратура, Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класа сярэдніх школ*, Warszawa 2003, с. 256.

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

I. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego.
   2. Pogłębianie znajomości historii narodowej [...].

### Wymaganie szczegółowe

1. Świadomość własnego dziedzictwa narodowego. Zdający:
   3) rozumie związek poznanych utworów z życiem narodu [...].

### Zasady oceniania

2 pkt – przytoczenie dwóch wydarzeń.
1 pkt – przytoczenie jednego wydarzenia.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

У вершы ёсць спасылкі на гістарычныя падзеі, звязаныя з князем Усяславам Чарадзеем: удзел у бітве на Нямізе, будова Сафійскага сабора ў Полацку.

## Zadanie 22. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй верш Ларысы Геніюш *Там толькі.***

Там толькі хочацца, хочацца жыць,
дзе родныя, сумныя далі,
дзе поле узорнай раўнінай ляжыць,
калышацца жытняю хваляй.
Дзе Нёман дастойны шырока плыве,
дзе пушчы шумяць аб мінулым,
а ў замках, курганах легенда жыве
і песня дзядоў не заснула.
Дзе нашы дзяўчаты – юргіні ў саду,
расцвіўшыя кветкі у маі,
із песнямі лён залацісты прадуць,
узорамі бель патыкаюць.
Дзе цягнуцца вежы святынь угару,
крыжамі ўпіраюцца ў неба,
а моцныя рукі папары аруць,
каб нівы пакрыліся хлебам.

Л. Геніюш, *Там толькі* [у:] https://www.you-books.com

**Напішы, якім чынам паэтка ідэалізуе вобраз сваёй айчыны. Адказ аргументуй.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego […].

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Паэтэса ідэалізуе сваю радзіму, паказваючы яе цудоўную прыроду, багатую гісторыю, працавітых і прыгожых жыхароў. Дзеля ідэалізацыі аўтарка выкарыстоўвае малюнкі і вобразы роднага краю і людзей, якія захаваліся ў яе памяці.

## Zadanie 23. (0–2)

**Прачытай фрагмент верша *Мова* Уладзіміра Караткевіча і выканай заданні 23.1. і 23.2.**

Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь
Вавілонскую Вежу Адам
І няўмольна сальюцца мовы зямлі
У адну, нbackродную нам.
І мая безвыходна пойдзе у змрок,
У атрутны, як вечнасць, цень,
Трапяткая і сіняя, як васілёк,
Гарачая, як прамень.
Я ні шчасця, ні будучых дзён не жадзён,
Хай пятля, хай памерці ў журбе,
Хай не будзе ні шчасця, ні будучых дзён,
Калі ў іх не будзе цябе.
Сірата па з'едлівай волі багоў,
Гінучы мой карабель,
Хай не будзе світання ў народа майго,
Калі досвіткам здрадзіць цябе. […]

У. Караткевіч, *Мова* [у:] У. Караткевіч, *Збор твораў у васьмі тамах*, т. 1, Мінск 1967 с. 364.

**23.1. На падставе пададзенага фрагмента верша Уладзіміра Караткевіча сфармулюй галоўную думку, якая з яго вынікае.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...] oraz ich funkcje w utworze,
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, słowa-klucze [...]).

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna lub brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Для лірычнага героя Уладзіміра Караткевіча родная мова з'яўляецца найкаштоўнейшым скарбам. Таму ён горача пратэстуе супраць імкнення ідэолагаў расійскага камунізму знішчыць гэты скарб, нічога не хоча чуць пра час, калі "сальюцца мовы зямлі // У адну, няродную нам".

**23.2. Беручы пад увагу літаратурны і нацыянальны кантэкст, растлумач сэнс параўнання "Трапяткая і сіняя, як васілёк".**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...] oraz ich funkcje w utworze,
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, słowa-klucze [...]).

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna lub brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У беларускай літаратуры васілёк з'яўляецца не проста кветкай, а сімвалам Беларусі, таму параўнанне мовы з васільком у вершы Уладзіміра Караткевіча мае сімвалічнае значэнне: і мова, і васілёк – гэта нацыянальныя сімвалы.

## Zadanie 24. (0–1)

**Падай яшчэ адзін твор, дзе, так як у вершы Уладзіміра Караткевіча *Мова*, выкарыстаны сімвал васілька.**

Аўтар:.......................................................................................................................

Твор:.........................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...],
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] literacki.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Максім Багдановіч, *Слуцкія ткачыхі*.

## Zadanie 25. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй верш Уладзіміра Караткевіча *На Беларусі Бог жыве*.**

“На Беларусі Бог жыве” –
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Ўсё зноў і зноў
Ўсім лёсам, –
Няхай спакваля, –
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля. […]
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.

Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,
Гэты край –
Твой дом і сабор... […]
І тая памяць жыве не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
“На Беларусі Бог жыве...” –
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў, –
Ну што ж, – мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е. […]

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
“На Беларусі Бог жыве”, –
І няхай да веку жыве.

У. Караткевіч, *На Беларусі Бог жыве* [у:] knihi.com

**Напішы, да якой разнавіднасці лірыкі належыць гэты верш? Пазнач правільны адказ сярод пададзеных варыянтаў і абгрунтуй яго.**

**А.** патрыятычная
**Б.** рэлігійная
**В.** пейзажная
**Г.** інтымная

Абгрунтаванне:……………………………………………………………………………………..

…………………………………………………………………...……………………………………

…….……………………………………………………………………………………………….....

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) rozpoznaje gatunki literackie, potrafi wymienić ich cechy.

## Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie poprawnej odpowiedzi i uzasadnienie.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

A

## Przykładowe rozwiązanie

У творы выяўляецца любоў паэта да Беларусі. Лірычны герой упэўнены ў жыццёвай сіле свайго народа, які гаворыць на роднай мове і гатовы бараніць свой край.

## Zadanie 26. (0–1)

**Прачытай пададзены ніжэй верш Яўгеніі Янішчыц *Ты пакліч мяне. Пазаві…***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Я. Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві…* [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура, Хрэстаматыя для сярэдніх школ*, Warszawa 2001, с. 287.

**Выберы і пазнач, да якой разнавіднасці лірыкі адносіцца верш Я. Янішчыц. Адказ абгрунтуй.**

**А.** філасофская
**Б.** грамадзянская
**В.** інтымная
**Г.** рэлігійная

Абгрунтаванне:……………………………………………………………………………………...

………………………………………………………………………………………..……………..

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) rozpoznaje gatunki literackie, potrafi wymienić ich cechy;

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź i argumentacja.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

B.

## Przykładowe rozwiązanie

Пададзены верш прысвечаны каханню і любові, услаўляе яе і ўказвае на яе ўніверсальны і глабальны характар.

## Zadanie 27. (0–2)

**Прачытай фрагмент драмы *Вечар* Аляксея Дударава і выканай заданні 27.1. і 27.2.**

[…]
Г а н н а. Што там?
М у л ь ц і к. Ідзе нехта...

І Ганна падыходзіць. Глядзяць удваіх.

Павярнуў... У Займішча, мабыць...

Ганна падыходзіць да калодзежа, марудна апускае драўлянае вядро. Тужліва рыпіць журавель, звіняць жалезкі.

Г а н н а. Грышка твой усё не піша?
М у л ь ц і к. З’ехаў пасля арміі і як у балота праваліўся... Саўсім забыўся, што ў яго бацька ёсць.
Г а н н а. Была б Наста жывая, дык пісаў бы і прыязджаў.
М у л ь ц і к. Бацьку дзеці лягчэй забываюць... Твая праўда...
Г а н н а. Сон я сёння бачыла... Можа, разгадаеш?
М у л ь ц і к. Знайшла цыганку...
Г а н н а. Дык ты ж Сонцу молішся!
М у л ь ц і к. Расказвай, разгадаю...
Г а н н а. Іваньку бачыла... Старэйшага свайго... Здаецца, роўненькае поле жытнёвае, неба над ім чыстае-чыстае! І жаўрукі ў ім вісяць. І як быццам Іванька мой ідзе гэтым полем, раз-пораз жменю зерня дастае з кішэні і сыпле сабе пад ногі. Я стаю на ўзмежку дый думаю: “Навошта ён зерне кідае ў зямлю? Жыта ж ужо вырасла, у каласы пайшло, а ён нанава сеяць надумаўся...”
Спытаць хацела, а голасу няма. Ён і прайшоў. Я і не спытала... [...]

М у л ь ц і к. Я табе кажу – добры сон... Чакай.

Г а н н а. Што чакаць?
М у л ь ц і к. Радасці, дзіва нейкага...
Г а н н а. Ну, дзякуй табе... Маліся далей, пайду казу пасвіць... У Займішча буду заходзіць, мо ўзяць што?
М у л ь ц і к. Хлеба купі... І пенсію сёння павінны даць.
Г а н н а. Ага...

А. Дудараў, *Вечар* [у:] Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2013, с. 98–99.

**27.1. Растлумач значэнне назвы драмы Аляксея Дударава.**

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, słowa klucze [...]),
   11) dostrzega obecne w utworach literackich [...] wartości [...] uniwersalne.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna lub brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Драма называецца “Вечар”. У ёй апавядаецца пра цяжкі лёс старых людзей, якіх пакінулі ў вёсцы іх дзеці дажываць свой век – своеасаблівы вечар жыцця.

**27.2 Да якога мастацкага метаду належыць драма А. Дудурава *Вечар*? Выберы і пазнач правільны адказ.**

**А.** рэалізм
**Б.** рамантызм
**В.** сімвалізм
**Г.** мадэрнізм

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   2) zna prądy literackie i artystyczne w epokach literackich, określa ich cechy.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna lub brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

A

## Zadanie 28. (0–2)

**Прачытай парададзены ніжэй фрагмент аповесці *Аблава* Васіля Быкава і выканай заданні 28.1. і 28.2.**

– Ну, аднаго і паратунку, што кароўка. Малачко! Ды і тое здаць трэба. Дзвесця[4] літраў. І мяса, і яйкі. І воўну. Зімой асмалілі падсвінка, дык штрафу далі пяцьдзясят рублёў. […]

– Можа, трэба было паскардзіцца? Жалабу[5] куды напісаць? – асцярожна параіў Хведар.

Стары зласнавата ўхмыльнуўся ўсім сваім касмылявым тварам.

– Каму жалабу? Начальству? Дык яны ж самі ў нас як звяры. Прыедзе каторы... Вунь гэны Роўба: усё мацюгом ды пагрозай, Сібірру палохае...

Хведар знянацку адчуў, як закалыхалася пад ім зямля і коса паплыло кудысь поле.

– Роўба?

– Ну, Роўба. Цяпер жа ён парцейны[6] сакратар. Малады, а нібы той цівун! Ад бацькі адмовіўся. Бацька ж яго раскулачаны ў Нядолішчы, дык адмовіўся. Казалі, і прозвішча меўся мяняць, каб анізвання...

Хведар, здалося, уязджаў у зямлю, якая ўсё плыла, гойдалася навакол. Ён ужо кепска чуў, што яшчэ казаў стары, які гаварыў і гаварыў – скардзіўся, мабыць, на парадкі ў раёне. Хведар яго не слухаў. Ён так нечакана ўчуў тое пра сына, з такім нутраным болем уразіла яго тая навіна, што ён анямеў на хвіліну. Болей не мог ні пра што пытацца, толькі самотна паглядзеў на шырокі абсяг руні, за якой на пагорку віднеліся стрэхі недалёкай вёскі, і моўчкі пайшоў па ўзлеску. Пра хлеб так і не папытаўся... Ён ужо не мог нічога прасіць, пайшоў прэч, як пабіты сабака. Ішоў і думаў: нашто прыйшоў сюды, зачапіў гэтага старога! Лепш бы ён не ведаў нічога ні пра тутэйшае жыццё, ні пра сына. Жыў бы, як раней, аднымі сваімі бедамі, што гадамі насіў у сабе. Нашто яшчэ да іх дадаваць і гэтыя? Як з імі жыць у сваёй спарахнелай душы?

В. Быкаў, *Аблава* [у:] knihi.com

---

[4] Дзвесця – дзвесце.
[5] Жалаба – скарга.
[6] Парцейны – партыйны, які належыць да (камуністычнай) партыі.

**28.1. На падставе пададзенага фрагмента і ўсяго твора назаві тры бяды, пра якія разважае галоўны герой.**

**1)** ........................................................................................................................

**2)** ........................................................................................................................

**3)** ........................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego [...],
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] kulturowy.

## Zasady oceniania

1 pkt – podanie trzech poprawnych faktów.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

**1)** Здрада і маральнае падзенне сына героя.
**2)** Раскулачванне.
**3)** Смерць дачкі Волечкі.

**28.2. З пададзеных ніжэй загалоўкаў твораў выберы і пазнач тыя два творы, героі якіх таксама перажываюць за маральнае падзенне сваіх дзяцей.**

**А.** *На каляды к сыну*, З. Бядуля
**Б.** *Рускі*, М. Гарэцкі
**В.** *Чаравікі-туфелькі*, Б. Сачанка
**Г.** *Макаркавых Волька*, К. Чорны

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego [...],
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] literacki.

## Zasady oceniania
1 pkt – poprawne wskazanie dwóch utworów.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie
A, B

## Zadanie 29. (0–2)
**Прачытай фрагмент верша *Беластоцкі край* Алеся Барскага і выканай заданні 29.1. і 29.2.**

Мой Беластоцкі край – мая Айчына!
З табою звязаны мой лёс і доля.
Люблю лясы твае, люблю даліны,
Кахаю шчыра бацькаўскае поле.

Калышашся ў напевах песні роднай,
І мыеш твар у промнях залацістых,
І толькі тут я поўнасцю свабодны,
І толькі тут душой заўсёды чысты. [...]

А. Барскі, *Беластоцкі край* [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2013, с. 50.

**29.1. Акрэслі тэму верша *Беластоцкі край* Алеся Барскага.**

…………………………………………………………………………………………………...

…………………………………………………………………………………………………...

## Wymaganie ogólne
III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe
1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy (np. ojczyzny [...]),
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, słowa-klucze [...]).

## Schemat punktowania
1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie
Верш Алеся Барскага раскрывае тэму любові да сваёй малой айчыны.

**29.2. Падай аўтара і загаловак яшчэ аднаго твора на тую ж тэму, што і верш Алеся Барскага *Беластоцкі край*.**

Аўтар: …………………………………….. Назва: ………………………..……………...….

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...] oraz ich funkcje w utworze,
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: [...] literacki.

## Zasady oceniania

1 pkt – wskazanie poprawnego utworu i jego autora.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Віктар Швед, *Беласточчына*.

## Zadanie 30. (0–2)

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент з *Чарнобыльскай малітвы* Святланы Алексіевіч і выканай заданні 30.1. і 30.2.**

“Я не ведаю, пра што расказваць... Пра смерць ці пра каханне? Ці гэта адно і тое ж... Пра што?

... Мы нядаўна пабраліся. Яшчэ хадзілі па вуліцы і трымаліся за рукі, нават калі ў краму йшлі... Я казала яму: “Я кахаю цябе”. Але я не ведала яшчэ, як яго кахала... Не ўяўляла... Жылі мы ў інтэрнаце пажарнай часткі, дзе ён служыў. На другім паверсе.

І там яшчэ тры маладыя сям'і, на ўсіх адна кухня. А ўнізе, на першым паверсе стаялі машыны. Чырвоныя пажарныя машыны. Гэта была яго служба. Заўсёды я ў курсе: дзе ён, што з ім? Сярод начы чую нейкі шум. Вызірнула ў акно. Ён убачыў мяне: “Зачыні фортачкі і лягай спаць. На станцыі пажар. Я хутка буду”.

Самога выбуху я не бачыла. Толькі полымя. Усё нібы свяцілася... Усё неба... Высокае полымя. Чад. Гарачыня страшэнная. А яго ўсё няма і няма. Чад ад таго, што бітум гарэў, дах станцыі быў заліты бітумам. Хадзілі, пасля прыгадваў, як па смале. Збівалі полымя. Гарэў графіт. Яго скідвалі нагамі... Паехалі яны без брызентавых касцюмаў, як былі ў адных сарочках, так і паехалі. Іх не папярэдзілі, іх выклікалі на звычайны пажар... ”

С. Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* [у:] knihi.com

**30.1. Назаві здарэнне, пра якое апавядае Святлана Алексіевіч у творы *Чарнобыльская малітва*? Абгрунтуй свой адказ.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   2. Rozumienie zależności między wydarzeniami historycznymi a literaturą [...].

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł […]).

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Святлана Алексіевіч у творы Чарнобыльская малітва апавядае пра катастрофу на Чарнобыльскай АЭС. На гэта ўказвае загаловак ды змест твора, у якім зафіксаваныя выказванні сведкаў падзей.

**30.2. Напішы, у чым заключаецца трагедыя гераіні пададзенага фрагмента *Чарнобыльскай малітвы*.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębienie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich i innych tekstów kultury z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera i świata przedstawionego […].

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie, na czym polega tragedia bohaterki.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Трагедыя гераіні заключаецца ў тым, што на яе вачах памірае муж, якога яна вельмі кахае.

## Część 3. *Wypracowanie*

Prezentowane w *Informatorze* przykładowe wypracowania są pracami uczniowskimi pozyskanymi z próbnego zastosowania i ocenionymi przez egzaminatorów. W pracach dokonano niezbędnych zmian w zakresie stylu, poprawności języka, ortografii i interpunkcji.

Tematy wypracowań będą poprzedzone szczegółowymi wytycznymi.

Wybierz **jeden** z poniższych tematów i napisz wypracowanie.

- W wypracowaniu rozważ **problem** podany w temacie. Przedstaw również **swoje zdanie** i **uzasadnij** je.
- W rozważaniach przedstaw **argumenty**, odwołując się do **utworu literackiego** wskazanego w temacie oraz innego utworu z literatury białoruskiej.
- Twoja praca powinna liczyć co najmniej **250 wyrazów**.

### Temat 1 (0–30)

**Якое значэнне для фарміравання тоеснасці чалавека мае родная мова? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на адозву Цёткі *Шануйце роднае слова* і выбраны твор беларускай літаратуры**. **Твая праца павінна складацца не менш чым з 250 слоў.**

**Wymagania ogólne i szczegółowe**

Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 7.–8. *Informatora*.

**Zasady oceniania**

Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 23.–36. *Informatora*.

**Przykładowe ocenione rozwiązania**

Przykład 1.

Сапраўднае прозвішча Цёткі – Алаіза Пашкевіч. Яна жыла і дзейнічала на пераломе XIX і XX стагоддзяў. Была паэткай і публіцысткай. У сваім творы “Шануйце роднае слова” закранула пытанне: ці важная родная мова? Мова з’яўляецца нашым скарбам і мае істотнае значэнне для фарміравання тоеснасці чалавека.

Ужо ад дзіцячых гадоў нашыя бацькі вучаць нас гаварыць на ёй. Гэта проста элемент дзяцінства, выхавання. Роднае слова акрэслівае наш характар. Калі б ты нарадзіўся ў іншай старонцы, ты меў бы іншыя традыцыі. Ад першага дня жыцця чуеш бацькоўскія словы, калыханкі ці проста чалавечыя размовы.

Мова гэта найбольшае багацце людзей. Яна будзе заўсёды. Мы можам страціць усе матэрыяльныя багацці, але роднага слова ніхто нам не адбярэ. Наша мова вечная, яна жыве ў нашай галаве і трэба пра яе заўсёды памятаць.

Бацькоўская мова злучае людзей у суцэльны народ. Без яе цяжка было б акрэсліць адрозненні ў свеце. Гэта часта самасвядомасць паходжання нашых продкаў і нас саміх.

Цётка піша, што найчасцей сваёй мовы выракаюцца людзі багатыя і адукаваныя. Яны часта забываюць пра свае карані. За імі ідуць маладыя пакаленні, якія гэта ўсё бескрытычна пераймаюць. Між іншымі, цераз такіх людзей менш народа хоча гаварыць на сваёй роднай мове. Цётка дакарае ўсіх тых, якія прымаюць чужую гутарку і звычаі, а забываюць пра роднае. Называе іх здраднікамі, якія гатовы, дзеля грошай, зрабіць амаль усё. Яны ніколі не знойдуць спакою душы.

Алаіза Пашкевіч пачала пісаць пад уплывам Францішка Багушэвіча і яго творчасці. Паэт у прадмове да зборніка “Дудка беларуская” заклікае да пашаны сваёй роднай мовы. Гаворыць, што трэба ведаць іншыя мовы, але найперш – пазнаць добра сваю. Ён таксама кажа, што трэба пашыраць свае веды, але памятаць пра сваю культуру, таму што іншая мова можа яе змяніць. Добра ведаць замежныя мовы, але найперш трэба знаць сваю. Багушэвіч асуджае шкодны стэрэатып, што беларуская мова гэта мужыцкая мова. Ён таксама ўспамінае часы Вялікага Княства Літоўскага, у якім афіцыйнай мовай была старабеларуская. Паэт звяртаецца з заклікам да сваіх землякоў, каб не пакідалі роднай мовы, бо калі мова гіне, тады і народ памірае. Словы Багушэвіча актуальныя па сённяшні дзень.

Чалавек не існуе без сваёй мовы. Яна была і павінна быць заўсёды важнай у нашым жыцці. Яна надае нам форму і акрэслівае нашыя прыкметы. Мы, як маладыя людз,і павінны заклікаць усе пакаленні да памяці пра сваё паходжанне.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 11 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane w pełni funkcjonalnie, argumentacja jest logiczna, wnikliwa i zróżnicowana. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu biograficznego autora oraz innego utworu literackiego niż wskazany w poleceniu.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 6 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – 1 błąd interpunkcyjny.

Przykład 2.

Матыў роднай мовы часта спатыкаецца ў беларускай літаратуры. Пісьменнікі задумваюцца, якое яна мае значэнне. Родная мова – гэта галоўны фактар, які фарміруе тоеснасць чалавека.

Чалавек, які адракаецца роднага слова, становіцца чужым для свайго народа. У адозве “Шануйце роднае слова” Алаіза Пашкевіч падкрэслівае, што такое адрачэнне выключае нас з сям’і. Мы стаемся чужымі ў нашай вёсцы, на нашай айчыне. Апрача таго, мы становімся здраднікамі.

Родная мова – гэта найбольшы скарб чалавека. Цётка прыпамінае, што ўсё багацце, высокае становішча ці добры гонар можна лёгка страціць, яны не вечныя. Але матчына мова ніколі не пакіне чалавека, яе немагчыма адабраць. Калі ты яе не выракся, ты ніколі не будзеш самотны. Будуць цябе суправаджаць іншыя людзі з твайго народа.

Родная мова спадарожнічае чалавеку ад наймалодшых гадоў. Гэта на ёй ён вучыцца размаўляць, пазнае ўсе праўды і законы свету. Яна дазваляе выразіць усе эмоцыі, першые боль і шчасце.

Пачуццё роднай мовы ў чужой старонцы быццам пераносіць чалавека ў родны кут, ён успамінае сваё дзяцінства і ўсё добрае, што яму там прыдарылася. Родная мова прыпамінае чалавеку, хто ён і адкуль.

Родная мова даная кожнаму чалавеку ад Бога. У "Прадмове да Дудкі Беларускай" Францішак Багушэвіч сцвярджае, што яна надана чалавеку цераз вышэйшыя сілы, а што за тым ідзе, яе немагчыма адрачыся і прыняць другую. Калі будзеш размаўляць па-французку, то не станеш французам.

Чалавек павінен таксама чытаць на роднай мове. Францішак Багушэвіч сумуе па тым, што няма кніжачак надрукаваных па-беларуску, а іншыя меншыя народы маюць.

З вышэйшых аргументаў вынікае, што без роднай мовы у чалавека не фарміруецца тоеснасць. Свая мова пазваляе чалавеку быць часцю народа, прыпамінае аб паходжанні і ніколі яго не пакіне.

1. **Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione oba elementy polecenia.
2. **Kompetencje literackie i kulturowe:** 9 pkt – w pracy jeden utwór wykorzystany w pełni funkcjonalnie, a drugi – częściowo funkcjonalnie, argumentacja rzeczowa, poparta trafnymi przykładami. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu historycznego oraz innego utworu literackiego niż wskazany w poleceniu.
3. **Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
4. **Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 4 pkt – składnia i leksyka stosowne, 9 błędów językowych; ortografia – 2 pkt – 1 błąd ortograficzny; interpunkcja – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem interpunkcyjnym.

Przykład 3.

Якое значэнне для фарміравання тоеснасці мае родная мова?

Родная мова гэта наша гісторыя, наша памятная рэч. Дзяцей вучаць яе змалку. А нашы бацькі гавораць "по своему". Кожны з нас мае сваю родную мову каторай навучыўся ад бацькоў ці бабулі і дзядулі.

Я ўважаю, што родная мова велмі важна і патрэбна в фарміраванню нашага жыцця і характару.

Некаторы маладыя людзі забываюць сваю родную мову, саромяцца ёй і баяцца, што іншыя людзі могуць абсмяяць іх. Такіе асобы самые не ведаюць кім быць і як яны маюць жыць. Прыкладам таго будзе твор Цёткі "Шануйце роднае слова". Молодые людзі там са сваей волі забываюць сваей спадчыны ад продкаў – мовы, якую яны выкарыстоўвалі. Яны самыя не ведаюць кім былі, калі адмаўлялі сваей спадчыны сям'і.

Калі чалавек знае свою вартасць і знае як вельмі яго продкі ахвяравалі сябе, каб ён мог быць сабой і жыць ва ўласным краю. Прыкладам таго захавання ёсць твор Янкі Купалы пад загалоўкам "А хто там ідзе". Беларусы ў гэтым творы былі адважныя,

моцныя і бясстрашныя. Не баяліся выглашаць сваіх правоў і голасна гаварыць аб сваіх патрэбах. Яны перамазалі сваю мову іншым з гордасцю.

Я ўважаю, што я даказала якое значэнне для фарміравання тоеснасці чалавека мае родная мова. Гэта вельмі важная частка нашага жыцця, важная, каб захаваць сваю гісторыю, мінулае і фармаваць характар. Важнае, каб навучыць маладых людзей, каб яны не саромеліся сваёй мовы. Я ўважаю яшчэ, што людзі забываюць аб сваёй роднай мове, таму што свет мяняецца, кожны ўжывае новых слоў і старэйшыя словы ідуць у забыццё.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione oba elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 6 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane częściowo funkcjonalnie, trafna argumentacja, poparta przykładami. W pracy konteksty wykorzystano częściowo funkcjonalnie.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 5 pkt – składnia i leksyka stosowne, 6 błędów językowych; ortografia – 2 pkt – 1 błąd ortograficzny; interpunkcja – 2 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

## Temat 2. (0–30)

**Чалавек у экстрэмальнай сітуацыі. Паразважай над праблемай, абапіраючыся на апавяданне *Маці* Янкі Брыля і выбраны твор беларускай літаратуры. Твая праца павінна складацца не менш чым з 250 слоў.**

### Wymagania ogólne i szczegółowe

Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 7.–8. *Informatora*.

### Zasady oceniania

Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 23.–36. *Informatora*.

### Przykładowe ocenione rozwiązania

Przykład 1.

Як чалавек дзейнічае ў экстрэмальнай сітуацыі? Ён у такім моманце можа думаць не толькі пра самога сябе. Па-мойму, у такіх сітуацыях чалавек не клапоціцца толькі пра сябе, але яшчэ і пра іншых людзей. Мой тэзіс пастараюся абгрунтаваць, абапіраючыся на апавяданні “Маці” ды “Memento mori” Янкі Брыля.

Падзеі твора “Маці” адбываюцца ў час нямецкай акупацыі. Маці разам з сынам працуюць у полі ў час жніва. Яны раптам даведваюцца, што немцы забараняюць дапамагаць партызанам ды пагражаюць за гэта жорсткім пакараннем. Вечарам, калі маці была адна ў хаце, да яе прыйшлі гэтыя партызаны і сталі прасіць яе, каб дала ім нечага паесці. Маці ведала, што немцы забаранілі ім дапамагаць, аднак яна ўпусціла

незнаёмых у хату і дала ім малака і хлеба. На яе няшчасце, аб гэтым даведаліся немцы, якія забралі байцоў і маці, і павялі іх на смерць, а хату спалілі. На гэтым прыкладзе мы бачым, якім велізарным геройствам выказалася звычайная сялянская жанчына. Яна была асобай моцна веруючай і не ўяўляла, каб не дапамагчы бліжняму ў патрэбе. Яе лёс паказвае, што ў экстрэмальнай сітуацыі многія людзі выяўляюць выключную высакароднасць.

У цяжкай сітуацыі знаходзіўся сын тытульнай гераіні. Ён ведаў, што яго два старэйшыя браты пайшлі на вайну і яшчэ не вярнуліся, а можа і не вернуцца. Калі ён сказаў маці, што хоча пайсці ў вёску, яна яму забараніла гэтае рабіць. Маці не хацела страціць свайго наймаладзейшага сына. Але ён яе не паслухаў і пайшоў у вёску, каб сустрэцца з партызанамі. Ён проста хацеў змагацца супраць ворага.

Іншы твор Янкі Брыля – “Memento mori”, распавядае пра пацыфікацыю беларускай вёскі. У яе прыязджае нямецкі атрад, каб “пакараць” сялян за супрацоўніцтва з партызанамі. Калі карнікі сабралі ўсіх вяскоўцаў у адно месца, іхні начальнік сярод людзей пазнаў печніка, які рабіў яму печ. Мужчына вельмі добра зрабіў сваю працу і таму зондэрфюрэр сказаў, што пячнік можа ўзяць сваю жонку і свабодна адысці. Пячнік аднак хацеў дапамагчы ўсім жыхарам сваёй вёскі. А калі аказалася, што яму гэта не ўдасца, ён выбраў смерць разам з аднавяскоўцамі. Гэта доказвае, што ў экстрэмальнай сітуацыі чалавек думае не толькі пра сябе, але і пра іншых – сяброў, знаёмых, суседзяў.

Падсумоўваючы, я думаю, што на падставе прыведзеных аргументаў мне ўдалося абгрунтаваць тэзіс, што ў экстрэмальнай сітуацыі чалавек паступае, не думаючы толькі пра сябе, але яшчэ і аб другім чалавеку. Маці дапамагла байцам, нягледзячы на забарону. Яе сын пайшоў у вёску ваяваць разам з партызанамі. А пячнік, хаця мог выратаваць сваё жыццё і жыццё сваёй жонкі, выбраў смерць разам з аднавяскоўцамі, якія былі яму як сям’я.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 11 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane w pełni funkcjonalnie, zadowalająca argumentacja. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu historycznego oraz innego utworu literackiego niż wskazany w poleceniu.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 6 pkt – zróżnicowana składnia, zróżnicowana leksyka; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – 1 błąd interpunkcyjny.

Przykład 2.

Чалавек часам у сваім жыцці мусіць змагацца з вялікімі ці малымі праблемамі. Адносна рэдка гэтыя праблемы датычаць пагрозы жыцця, але часам ёсць і так. У сваёй працы я паразважаю над пытаннем якім ёсць чалавек у экстрэмальнай сітуацыі. Выкарыстаю знаёмства з тэкстам Янкі Брыля “Маці”.

У апавяданні “Маці” аўтарства Янкі Брыля ёсць паказаная асоба ў экстрэмальнай сітуацыі, таму што тытульную маці чакае смерць. Гэты тэкст пачынаецца ад таго што

маці жыве з сынам на беларускай вёсцы. Гэта часы вайны, а ў вёсцы часта бываюць нямецкія салдаты. Аднаго дня сын хоча ісці ў вёску. Ён сказаў пра тое сваёй маці. Яна не хацела, каб ён куды-небудзь ішоў, таму што яна баялася пра яго (яе двух старэйшых сыноў пайшло на вайну і яны загінулі). Ён не паслухаў маці і пайшоў. Потым да дому маці прыйшлі немцы і забралі яе. Яна ведала, што чакае яе смерць, але яна не думала аб тым. Яна думала аб сваім сыну. Яна была шчаслівa, што ён пайшоў і не было яго дома калі прыйшлі фашысты. Верыла, што ён помсціць яе і будзе мець добрае жыццё. Яна была таксама хрысціянкай і думала што “гэта воля Бога”. Падсумоўваючы, яна была ў экстрэмальнай сітуацыі, таму што ёй пагражала смерць. Чалавек у такіх сітуацыях захоўваецца па-рознаму. Некаторы чалавек будзе думаць толькі аб сабе, іншы (як маці) будзе думаць аб сваіх блізкіх. У тым таксама заключаецца матчына любоў. Чалавек без сям’і мусіць дбаць толькі пра сябе, але хтосьці, хто кахае каго іншага, засмуціцца па ім.

У іншым апавяданні, іншая маці ёсць пастаўлена ў сітуацыі калі яе родны сын не хацеў прызнацца да яе. Яна з вёскі паехала да яго ў горад, вельмі цешылася, а ён не хацеў угасціць яе. Яе муж памёр і яе экстрэмальная сітуацыя заключалася ў тым, што яна асталася самая на свеце. Для яе найгоршае было тое, што яна вельмі доўга верыла ў тое, што ён (яе сын) памятае аб ёй і будзе шчаслівы, што яна да яго прыйшла. Чалавек каторы астаецца сам ёсць нешчаслівы. Для маці сэрца канешне трэснула. Яна была найбольш разгубленая і сумная.

Падсумоўваючы, чалавек у экстрэмальнай сітуацыі захоўваецца па-рознаму, але заўсёды спадарожнічае таму туга і бяссільнасць. Я думаю, што ніхто з нас не хацеў бы знайсціся ў сітуацыі, якая ў адмоўным сэнсе экстрэмальная.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 8 pkt – w pracy jeden utwór wykorzystany w pełni funkcjonalnie, a drugi – częściowo funkcjonalnie, zadowalająca argumentacja. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu historycznego oraz innego utworu literackiego niż wskazany w poleceniu.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 5 pkt – składnia i leksyka odpowiednie do realizacji tematu, 5 błędów językowych; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 1 pkt – 7 błędów interpunkcyjnych.

Przykład 3.

У жыцці чалавека сустракаюцца розныя сітуацыі. Некаторые ёсць прыемнымі для нас саміх, а іншыя вымагаюць ад нас рашучых і сур'ёзных выбараў. Гэтыя выбары часта рашаюць пытанне жыць ці ня жыць. Такая цяжкая сітуацыя носіць названне экстрэмальная. Многа людзей, калі яны трапляюць у экстрэмальную сітуацыю траціць галаву, на шчасце большасць з іх падымаюць правільные выбары, а некаторые ідут нават на сваю смерць, толькі каб паступіць правільна. На снове апавядання "Маці" Янкі Брыля я стаўлю тэзіс, што простыя беларускія людзі у экстрэмальных сітуацыях падымаюць правільные рашэнні, нават рызыкуючы сваім жыццём.

Па-першае, у такой цяжкай і экстрэмальнай сітуацыі была маці з апавядання Янкі Брыля. Падзеі апавядання адбываюцца ў час другой сусветнай вайны. Галоўная гераіня адпускае амаль усіх сваіх сынавей або ў партызантку або ў армію. У яе астаецца адзін самы наймалодшы сын, і таго цягне ў партызантку. У час жніва яна з сынам вяртаюцца дахаты. Па дарозе яны знаходзяць абяву в которай немцы пішуць, што той, хто паможа партызанам будзе растрэлан. Увечары да іх хаты прыходзяць байцы, каторыя ўцяклі з лагера. Тут нашая гераіня стаіць у экстрэмальнай сітуацыі накарміць і напаіць уцекачоў і тым самым паставіць пад пытанне сваё жыццё. Яна не злякалася фашыстаў і паступіла як сапраўдны хрысціянін, накарміла і напаіла іх, за што і заплаціла самую высокую цану, свайго жыцця. Гэты аргумент пацвярджае мой тэзіс.

Па-другое, сын маці стаіць перад цяжкім выбарам паслухаць маці і астацца на хутары або пайсці ў вёску і там сустракатся з партызанамі. Ён выбірае другой варыянт. На першы погляд ён падняў плахое рашэнне. Але гэтае спасае яму жыццё.

Па-трэцяе, у тэксце "Memento mori" у экстрэмальнай сітуацыі стаіць печнік. У яго паяўляецца шанс выйсці із сарая і выжыць. Але ён горда адказвае нямецкаму афіцэру, што ён астаецца. Гэта сапраўды мужское рашэнне якое спасло яму жыццё.

**Прачытай пададзены ніжэй урывак і адкажы, што агульнага мае прадстаўлены ў ім погляд Сакрата Яновіча пра творчасць Янкі Купалы з поглядам Алеся Бельскага, выяўленым у пададзеным вышэй артыкуле.**

Сакрат Яновіч
***Эліты***

Паранаічнасць сітуацыі Беларусі ў перыяд вырастання яе з этнічнасці ў палітычнасць геніяльна паказаў Янка Купала ў камедыі “Тутэйшыя”. Ён насіўся з ёю, відаць, заўсёды, а закончыў у жніўні 1922 года, маючы агляд здалёку гарачых падзей вайны і рэвалюцыі. Ужо ў “Паўлінцы”, створанай маладым Купалам, прагледжваюцца паслейшыя матывы ў “Тутэйшых” (хоць бы ў дзеючай асобе Быкоўскага).

С. Яновіч, *Пад знакам Арла і Пагоні*, Крынкі 2003, с. 137.

……………………………………………………………………………………………...........

……………………………………………………………………………………………...........

……………………………………………………………………………………………..........

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
  1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich [...] z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   1) dostrzega przemiany konwencji [...] (poziom rozszerzony).

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Назіранні Сакрата Яновіча пацвярджаюць тэзіс Алеся Бельскага пра тое, што Янка Купала ў сваіх творах спалучаў эстэтычнае і грамадзянскае, нацыянальнае і сацыяльнае, красу і палітыку.

## Zadanie 9. (0–1)

**Напішы, які сэнс мае назва камедыі *Тутэйшыя* Янкі Купалы ў дачыненні да этапу гісторыі Беларусі, які Сакрат Яновіч назваў "перыядам вырастання яе з этнічнасці ў палітычнасць".**

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
  1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich [...] z wykorzystaniem właściwej terminologii.

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   11) dostrzega obecne w utworach literackich [...] wartości narodowe i uniwersalne.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie znaczenia tytułu komedii.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

**Przykładowe rozwiązanie**

Янка Купала гэтай назвай і ўсім творам звяртае ўвагу на праблему нізкай нацыянальнай свядомасці беларусаў. Для таго, каб стаць дзяржавай (“палітычнасць” паводле Сакрата Яновіча), мала быць тутэйшымі, трэба быць і мець гонар называцца беларусамі (“этнічнасць” паводле Сакрата Яновіча).

## Zadanie 10. (0–2)

**Разгледзь карціну Адама Глобуса *Мікіта Зносак са сваімі абразамі*, прачытай урывак камедыі Янкі Купалы *Тутэйшыя* і выканай заданні 10.1. і 10.2.**

Янка Купала

***Тутэйшыя***

[...] М І К І Т А . Меджду протчым, гэр Спічыні таму не вінен, што напладзілі сабе людзі языкоў, як тая трусіха трусянят, і мне, меджду протчым, як ідуць немцы – вучыся па-нямецку, як ідуць палякі – вучыся па-польску, а як будуць ісці нейкія іншыя — вучыся па нейкаму па-іншаму. [...]

Я Н К А . Бачыў бог, што не даў свінні рог, а рэгістратару панавання. Але чаму б вам, колежскі рэгістратар Нікіцій Зносілов, не стацца тым, чым вы самдзеле ёсць: Мікіта Зносак – і мілагучна, і па-тутэйшаму, ды языкоў не трэба мяняць, як цыган коні?

[...] М І К І Т А . Меджду протчым, вы напамыкаеце, сябра беларус, каб я стаў не на свой, а на ваш – беларускі, хэ-хэ-хэ! грунт.

Я Н К А . А хоць бы й так.

[...] М І К І Т А . Ха-ха-ха! Ха-ха-ха! І жартаўнік жа вы, дзядзька беларус, незвычайны вы жартаўнік! Ха-ха-ха! Не маючы што рабіць, інтэрнацыянальная інтэлігенцыя выдумала гэты нейкі нацыянальны беларускі язык, а вы хацелі б заставіць нас, руска-ісціную тутэйшую, меджду протчым, інтэлігенцыю, сушыць над ім свае апошнія мазгі. Ха-ха-ха! Вось дык дадумаліся! Ха-ха-ха! Меджду протчым, пане беларус, мне ваш (*з націскам*) “дэмократычны” язык непатрэбен, калі я маю свой, меджду протчым, мацярынскі рускі язык. [...]

Я. Купала, *Тутэйшыя* [у:] knihi.com




А. Глобус, *Мікіта Зносак са сваімі абразамі* [у:] adam-hlobus.livejournal.com

**10.1. Якую рысу героя камедыі *Тутэйшыя* Мікіты Зносака адлюстраваў на пададзенай карціне Адам Глобус? Адкажы на пытанне на падставе сваіх ведаў пра сюжэт камедыі.**

…………………………………………………………………………………………………….

…………………………………………………………………………………………………….

…………………………………………………………………………………………………….

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich [...] z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:

7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera [...] oraz różne sposoby pokazywania świata przedstawionego: [...] groteska.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie głównej cechy bohatera.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

Герой Янкі Купалы Мікіта Зносак характарызуецца перадусім прыстасаванствам: ён, будучы беларусам па нацыянальнасці, дэкларуе сваю прыналежнасць да той культуры, да якой у гэты час яму выгадна. У залежнасці ад таго, хто пераймае ўладу ў Мінску, Мікіта Зносак прыкідваецца то немцам, то палякам, то рускім.

**10.2. Прачытай пададзеную ніжэй дэфініцыю гратэска. З дапамогай гэтай дэфініцыі абгрунтуй сцвярджэнне, што Янка Купала для стварэння вобраза Мікіты Зносака выкарыстоўвае гратэск.**

Гратэск – паэтычны троп, а таксама мастацкі прыём адлюстравання рэчаіснасці, які парушае сапраўдныя формы і памеры рэчаў і прадметаў, спалучае рэальнае з фантастычным, трагічнае са смешным, наўмысна перабольшвае ці змяншае з’явы рэчаіснасці.

В. Рагойша, *Літаратуразнаўчы слоўнік. Тэрміны і паняцці*, Мінск 2009, с. 66.

Аргументацыя:

………………………………………………………………………………………………...........

………………………………………………………………………………………………...........

………………………………………………………………………………………………...........

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich [...] z wykorzystaniem właściwej terminologii.

## Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   7) rozpoznaje w utworze sposoby kreowania bohatera [...] oraz różne sposoby pokazywania świata przedstawionego: [...] groteska.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne uzasadnienie twierdzenia.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

**Przykładowe rozwiązanie**

Янка Купала наўмысна перабольшвае негатыўныя рысы свайго героя, асабліва маштаб ягонага прыстасаванства, а таксама перамешвае трагічнае са смешным, выяўляючы характар Мікіты Зносака ў розных сітуацыях. Такі спосаб адлюстравання рэчаіснасці адпавядае гратэску.

## Tekst 2.

Валянцін Акудовіч

***Эсэ пра эсэ***

Калі цябе хвалюе жанчына – ты пішаш верш.
Калі цябе трывожыць чалавек – ты пішаш раман.
Калі цябе вярэдзіць быццё – ты пішаш эсэ.

Вясёлае эсэ ты пішаш, калі табе вельмі сумна. А так бывае кожны раз, як толькі нешта ўжо незваротна скончылася: сяброўства, каханне, надзея... А наноў яшчэ нічога не распачалося.

Эсэ – гэта востраў, куды можна патрапіць адно пасля караблекрушэння. Вось чаму эсэ заўсёды пачынаецца з вусцішнай адзіноты. Ты стаіш на пустэльным беразе і пакрысе ўсведамляеш: каб не знікнуць дазвання разам з тым, што цябе цешыла і бавіла раней, трэба самому ўсё вынайсці і стварыць наноў – і сябрука Пятніцу, і гліняны збан.

І ты рушыш у глыб вострава, скуль няхутка вернешся да людзей, каб распавесці ім гісторыю свайго вяртання...

***

[…] Эсэ – мужны жанр. У апавяданні аўтар распранае на людзях героя – у эсэ ён распранаецца сам. Толькі каб напісаць эсэ, адной адвагі мала. Трэба яшчэ мець ахвоту здумляцца. Без мыслення эсэ ператвараецца ў замалёўку, эцюд, нарыс... У што заўгодна, але не ў эсэ.

Усе ведаюць знакамітае выслоўе Рэнэ Дэкарта: “Я мыслю – значыць існую”. Дык вось, першая частка гэтага выслоўя (“Я мыслю…” ) і ёсць формулай эсэ.

Няма эсэ без твайго ўласнага “Я” перадусім, але і няма эсэ без “Я”, якое мысліць.

Разам з тым, не трэба залічваць эсэ толькі да інтэлектуальнай літаратуры. Бо калі быць больш дакладным, дык эсэ – не зусім мысленне, а вольнае дыханне мыслення. Гэта значыць, што эсэ мысліць не мысленнем, а ўсёй сваёй дрогкай субстанцыяй. Як, скажам, у яшчэ адным вялікім беларускім эсэ – паланезе “Развітанне з Радзімай” Міхала Клеафаса Агінскага.

***

[…] Эсэ – палігон свабоды. На ягонай тэрыторыі кшталтавалі свой досвед не толькі свабода слова і мыслення, але і воля да годнага жыцця. Прынамсі там, дзе яна была, гэтая воля... Не выпадкова вялікая расейская літаратура не мела жанру эсэ і нават назву кнігі Мішэля Мантэня “Essais” расейцы перакладалі як “Опыты”.

Дэспатыя ведае толькі адно “Я” – “я” самадзержцы і адну свабоду – свабоду дэспата.

Да самага апошняга часу амаль не было эсэ і на Беларусі. Хаця распачыналася наша літаратура не з вершаў і не з прозы, а з геніяльнага эсэ Францішка Багушэвіча, якое чамусьці лічаць усяго толькі прадмовай да паэтычнага зборніка “Дудка

беларуская”. Чаго варты хаця б адзін сказ адтуль: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі!”...

Дарэчы, і сама Беларусь пачыналася з гэтага эсэ. Вось чаму эпітэт “геніяльнае” тут абсалютна да месца... Але адпаведнага працягу гэты вялікі пачатак не меў. Станаўленне беларускай літаратуры спалучалася з фармаваннем нацыі і таму перадусім бралася пад увагу не персанальнае “я”, а калектыўнае “мы”: мы – беларусы.

***

[…] У Францыі эсэ аднойчы выбухнула свабодай, у Беларусі наадварот – свабода выбухнула эсэістыкай. З пачатку дзевяностых (прыдбання незалежнасці) эсэ запанавала ўсюды: у філасофіі, літаратуры, гісторыі, журналістыцы... І толькі нашыя літаратуразнаўцы дасюль не зважаюць на гэты феномен. Яны па-ранейшаму шукаюць плён айчыннага красамоўства ў паэзіі ды прозе – і не знаходзяць. Што натуральна. Бо ўсё самае вартае, што адбылося ў беларускай літаратуры за апошнія паўтары дзесяцігоддзі – адбылося ў жанры эсэ.

Ёсць яшчэ адзін надзвычай цікавы момант, што да эсэ на Беларусі...

Ужо колькі стагоддзяў таму на прасторах нашай бацькаўшчыны сутыкнуліся і з тае пары існуюць у супраціве дзве ментальнасці. Адна з іх, уласна еўрапейская, вызнае за асноўную каштоўнасць індывідуума. Другая, расейская, аддае перавагу “саборнасці” – калектывісцкаму “мы”.

Няма сумневу, што беларуская літаратура і надалей будзе падзеленая адпаведна менталітэту яе аўтараў. Але калі чалавек сам заблытаецца, да якога свету ён належыць (еўрапейскага ці расейскага), папытайцеся ў яго: ці піша таварыш эсэ?

***

Эсэ ўжо болей як чатырыста год, але і па сёння дакладна ніхто не ведае, што гэта такое? Таму пра эсэ заўсёды можна казаць, што яно ёсць, але ніколі нельга сказаць, чым яно ёсць?

Рэч у тым, што выразнай мяжы паміж эсэ і якім іншым тэкстам няма – прынамсі, вонкі. Адрозненне палягае не ў форме і нават не ў змесце, а ў прычыне, якая кліча эсэ аб’явіцца.

[…] Эсэ – гэта падзея, раптам народжаная вярэдзівам сэрца і спавітая здумленнем. Вось чаму пра кожнае сапраўднае эсэ можна сказаць, што яно магло быць не напісаным. Прынамсі, ніхто не можа напісаць тое самае эсэ іншым разам.

У эсэ, як у адну ваду, нельга ўвайсці двойчы.

Напісаць эсэ – гэта зачарпнуць жменяй з вірлівай плыні быцця і нейкі момант глядзець, як быццё празрыстымі цуркамі сцякае паўз твае пальцы...

Калі вы напісалі эсэ, вы не напісалі нічога.

Паводле: В. Акудовіч, *Дыялогі з Богам*, Мінск 2006, с. 34–37.

## Zadanie 1. (0–1)

**Растлумач, якую функцыю выконвае зварот да чытача “на ты” ў першай частцы *Эсэ пра эсэ* Валянціна Акудовіча.**

……………………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

II. Kształcenie językowe.

5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

### Wymaganie szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   1) wskazuje charakterystyczne cechy stylu danego tekstu, nazywa zastosowane w nim środki językowe i określa ich funkcje w tekście.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna odpowiedź.
0 pkt – odpowiedź błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Ужыванне займенніка “ты” ў першай частцы тэксту мае на мэце ўстанаўленне блізкага кантакту з адрасатам, скарачэнне дыстанцы і прыбліжэнне досведу пісьменніка звычайнаму чалавеку.

## Zadanie 2. (0–1)

**На падставе ўсяго тэксту *Эсэ пра эсэ* Валянціна Акудовіча растлумач значэнне метафары, заключанай у сказе “Эсэ – гэта востраў, куды можна патрапіць адно пасля караблекрушэння”.**

……………………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………………

### Wymagania ogólne

II. Kształcenie językowe.

5. Pogłębianie umiejętności porozumiewania się (czytania [...]).

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe

4. Odbiór przekazu językowego. Zdający:
   2) odczytuje sens tekstu, [...] potrafi wydzielić jego fragmenty i objaśnić ich sens [...] na tle całości.
1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) dostrzega i potrafi komentować estetyczne wartości utworu literackiego (poziom rozszerzony).

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie znaczenia metafory.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub błędna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Эсэ, якое метафарычна названа востравам, з’яўляецца вынікам разваг над крызіснай сітуацыяй, названай караблекрушэннем, у культуры ці грамадстве.

## Zadanie 3. (0–2)

**Давядзі, што прыкметы эсэ, названыя Валянцінам Акудовічам у *Эсэ пра эсэ*, выступаюць у яго тэксце, падаючы дзве характэрныя рысы эсэ як жанру, якімі характаразуецца тэкст Валянціна Акудовіча.**

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymaganie szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) w interpretacji eseju i felietonu wykorzystuje wiedzę o ich cechach gatunkowych. (poziom rozszerzony)

### Zasady oceniania

2 pkt – poprawna odpowiedź ze wskazaniem dwóch cech charakterestycznych dla eseju.
1 pkt – poprawna odpowiedź ze wskazaniem jednej cechy charakterestycznej dla eseju.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Выступаюць. Такімі прыкметамі эсэ, якія выступаюць у тэксце Валянціна Акудовіча, з’яўляюцца: выяўленне аўтарскай індывідуальнасці; вобразнасць, асацыятыўнасць і свабода выказвання; канкрэтныя ўражанні ад непасрэдных фактаў; тэма застаецца не скончанай і не вычарпанай.

## Zadanie 4. (0–1)

**У тэксце *Эсэ пра эсэ* Валянцін Акудовіч піша, што “ў Францыі эсэ аднойчы выбухнула свабодай, у Беларусі наадварот – свабода выбухнула эсэістыкай”. Пацвярджае ці зняпраўджвае эсэ Уладзіміра Арлова *Незалежнасць – гэта…* гэтую тэзу? Адказ абгрунтуй.**

…………………………………………………………………………………………………………..

…………………………………………………………………………………………………………..

…………………………………………………………………………………………………………..

…………………………………………………………………………………………………………..

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].
   3. Pogłębianie zdolności rozumienia wartości o charakterze narodowym […] i uniwersalnym.

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy […] oraz ich funkcje w utworze,
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki, […] filozoficzny […],
   11) dostrzega obecne w utworach literackich oraz innych tekstach kultury wartości narodowe i uniwersalne.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna argumentacja.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Эсэ Уладзіміра Арлова пацвярджае тэзу Валянціна Акудовіча, таму што аўтар эсэ “Незалежнасць – гэта…” у сваім тэксце адлюстраваў грамадска-палітычныя настроі ў краіне, гэты твор быў квінтэсенцыяй пастулатаў незалежніцкага асяроддзя, якое разважала, сярод іншага, над сутнасцю паняцця свабоды.

## Zadanie 5. (0–1)

**Ірэна Сікора сцвярджае, што “Са спецыфікі жанру вынікае, што пазіцыя наратара павінна нагадваць сакратаўскую пазіцыю, якая заключаецца ў крытычным поглядзе на рэчы, на развазе над вартасцямі і адкрытасці на інтэрпрэтацыю навакольнага свету[12]”. Ці выяўляецца ў эсэ Уладзіміра Арлова *Незалежнасць – гэта...* сакратаўская пазіцыя? Адказ абгрунтуй.**

……………………………………………………………………………………………..............

……………………………………………………………………………………………..............

……………………………………………………………………………………………..............

……………………………………………………………………………………………..............

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.

1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu (tytuł, [...] słowa-klucze),
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki, […] filozoficzny […].

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawna argumentacja.

0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Сакратаўская пазіцыя выступае ў эсэ Уладзіміра Арлова: аўтар разважае над такой вартасцю, як незалежнасць, разглядае і інтэрпрэтуе яе з розных бакоў, а таксама з перспектывы розных людзей (прыкладам, дзяцей, студэнтаў, жаўнераў і г.д.).

---

[12] I. Sikora, *Próba teorii eseju na tle historycznym,* “Litteraria”1978, s. 45. Tłum. na język białoruski – Iryna Aheyeva.

## Zadanie 6. (0–1)

**У эсэ *Незалежнасць – гэта...* Уладзімір Арлоў піша : “Незалежнасць – гэта калі ты з’явішся на свет у радзільні, дзе няма сама стэрыльных на зямлі прусакоў, затое ёсць аднаразовыя шпрыцы і пялюшкі”. Дакажы, што ў гэтым фрагменце выяўлена іронія.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) dostrzega i potrafi komentować estetyczne wartości utworu literackiego (poziom rozszerzony),
   5) wskazuje zastosowane w utworze językowe środki wyrazu artystycznego [...] i określa ich funkcje.

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie występującej w utworze ironii.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Іронія заключаецца ў тым, што аўтар адмоўна ставіцца да савецкай рэчаіснасці і насмешліва яе апісвае.

## Zadanie 7. (0–2)

**У якім творы беларускай літаратуры таксама закранаецца тэма незалежнасці? Выберы і пазнач яго загаловак. Акрэслі жанр гэтага твора.**

**А.** Янка Купала, *Тутэйшыя*

**Б.** Максім Багдановіч, *За сто лет*

**В.** Якуб Колас, *Новая зямля*

**Жанр:**……………………………………………………………………………………

### Wymaganie ogólne
III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe
1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   3) dostrzega i potrafi komentować estetyczne wartości utworu literackiego (poziom rozszerzony),
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki […].

### Zasady oceniania
2 pkt – poprawne wskazanie utworu i określenie gatunku.
1 pkt – wskazanie utworu.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Rozwiązanie
A

### Przykładowe rozwiązanie
Трагікамедыя

## Zadanie 8. (0–1)
**У пададзеным тэксце Валянціна Акудовіча сцвярджаецца, што прадмова да паэтычнага зборніка *Дудка беларуская* Францішка Багушэвіча з’яўляецца геніяльным эсэ. Сярод прапанаваных сцвярджэнняў выберы і пазнач тыя, якія сведчаць на карысць гэтай тэзы.**

| | |
|---|---|
| **А.** | У прадмове Ф. Багушэвіча аўтар атаясамліваецца з наратарам. |
| **Б.** | У прадмове Ф. Багушэвіча ўзнімаюцца актуальныя праблемы рэчаіснасці сучаснай аўтару. |
| **В.** | У прадмове Ф. Багушэвіча шмат стылістычных сродкаў, якія па-мастацку апісваюць рэчаіснасць. |
| **Г.** | Прадмова Ф. Багушэвіча мае форму адозвы. |

### Wymaganie ogólne
III. Kształcenie literackie i kulturowe.
1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe
1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   5) w interpretacji eseju […] wykorzystuje wiedzę o jego cechach gatunkowych (poziom rozszerzony).
   10) wykorzystuje w interpretacji utworu konteksty: literacki […].

## Zasady oceniania

1 pkt – dwie poprawne odpowiedzi.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Rozwiązanie

А, Б

## Zadanie 9. (0–1)

**Напішы, над якім аспектам незалежнасці разважае Францішак Багушэвіч у пададзеным ніжэй урыўку прадмовы.**

Францішак Багушэвіч
***Прадмова да "Дудкі беларускай"***

Якаясь маленькая Булгарыя – са жменя таго народу, – якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя […] маюць па-свайму пісаныя і друкованыя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што "піша па-мужыцку", і як дурня абсмяялі б!

Ф. Багушэвіч, *Прадмова* [у:] knihi.com

………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

## Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

## Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   8) rozpoznaje podstawowe motywy [...] oraz ich funkcje w utworze,
   11) dostrzega obecne w utworach literackich [...] wartości narodowe i uniwersalne.

## Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie.
0 pkt – odpowiedź niepoprawna albo brak odpowiedzi.

## Przykładowe rozwiązanie

У прыведзеным фрагменце разглядаецца культурны кампанент незалежнасці, а менавіта значэнне роднай мовы і яе прысутнасці ў друкаваных выданнях.

## Zadanie 10. (0–1)

**Напішы, якую функцыю выконвае ў эсэ *Незалежнасць – гэта…* паўтарэнне слоў, вынесеных у загаловак?**

Уладзімір Арлоў
***Незалежнасць – гэта…***

Незалежнасць – гэта калі на Божай пасцелі ведаеш, што пасля таго, як ты памяняеш гэты свет на лепшы, на месцы царквы ці касцёла, дзе цябе хрысцілі і дзе ты вянчаўся, не выкапаюць сажалку з брудным лебедзем і не пабудуюць басейн імя XVIII з'езду КПСС, а могілкі, дзе будуць спачываць твае косці, не знясуць і не ператвораць у закіданы пустымі пляшкамі парк культуры і адпачынку імя таварыша Гарбачова або імя таварыша Лігачова.

Незалежнасць – гэта...

Незалежнасць – гэта калі ад нараджэння да скону пачуваешся сваім чалавекам на сваёй зямлі.

У. Арлоў, *Незалежнасць – гэта…* [у:] www.svaboda.org

……………………………………………………………………………………………...........

……………………………………………………………………………………………...........

……………………………………………………………………………………………...........

……………………………………………………………………………………………...........

### Wymaganie ogólne

III. Kształcenie literackie i kulturowe.
   1. Pogłębianie umiejętności analizy i interpretacji utworów literackich […].

### Wymagania szczegółowe

1. Analiza i interpretacja utworów literackich. Zdający:
   9) wykorzystuje w interpretacji elementy znaczące dla odczytania sensu utworu [...],
   3) dostrzega i potrafi komentować estetyczne wartości utworu literackiego (poziom rozszerzony).

### Zasady oceniania

1 pkt – poprawne wyjaśnienie funkcji powtórzenia.
0 pkt – odpowiedź niepełna lub niepoprawna albo brak odpowiedzi.

### Przykładowe rozwiązanie

Паўтарэнне слоў “незалежанасць – гэта” ілюструе шматаспектны характар паняцця незалежнасці, паказвае, што гэтае паняцце датычыць розных сфер жыцця чалавека, грамадства, дзяржавы. Паказвае, што гэта паняцце адкрытае.

## Tematy wypracowań na poziomie rozszerzonym

Prezentowane w Informatorze przykładowe wypracowania są pracami uczniowskimi pozyskanymi z próbnego zastosowania i ocenionymi przez egzaminatorów. W pracach dokonano niezbędnych zmian w zakresie stylu, poprawności języka, ortografii i interpunkcji.

Tematy wypracowań będą poprzedzone szczegółowymi wytycznymi:

Wybierz **jeden** z poniższych tematów i napisz wypracowanie.

- W pracy rozważ **problem** podany w temacie.
- W rozważaniach przedstaw **argumenty**, odwołując się do **utworów literackich** /tesktów nieliterackich wskazanych w temacie oraz innych wybranych utworów literackich z literatury białoruskiej.
- W wypracowaniu przedstaw **swoje zdanie** i **uzasadnij** je.
- Twoja praca powinna liczyć co najmniej **350 wyrazów**.

### Temat 1. (0–35)

**Тэма кахання і спосабы яе мастацкай рэалізацыі ў літаратуры. Зрабі параўнаўчую інтэрпрэтацыю пададзеных вершаў Яўгеніі Янішчыц і Максіма Багдановіча. Твая праца павінна складацца не менш чым з 350 слоў.**

Яўгенія Янішчыц

***Ты пакліч мяне. Пазаві...***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават нянавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Я. Карчэўскі, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2019, c. 124.

Максім Багдановіч
***Раманс***

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе, – у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

М. Багдановіч, *Раманс* [у:] knihi.com

**Wymagania ogólne i szczegółowe**
Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 135. *Informatora*.

**Zasady oceniania**
Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 138.–152. *Informatora*.

**Przykładowe ocenione rozwiązania**

Przykład 1.

Тэма кахання часта паяўляецца ў беларускай літаратуры. Пісьменнікі выяўляюць яе на розныя спосабы. У вершы Яўгеніі Янішчыц “Ты пакліч мяне. Пазаві...” ёсць вобраз вялікай любві, а ў “Рамансе” Максіма Багдановіча больш сумны вобраз, дзе закаханыя тужаць адно па адным.

Верш Максіма Багдановіча “Раманс” выражае пачуцці юнака, які спазнаў шчасце кахання, а цяпер засмучаны тым, што расстаецца з любай дзяўчынай. Тут паяўляюцца знаёмства з каханай, радасць першага спаткання і смутак развітання – усё гэта напаўняе душу лірычнага героя і звязваецца з вобразам зоркі Венеры. Гэты вобраз стварае агульны рамантычны настрой у вершы. Ён з’яўляецца сімвалам шчырага і захапляючага кахання хлопца. З зоркай Венерай зліваецца таксама вобраз дзяўчыны, якая выклікала ў юнаку такое цудоўнае пачуццё.

Мы не ведаем прычыны расставання двух закаханых маладых людзей. Толькі ведаем, што ў нейкім далёкім краі лірычны герой кожную ночку будзе глядзець на зорку і ўспамінаць сваю каханую дзяўчыну, якую просіць не забываць пра ўсё супольна пражытае і таксама глянуць на зорку Венеру. Такім чынам ім будзе здавацца, што яны знаходзяцца побач. Сітуацыя юнака напамінае нам лёс самога Максіма Багдановіча, які, свядомы сваёй хваробы, не хацеў моцна вязацца з ніякай жанчынай.

У вершы Яўгеніі Янішчыц "Ты пакліч мяне. Пазаві..." лірычная асоба хоча, каб яе хтосьці паклікаў. Магчыма, яна хоча, каб першы крок у каханні зрабіў гэты другі чалавек, што яна на гэта чакае. Лірычнае "я" гаворыць, што ўсё пачынаецца з любві. Усё гэта ёсць цудоўнае. Кожны крок залежыць ад пачуцця любві. Дзякуючы гэтаму, змяняюцца краявіды, салаўі пачынаюць весялей спяваць, а нават знікае нянавісць і абіда. Лірычная асоба разлічвае, што калі яе паклічуць, усё стане добрым. Свет напоўнены каханнем будзе яшчэ лепшы.

У абодвух творах выступае матыў кахання. Максім Багдановіч паказаў любоў, карыстаючыся многімі паэтычнымі сродкамі, напрыклад эпітэтамі: "светлыя згадкі", "ціхім каханнем", "далёкім краю". Увесь твор "Раманс" маляўнічы і меладычны. У вершы "Ты пакліч мяне. Пазаві..." гэтых сродкаў менш, але таксама выступаюць эпітэты ("простая ява", "першыя крокі") ды цікавыя метафары ("душой не крыві", "сто дарог за маімі плячыма"). Мастацкія сродкі ў лепшай ступені перадаюць тое, што аўтары хацелі ўкласці ў свае паэтычныя творы.

Гэтыя два паэтычныя творы спалучае тэма кахання, хаця паэты прадставілі яе на розныя спосабы. У Максіма Багдановіча лірычная сітуацыя больш сумная, чым у Яўгеніі Янішчыц. У "Рамансе" лірычнае "я" звяртаецца да канкрэтнай асобы – да сваёй каханай дзяўчыны, а ў творы "Ты пакліч мяне. Пазаві..." адрасатам можа быць які-небудзь чалавек. Вершы выклікаюць розныя пачуцці і рэфлексіі. Пры прачытанні твора Максіма Багдановіча чалавеку становіцца сумна, а твор Яўгеніі Янішчыц схіляе да разважанняў пра жыццё.

На падставе гэтых двух вершаў мы можам пабачыць, якімі рознымі спосабмі можа раскрывацца тэма кахання ў паэзіі.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 15 pkt – dwa utwory wykorzystane (porównane) w pełni funkcjonalnie, argumentacja zadowalająca, rzeczowa, pogłębiona, poparta trafnymi przykładami. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu obyczajowego i biograficznego autora.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 6 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, precyzyjne słownictwo; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – 1 błąd interpunkcyjny.

Przykład 2.

Тэма кахання краналася ў кожную літаратурную эпоху. Аб любові, як прыгожым і важным пачуцці, але таксама такім, якое прыносіць боль і смутак, гаворыцца ў вершы Максіма Багдановіча – пісьменніка XX ст. – “Раманс” і ў творы сучаснай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц “Ты пакліч мяне. Пазаві...”, і таму ў сваёй працы я зраблю параўнаўчую інтэрпрэтацыю гэтых вершаў.

У творы “Раманс” ёсць матыў ўспамінаў аб светлым і шчырым каханні. Верш захапляе глыбінёй і шчырасцю перажыванняў юнака, які спазнаў шчасце кахання і засмучаны тым, што расстаецца з любай дзяўчынай. Знаёмства з каханай, радасць першага спаткання і смутак развітання напаўняюць душу лірычнага героя, асацыіруюцца з вобразам зоркі Венеры. Гэты вобраз стварае агульную рамантычную танальнасць верша. Ён узнікае як паэтычная паралель да перажыванняў юнака, як увасабленне яго ідэалу, як сімвал яго шчырага, рамантычна захапляючага кахання.

Лірычна-задуменная інтанацыя, якой перадаецца радасць першага спаткання і смутак развітання, надае вершу светла-тужлівы настрой. Пачуццё выказана стрымана, многае невысказана. Мы не ведаем прычыны расставання, але каханне жыве ў душы юнака. Гэта памяць яго сэрца, найдаражэйшы скарб, які трэба захоўваць.

Яўгенія Янішчыц у сваім творы піша пра каханне вельмі падобна на Максіма Багдановіча. Па словах паэткі, любоў гэта прыгожае пачуццё, але можа прычыніць боль і смутак чалавеку. У вершы гаворыцца пра тое, што любоў цудоўная бо з яе ўсё пачынаецца і заканчываецца. Без кахання не было б нічога. (“Пачынаецца ўсё з любві, / Нават самая простая ява.”). Дзякуючы любові, чалавек таксама бачыць больш прыгажосці ў свеце, жыцці; яна дае чалавеку радасць, тое, што калісьці здавалася брыдкім, цяпер можа быць прыгожым. (“Прыручаюцца салаўі. / І змяняюцца краявіды.”). Паэтка заклікае нас таксама любіць, нягледзячы ні на што, заклікае ісці за сваімі каханымі хоць на край свету – “Ты пакліч мяне. Пазаві. / Сто дарог за маімі плячыма”. Часам каханне можа не быць такім прыгожым. Яно можа прычыніць нам боль і смутак, калі каханы чалавек здрадзіць нас, ці не будзе цаніць нашай любові і нас. Тады ў нашым сэрцы з’яўляецца агіда, мы пачынаем ненавідзець гэтага чалавека. (“Пачынаецца ўсё з любві – / Нават нянавісць і агіда...”).

Спадзваяюся, што я правільна зінтэрпрэтавала вершы. Яны вельмі цікавыя і рамантычны. Я думаю, што самае галоўнае гэта тое, што каханне вельмі важнае і патрэбнае ў жыцці чалавека, незалежна ад яго вобразу. Цудоўная любоў прыносіць чалавеку радасць, а дрэнная будуе ў нім сілу і ўстойлівасць да пакут, зла.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 14 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane (porównane) w pełni funkcjonalnie, argumentacja powierzchowna. Częściowe wykorzystanie kontekstu społecznego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 3 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, 11 błędów językowych; ortografia – 1 pkt – 3 błędy ortograficzne; interpunkcja – 1 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

Przykład 3.

Паэзія часта датыкае тэмы кахання. У вершах “Раманс” Максіма Багдановіча і “Ты пакліч мяне. Пазаві” Яўгеніі Янішчыц можна знайсці вобраз любві, якая з’яўляецца важнай рэчай для абодвух аўтараў. Каханне прадстаўлена ў незвычайны і магічны спосаб, таму што абое паэты думаюць пра каханне як пра каштоўнасць і штосьці вельмі істотнага. Любоў мастакоў у абодвух тэкстах указуецца як мара, жаданне. Творы паказуюць любоў двух людзей як патрэбу і неабходнасць, без якой чалавек не можа жыць.

Абодва вершы указуюць вялікае значэнне любові ў жыццю чалавека. Лірычны герой у творы Яўгеніі Янішчыц пераказуе чытачам галоўную думку на тэму кахання, менавіта што ўсё у жыцці чалавека пачынаецца з любві. У тэксце аўтарства Максіма Багдановіча лірычны герой зазначае, што ён любові да другога чалавека ніколі не забудзе, нягледзячы на адлегласць і растанне.

Аўтары твораў “Ты пакліч мяне. Пазаві” і “Раманс” апісалі сітуацыю у якой чалавек пачынае праўдзіва жыць толькі тады, калі ён закахаецца. Сведчаць пра тое словы “...пачынаецца ўсё з любві...”, якія часта паўтараюцца ў вершы Яўгеніі Янішчыц.

Абодва тэксты кажуць аб важнай ролі другой асобы і звяртаюцца да яе. У вершы Яўгеніі Янішчыц лірычны герой звяртаецца да любімай асобы па словах, якія выступаюць ужо ў самым загалоўку твора “Ты пакліч мяне. Пазаві”. Гэта з’яўляецца просьбай да аб’екта кахання, лірычнае “я” хоча звярнуць увагу свайго любага, каб ён адзначыў сваю прысутнасць. Лірычны суб’ект Максіма Багдановіча таксама накіроўвае свае словы да ўкаханай, з гэтай розніцай, што ён хоча развітацца.

Творы абодвух пісьменнікаў указуюць выгады і карысці, якія нясе любоў. Для чалавека, які прамаўляе ў вершы Максіма Багдановіча адсутнасць кахання абазначае нуду і адзіноту. Найбольшай выгодай, якая вынікае з кахання ёсць кампанія другога чалавека. У вершы “Ты пакліч мяне. Пазаві” падмет апісуе ўсе добрыя рэчы, якіх ён дазнаў ў час кахання. Дзякуючы любові, асоба пачала бачыць больш света, пазмяняліся ёй краявіды.

Любоў часта стае тэмай літаратуры, таму што яна часта датычыць многіх людзей. Гэта галоўны матыў у вершах “Раманс” і “Ты пакліч мяне. Пазаві”, якія указуюць любоў як вельмі важную і істотную рэч у жыцці кожнага чалавека. Каханне ў абыдву тэкстах з’яўляецца ўспамінамі, патрэбай, марамі і ўсім тым дзякуючы чаму чалавек можа быць шчаслівым і сумным, задаволеным і злым. І дзякуючы таму, людзі могуць праўдзіва жыць.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe: 7** pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane częściowo funkcjonalnie (porównanie częściowe). Zadowalająca argumentacja. Częściowe wykorzystanie kontekstu społecznego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – kompozycja wypowiedzi jest funkcjonalna; spójność wypowiedzi – 2 pkt – w wypowiedzi występują 3 zaburzenia w spójności; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zadowalający zakres środków językowych – 1 pkt – 15 błędów językowych; ortografia – 1 pkt – 3 błędy ortograficzne; interpunkcja – 1 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

## Temat 2. (0–35)

**Тэма горада і спосабы яе мастацкай рэалізацыі ў беларускай літаратуры. Зрабі параўнаўчую інтэрпрэтацыю пададзеных вершаў Алеся Разанава і Надзеі Артымовіч. Твая праца павінна складацца не менш чым з 350 слоў.**

Алесь Разанаў
***Стары горад***

На ацішэлых падворках, ля гонты і чарапіцы, квітнее ружовы і белы бэз і асвятляе сваім цвіценнем, сваім разуменнем горад, што паглыбляецца ў даўніну.
Кашлаты дзядоўнік натоўпіцца каля паркана:
кожная лапушына – шаля,
кожная лапушына – голас,
кожная лапушына – далонь:
наноў разважае зялёнае веча, наноў узважвае думнае веча кошт смерці і кошт жыцця...

Пакінулі апошнія жыхары свае дамы-мураванкі, свае драўляныя хаты з аканіцамі і ліштвой і ўсё, што мелі, што нажывалі, што памяталі, што снілі, пабралі ў пярэбары, у перасяленне, у новы кут...
Ды нехта ўсё роўна сюды вяртаецца неадольна,
нешта ўсё роўна тут, быццам колісь, жыве:
тут раптам зазвоняць званы трывожна,
зацокаюць раптам падковы па бруку,
раптам дзіця заплача,
раптам некага нехта пакліча, і той адгукнецца ў адказ...
Тут пласт на пласце, на падмурку – падмурак.
Тут свае таямніцы, свой радавод, свой лад.
Тут нешта тоіцца, нешта хаваецца, нешта ўхіляецца ад разгляду...
Падводзіцца да старога горада вузкакалейка.
Па старым горадзе ходзяць узброеныя патрулі.

А. Разанаў, *Лясная дарога,* Мінск 2005, с. 38.

Надзея Артымовіч

Прысвячаю Бельску

***Мой родны горад маленькі***

Маленькі
Як кропля дажджу
Жыццё кроплі дажджу
Кароткае
Яна расплываецца
Перастае існаваць
Калі ўпадзе на зямлю.
Мой родны горад
Малы
Як кропля дажджу
Але
Не расплывецца ён ніколі
Не знішчыць яго бура
Агонь не спаліць.
Горад мой
Твае вузкія вуліцы
Поўны людзей
Людзей старых
І дзяцей
Як добра
Уліцца
У раку старых людзей і дзяцей
Удыхаць
Паветра.
Дрэва без кораня
Усыхае
Чалавек без паветра
Умірае.

Н. Артымовіч, *Жоўтая музыка*, Беласток 2005, с.38.

**Wymagania ogólne i szczegółowe**
Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 135. *Informatora*.

**Zasady oceniania**
Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 138.–152. *Informatora*.

## Przykładowe ocenione rozwiązania

Przykład 1.

Тэму горада ўпершыню ў беларускай паэзіі закрануў выдатны творца нашаніўскай пары Максім Багдановіч. З гэтага часу паявіліся шматлікія вершы, якія па-рознаму прадстаўлялі вобраз горада. На сучасным этапе гэтая тэма даволі папулярная, між іншым таму, што многія паэты паходзяць з гарадскога асяроддзя.

У сваім сачыненні я разгляджу два вершы сучасных паэтаў. Кожны з іх па-свойму паказвае вобраз горада.

Верш "Стары горад" Алеся Разанава гучыць як успамін пра горад, які ўжо не існуе, а прынамсі тут ніхто не пражывае. Сведчаць аб тым апусцелыя панадворкі і дамы. Вакол расце дзядоўнік, які займае штораз большую плошчу. І гэта ён з'яўляецца немым сведкам таго, што тут адбываецца. Дзе-нідзе цвіце бэз, які быццам асвятляе гэты забыты горад, з'яўляецца адзінай радаснай кропкай на яго карце. Людзі пакінулі гэтае месца, магчыма што не па ўласнай волі. Яны аставілі тут свае дамы – свой жыццёвы набытак. І толькі час ад часу хтосьці паявіцца, каб забраць свае апошнія рэчы. Гэты стары горад мае таксама сваю гісторыю ды скрывае нейкія таямніцы. Да яго падыходзіць вузкакалейка, якой пэўна адправіліся жыхары ў сваё новае жыццё. Матыў узброеных патруляў сведчыць пра тое, што гэта можа быць нейкая закрытая зона. Усё гэта стварае даволі панурую і сумную карціну.

Каб звярнуць большую ўвагу на пэўныя дэталі горада, паэт карыстаецца эпітэтамі і метафарамі (белы бэз асвятляе сваім цвіценнем горад, кашлаты дзядоўнік натоўпіцца каля паркана), а таксама анафарай (кожная лапушына – шаля / кожная лапушына – голас / кожная лапушына – далонь).

Зусім іншы вобраз места паяўляецца ў вершы Надзеі Артымовіч, якая ў самім пачатку заяўляе, што прысвячае твор свайму роднаму гораду – Бельску Падляшскаму. Перадусім адчуваем мы тут вялікую эмацыянальную прывязанасць лірычнага героя (якім можа быць паэтэса) з гэтым месцам. Горад – гэта штосьці адзінае і непаўторнае, гэта крэпасць і аазіс. Але гэта таксама людзі, якія ідуць, мітусяцца, смяюцца, размаўляюаць. Маладыя і старыя. Дзякуючы ім і дзеля іх горад жыве. Сярод гэтых людзей лірычны герой адувае сябе як у нейкай стыхіі. Сам горад невялікі, у ім многа вузкіх вуліц, але гэта тое месца, якое дае імпульс для жыцця ды натхненне для творчасці.

У вершы Артымовіч сустракаем памяншальна-ласкальныя формы (маленькі), параўнанні (горад як кропля дажджу), эпітэты (вузкія вуліцы) ды метафары (уліцца ў раку людзей). Усе яны дапамагаюць лепш зразумець эмоцыі лірычнага героя ды ўявіць, як сапраўды выглядае горад.

Адзіным падабенствам абодвух вершаў з'яўляецца тэма ды іх вершаваная пабудова.

Алесь Разанаў засяродзіў сваю ўвагу на выглядзе горада, яго архітэктуры, Надзея Артымовіч выэкспанавала свае эмоцыі ў адносінах да свайго роднага горада ды падкрэсліла, што ў ім бурліць жыццё. У вершах розны настрой – сумны і журботны ў першым выпадку, вясёлы і жыццярадасны ў другім выпадку. Бельск Падляшскі Надзеі Артымовіч, хаця мае сваю багатую гісторыю, здаецца быць горадам намнога больш сучасным і маладым у параўнанні з ананімным горадам Алеся Разанава.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 16 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane (porównane) w pełni funkcjonalnie, argumentacja jest bogata, wnikliwa i zróżnicowana. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu literackiego i biograficznego. Wypowiedź świadczy o erudycji zdającego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 7 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, precyzyjne słownictwo; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem interpunkcyjnym.

Przykład 2.

Горад мае вялікае значэне для пісьменнікаў. Яны апісваюць свае ўспаміны або пачуцці, звязаныя з жыццём у горадзе. Гэта могуць быць пазітыўныя або сумныя думкі. Некаторыя з іх з горада робяць героя быццам з чалавека. Горад мае тады чалавечыя рысы. Спосабаў апісання ёсць вельмі шмат. Аднак кожны твораца хоча паказаць нешта іншае.

“Стары горад” Алеся Разанава і “Мой родны горад маленькі...” Надзеі Артымовіч гэта вершы, ў якіх галоўная тэма – горад. “Стары горад” гэта ціхае і пустое месца. Калісьці магла быць там спакойная вёска, дзе жыхары добра паміж сабой жылі, а па вуліцы часта хадзілі коні. Аднак людзей перасялілі, а вёска вырасла да велічыні горада, які ўжо стары і мае сваю гісторыю. Замест каней, па горадзе ездзіць калейка, а замест жыхароў ходзяць патрулі. Гэта можа абазначаць, што маем час вайны або камунізму. Людзі там не маюць ужо свабоды, а горад ужо такі вялікі, што яны адчуваюць там сябе самотна.

Зусім іншая лірычная сітуацыя выступае ў вершы “Мой родны горад маленькі...”. Там лірычнае “я” адчувае сабе шчаслівым і свабодным сярод старых і маладых людзей. Кажа, што, як дрэва без кораня не пражыве, так яна без паветра гэтага горада жыць не зможа. Лірычны герой параўновае кароткае жыццё да кроплі дажджу. Яго горад малы як гэта кропля, але больш трывалы.

Настрой вершаў ўзняты і паважны. Верш Артымовіч гэта маналог лірычнага героя. Паэты паказваюць горад як сімвал свабоды і росквіту жыцця, як бэз у вершы Разанава або лапушыны як шаля, голас ці далонь.

Вершы трактуюць таксама пра час, які плыве. Паэты паказваюць гарады як вечны твор чалавечага жыцця.

Час жыцця паэтаў гэта самы важны кантэкст для разумення твораў. Алесь Разанаў нарадзіўся ў тысяча дзевяцьсот сорак сёмым годзе і ў яго творах можна дашукацца матываў паваеннай рэальнасці. Надзея Артымовіч нарадзілася год раней, чым Разанаў. У вершы пра горад Бельск можна зразумець, што гэта панадчасовы горад, які таксама калісьці дакткнула сусветная вайна, але не знішчыла яго.

Вершы навязываюць да падобных тэм. Гавораць пра старыя гарады, якіх час не знішчыў, але змяніў. Гарады гэта розныя сімвалы: жыцця, часу, чалавека. Для мастакоў з’яўляюцца крыніцай ведаў і вечнасці, а таксам выяўленнем сваіх

пачуццяў. Вершы паказваюць гарады ў розны спосаб, часта уносяць нешта новае, звяртаюць увагу на тое, чаго звычайны жыхар не заўважае.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 14 pkt – w pracy dwa utwory wykorzystane w pełni funkcjonalnie, argumentacja powierzchowna. Kontekst biograficzny wykorzystano częściowo funkcjonalnie.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 4 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, precyzyjne słownictwo, 9 błędów językowych; ortografia – 1 pkt – 3 błędy ortograficzne; interpunkcja – 1 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

Przykład 3.

Паэтычныя творы пішуць пра каханне прыроду ці іншыя справы. У вершах Алеся Разанава і Надзеі Артымовіч мы знаходзім вобраз горада.

У вершы “Мой родны горад маленькі...” Надзея Артымовіч апісвае свой родны горад Бельск Падляшскі. Яна параўновае яго да кроплі дажджу, таму што ён малы але яго адрознівае ад кроплі тое, што ён завсёды будзе і ніпто яго не можа знішчыць. Паэтэса звярте увагу на вузкія вуліцы дзе многа старых і маладых людзей, дзе многа жыця і радасці. Яна любіць хадзіць па вуліцах горада і адчуваць яго атмасферу. Яна піша, што не умела б жыць ў іншым месы на свеце таму што паветра Бельска выключнае. Аўтарка ў гэтым месцы паказвае сваю любоў да роднага горада.

Іншы вобраз горада паказаў Алесь Разанаў ў вершы “Стары горад”. У гэтым горадзе мала людзей, асталіся тут толькі старыя. Маладыя пакінулі свае хаты і выехалі шукаць новага лепшага месца да жыцця. У пакінутым горадзе ўсё прыціхла, толькі часам задзвоняць званы, конь зацока падковамі або людзі адазвуцца. Места выглядае як бы вярнулася назад, у свае вытокі калі яно толькі паўставала і было тут зусім мала людзей. Горад пачынаюць займаць расліны, на ацішэлых падворках пачынае цвісці каляровы бэз. Дзіўнай справай з’яўляецца тое, што па вуліцах горада ходзяць узброеныя патрулі, што можа абазначаць, што раней здарылася тут нешта дрэннае і трэба пільнаваць, каб гэта не паўтарылася.

Абодва вершы апісваюць горад, але ў іншы спосаб. Надзея Артымовіч захапляецца сваім родным горадам, гаворыць, за што яго цэніць. Яна верыць, што ён заўсёды будзе і заўсёды тут будуць жыць людзі, якія разам з мурамі горада ствараюць прыемную атмасферу якой нідзе больш няма. Паэтэса піша, што без гэтага горада не магла б жыць.

Яна правела тут сваё дзяцінства і маладосць. Тут у яе таксама многа знакомых і сяброў. Яна моцна звязана з гэтым горадам. Многіе месцы ў Бельску ей важныя. Яна у іх знаходзіць інспірацыю да сваіх вершаў. Паэтэса не выабражае каб жыць у іншым месцы. Яна многа вершаў прысвяціла сваяму роднаму гораду.

Вобраз горада ў вершах можа быць розны, таму што гарады адрозніваюцца паміж сабой. Атмасферу ў горадзе ствараюць яго жыхары, якія выклікаюць таксама

пазітыўныя эмоцыі ў чытача. Горад з апусцелымі вуліцамі наводзіць смутак і трывогу. Часта скрывае ён таямніцы пра якія мала хто і ведае.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – interpretacja porównawcza; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 10 pkt – w pracy jeden utwór wykorzystany w pełni funkcjonalnie, a drugi – częściowo funkcjonalnie. Powierzchowna argumentacja. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu biograficznego i literackiego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 2 pkt – usterki w zakresie podziału tekstu na akapity; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź jest w całości spójna; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 0 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, 16 błędów językowych; ortografia – 0 pkt – 8 błędów ortograficznych; interpunkcja – 0 pkt – 10 błędów interpunkcyjnych.

## Temat 3. (0–35)

**Родная хата – духоўны фундамент ці матэрыяльны аб’ект? Паразважай над матывам роднай хаты ў беларускай літаратуры розных эпох. У сваёй аргументацыі абапірайся на пададзены фрагмент навуковай манаграфіі Аляксея Пяткевіча, а таксама на два выбраныя творы беларускай літаратуры. Твая праца павінна складацца не менш чым з 350 слоў.**

Аляксей Пяткевіч
***Матыў роднай хаты***

Паэтызацыя свае хаты як маральна-псіхалагічнага апірышча жыцця чалавека праходзіць і праз усю беларускую літаратуру ідэйнай і інтанацыйнай дамінантай. Гэта назіраецца і ў творчасці асобных пісьменнікаў, і ў самім гістарычным працэсе літаратурнага развіцця.

Яшчэ Кірыл Тураўскі шукаў каштоўнасць і характва ў жыллёвай прасторы чалавека, якая разглядалася ім з пазіцый хрысціянскага асветніцтва. Ён знаходзіў такую прастору ў храме, які ўспрымаўся як дом Госпада, дзе сумяшчаюцца шляхі нябесныя і зямныя, боскія і чалавечыя. Францыск Скарына лічыў, што родны кут чалавека дабраславёны боскай воляй, і ласкавая адданасць яму з’яўляецца сведчаннем магутных сіл жыцця, якія выяўляюцца і ў паводзінах насельнікаў прыроды. […]

Родная хата ў беларускай літаратуры часцей за ўсё не паказваецца паэтычна ўзвышана. Яна выглядае звычайнай тым больш, што бедная, старая, недагледжаная. Ужо ў гэтай яе асаблівасці – мастацкі стэрэатып беларускага селішча, прызначанага для прыгнечаных. Сціплая будыніна, “хатка” – для сціплага яе жыхара, што церпіць паднявольную долю.

Беднасць хаты тут – часціна беднасці жыцця, горкага лёсу ў “забраным краі” (Я. Купала). Толькі ў “Новай зямлі” Я. Коласа, дзе народнае жыццё з яго штодзённай культурай малюецца з светлага боку, хата лесніка вылучаецца ў сядзібным комплексе пэўным эстэтычным пазітывам: “У глыбі двара стаяла хата // І выглядала зухавата // Паміж запушчанай будовы, // Як бы шляхцянка засцянкова...”. У цэлым жа родная хата

бачыцца пісьменнікамі сумнай, вартай спагады (асабліва ў літаратуры XIX – пач. XX стст.) Я. Колас піша: “Помню, помню сваю хатачку, // маю родную, далёкую, // Як успомню – жаль агортвае // Маю душу адзінокую”. […]

У сучаснай нашай літаратуры хата (дом), як правіла, хораша паэтызуецца. У Р. Барадуліна – гэта велічная з’ява, якая будзіць таемнае, нават містычнае пачуццё роднасці (“святое штосьці”), што робіць чалавека шчаслівым. “Якую даль сабе ні сватай, // Шчыміць жадання асака – // Чуць першы гром // Над роднай хатай, // Чуць дома першага шпака”. Разам з тым Р. Барадулін вельмі добра адчувае эстэтычную цану малога, дробнага ў паказе роднага асяродка.

А. Пяткевіч, *Матыў роднай хаты* [у:] І.В. Жук [і інш.], *Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя: манаграфія*, Гродна 2009, с. 79–82.

**Wymagania ogólne i szczegółowe**
Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 135. *Informatora*.

**Zasady oceniania**
Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 138.–152. *Informatora*.

**Przykładowe ocenione rozwiązania**

Przykład 1.

Родная хата – гэта часта аб’ект рэфлексіі ва ўсім нашым жыцці. Яна з намі ад першых дзён – у дзяцінстве мы ў ёй праводзім кожны дзень. Першыя крокі ці словы ты вывучаў там. Яна з’яўляецца сімвалам сям’і і нашага развіцця. Паводле мяне, дом з’яўляецца як духоўным фундаментам, так і матэрыяльным аб’ектам у жыцці чалавека.

У беларускай літаратуры вельмі часта выступае матыў радзімы ці беларускай хаты, паказанай як маральна-псіхалагічнае апірышча. Таксама пра хату пісаў Аляксей Пяткевіч, які ў 2009 годзе ў артыкуле “Матыў роднай хаты” прааналізаваў гэтую тэму ў творах розных мастакоў на прасторы эпох.

Як кажа Пяткевіч, дом часцей быў прадстаўлены як звычайны твор людскіх рук. Большасць хат выглядала як бедныя і старыя будынкі. Яны былі сціплыя, без таемнага значэння, містычнага пачуцця. Мастацкае апісанне родных хат часта адклікалася да няволі Беларусі. Гэтыя хаты бачацца пісьменнікамі сумнымі, таму што ў нікога не было свабоды, нават крыху ўдачы. Ёсць і такія, што шукаюць у гэтых будынках пачуцця роднасці з беларускай ці іншай нацыяй. Яны заўважаюць духоўны і больш глыбокі аспект жыцця ў гэтых хатах, але яны ёсць меншасцю сярод пісьменнікаў.

Часам мастакі слова ў сваіх творах толькі апісваюць памяшканні ці прадметы ў родных хатах. Уладзімір Караткевіч – беларускі паэт, празаік і драматург у творы “Зямля пад белымі крыламі” прайшоў увесь дом, расказваючы пра яго прыгажосць. Аўтар вельмі дакладна апісаў выкарыстанне памяшканняў і мэблі. Ён звяртае ўвагу на выгляд ды інтэр’ер хаты. Называе таксама ўсялякія прылады, неабходныя ў штодзённым жыцці селяніна. Гэта больш апісанне роднай хаты з пункту гледжання яе матэрыяльных вартасцей.

У вершы “У роднай хаце” Рыгора Барадуліна мы можам убачыць духоўны аспект роднага дома. Яго ўвагу звяртае сямейнае цяпло і мір. Дом заўжды злучае людзей, ніколі не турбуе іх. Гэта спакой і цішыня. Хата поўная дзіцячых успамінаў. Усё там

знаёмае і поўнае казак. Можна сказаць, што гэта аповесць, нейкая гісторыя жыцця. Дом з'яўляецца родным цэнтрам дабра, пра які мы ніколі ў сваім жыцці не забываем. Для лірычнага героя кожны куток хаты прыносіць успаміны. Дом ёсць вельмі цэнны і блізкі сэрцу. Гэта абазначае, што родная хата з'яўляецца духоўным фундаментам.

Параўноўваючы тэксты беларускіх пісьменнікаў, я магу сказаць, што выступае шмат твораў, якія кранаюць гэтыя абодва аспекты дома – духоўны і матэрыяльны. Асабіста, майму сэрцу бліжэй да духоўнага фундаменту роднай хаты. Вельмі многа пісьменнікаў адчувае жаль і спачуванне, думаючы пра залежнасць іх радзімы ад іншай краіны. Тады гэта хата ўжо толькі рэч, а не пачуцці і ўспаміны. Ведаю, што дом з'яўляецца як духоўным фундаментам, так і матэрыяльным аб'ектам у жыцці чалавека.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 15 pkt – w pracy trzy teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, argumentacja rzeczowa, pogłębiona, poparta trafnymi przykładami. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu historycznego i literackiego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi, podział wypowiedzi – zarówno w skali ogólnej, jak i w zakresie podziału na akapity – jest poprawny i funkcjonalny; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 7 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, precyzyjne słownictwo; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem interpunkcyjnym.

Przykład 2.

Родная хата ёсць вельмі важнай для кожнага чалавека. Ад дзіцячых гадоў мы расцем у хаце побач бацькоў. Хата з'яўляецца не толькі звычайным будынкам. Гэта нешта большае. Яна ёсць таксама святыняй, таму што мы ў ёй правялі многа гадоў жыцця. Чалавек на старасць вяртаецца да гэтай святыні думкамі. На падставе прыведзенага фрагмента з навуковай манаграфіі Аляксея Пяткевіча і беларускай літаратуры з розных эпох я паспрабую даказаць, што родная хата гэта не толькі матэрыяльны аб'ект, а таксама духоўны фундамент.

У тэксце Аляксея Пяткевіча "Матыў роднай хаты" ёсць многа прыкладаў адлюстравання роднай хаты. Ён паказвае, што ў літаратуры дамінавала паэтызацыя хаты ў сэнсе маральнага і псіхалагічнага жыцця чалавека. Кірыла Тураўскі глядзеў на хату з пазіцыі хрысціяніна. Яна была месцам падобным да храма, дзе чалавек сустракаўся з Богам, з яго магутнымі сіламі. Аўтар таксама ўспамінае, што хату прадстаўлялі звычайна. Яна выглядала беднай і ўзнік стэрэатып, што там жыве селянін. Пяткевіч піша, што беднасць хаты ёсць паказана ў творах Янкі Купалы і Якуба Коласа. У "Новай зямлі" леснікова хата ёсць пазітыўнай, а ў іншых творах Коласа зноў сумнай. У сучаснай літаратуры родны дом паказаны як штосьці цудоўнае і таемнае. У творах Рыгора Барадуліна дзякуючы хаце чалавек ёсць шчаслівым. Ён ведае што малая і дробная хата гэта эстэтыка.

У вершы Рыгора Барадуліна “У роднай хаце” ёсць паказаная духоўнасць хаты. Лірычны герой знаходзіцца ў роднай хаце, дзе маці прыпамінае пра жаніцьбу. Да яго галавы прыходзяць думкі як калісці выглядала хата і што ў ёй змянілося. Ён разглядаецца па хаце, усё чуе і бачыць. Яму здаецца, што дом стаў меншым. Стук будзільніка напамінае маладыя гады. Бачыць таксама прыпечак і парог, які з гадамі пачарнеў.

Больш матэрыяльны вобраз хаты выступае ў вершы “Поўна хата экспанатаў” Віктара Шведа. У гэтым творы ёсць прадстаўлена хата дзеда, у якой многа розных экспанатаў. Швед пералічывае па чарзе розныя прадметы. Ёсць гэта між іншымі міска, лыжка, кросны, жорны і іншыя. Гэта старыя прылады, якія выкарыстываў калісці дзед. Ёсць там таксама святая ікона. Аўтар падкрэслівае, што ўсё ужо знішчана і не выкарыстоўваецца.

На падставе ўсіх аргументаў, якія адносяцца да роднай хаты, хачу даказаць, што тэзіс “Родная хата – гэта не толькі матэрыяльны аб’ект, але і таксама духоўны фундамент” ёсць правільны. Родная хата заўсёды будзе часткай чалавека.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 12 pkt – w pracy dwa teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, a trzeci – częściowo funkcjonalnie, bogata argumentacja, funkcjonalne wykorzystanie kontekstu społecznego i literackiego. Wypowiedź świadczy o erudycji zdającego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 5 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, 6 błędów językowych; ortografia – 0 pkt – 4 błędy ortograficzne; interpunkcja – 2 pkt – 4 błędy interpunkcyjne.

Przykład 3.

У беларускай літаратуры можна знайсці шмат матываў, якія звязаныя са штадзённымі, жыцёвымі праблемамі. Адным з іх з’яўляецца паказанне вобраза роднай хаты, каторы можа прадстаўляць хату як будынак, звяртаючы вагу толькі на фізічныя аспекты, або паказваць яе ў духоўны і эмацыянальны спосаб. Для беларускіх пісьменнікаў родная хата ёсць як духоўным фундаментам, так і матэрыяльным аб’ектам. У беларускай літаратуры выступае многа твораў, якія аднакова кранаюць гэтыя абодва аспекты.

Добрым прыкладам тут з’яўляецца манаграфія “Матыў роднай хаты” Аляксея Пяткевіча. Аўтар у першых фрагментах тэксту кажэ, што паэтызацыя хаты гэта натуральны і развіваючыся ў літаратуры працэс. У пачатку твора хата апісаная з увагі на яе духоўныя элементы. Пяткевіч звяртае увагу на Кірыла Тураўскага і Францыска Скарыну для якіх важным з’яўляўся Госпад, а храм уважана як дом Бога і надавана яму магічную вартасць. Аўтар ствярджае аднак, што ў беларускіх творах хату часцей паказуецца як матэрыяльную рэч. У беларускай літаратуры шмат вобразаў хат бедных і старых, якія сімвалізуюць нядолю людзей у “забраным краі”.

У вершы Віктара Шведа “Поўна хата экспанатаў” таксама выступае матыў роднай хаты. Паэт апісвае хату звяртаючы ўвагу на рэчы, якія знайдуюцца у сярэдзіне. Гэтыя экспанаты, пра якіх піша аўтар сімвалізуюць штодзённые жыццё. Напрыклад “святыя іконы” гэта сімвал веры і рэлігійнасці. У тэксце Швед успамінае “Круглы серп зублёвы / вялікія кросны”, якія з’яўляюцца сімвалам працы людзей на вёсцы. Аўтар піша пра хату як пра будынак, які без экспанатаў астальбы бескарысным. Для Віктара Шведа хата ёсць толькі фізічнай рэчай, будоўляй і толькі экспанаты надаюць ёй духоўнае значэнне. Пра лабільнасць хаты сведчаць таксама апошнія вершы твора, таму што трэба толькі адной запалкі, каб хата згарэла.

Іншая сітуацыя мае месца ў вершы “У роднай хаце” Рыгора Барадуліна, таму што аўтар гэтага тэксту апісвае сваю родную хату ў метафізічны спосаб і акцэнтуе яе духоўную істоту. Для пісьменніка хата асацыюецца са ўсімі момантамі чалавечага жыцця, напрыклад з жаніцьбой ці дзяцінствам. Барадулін шануе сваю родную хату за то, што яна заўсёды была адкрыта.

Матыў роднай хаты часта выступае ў беларускіх творах. Пісьменнікі аднак трактуюць тэму сямейнага дома ў розны спосаб. Некаторыя аўтары пішуць пра сваю хату звяртаючы ўвагу на яе істотнасць як будынак і месца пражывання, калі іншыя мастакі уключаюць духоўнасць роднай хаты ў сваіх працах.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 10 pkt – w pracy dwa teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, a trzeci – częściowo funkcjonalnie, zadowalająca argumentacja, kontekst wykorzystany częściowo funkcjonalnie.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 2 pkt – usterki w zakresie podziału tekstu na akapity; spójność wypowiedzi – 2 pkt – w wypowiedzi występują 4 zaburzenia w spójności na poziomie poszczególnych akapitów; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 1 pkt – składnia i leksyka stosowne, 15 błędów językowych; ortografia – 0 pkt – 4 błędy ortograficzne; interpunkcja – 1 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

## Temat 4. (0–35)

**Ці сплаціла беларуская літаратура доўг красы, пра які піша Вацлаў Ластоўскі ў пададзеным фрагменце? Абгрунтуй сваю думку. У сваёй аргументацыі абапірайся на фрагмент артыкула Вацлава Ластоўскага і два мастацкія творы беларускай літаратуры. Твая праца павінна складацца не менш чым з 350 слоў.**

Юрка Верашчака (В. Ластоўскі)
***Сплачвайце доўг***

Ехаў я чыгункай. Сустрэўся з нейкім пажылым ягамосцем, разгаварыліся. Сам ён родам з Тульскай губерні, жыве ў Пецярбургу, а кожнае лета праводзіць у Беларусі. Бываў ён у Крыме, на Каўказе, знае заграніцу.

– Толькі нідзе такой харошай, такой ціхай прыроды не бачыў я, – казаў ягамосць. – Ваш край – гэта дзіўная казка, дзіўная краса крыецца ў яе пагурках, гаях, лугах і рэках.

Такое тут усё ў вас спакойнае, ціхае, задумчывае, такое паэтычнае, такое ўсё, як французы кажуць, – bon ton, што я кожнае лета цягнуўся, каб дыхнуць вашым паветрам, пацешыць вока вашымі відамі.

Слухаў я гэтых слоў чужынца-старца, бывальца па свеце, і ў душы мне зрабілася сумна-сумна... Спомніліся мне вершы нашых беларускіх паэтаў, каторыя заместа ўслаўляць нашу, папраўдзе бязмерна харошую прыроду, абесслаўлялі яе. Адзін з іх кажа:

Куры, свінні, гною кучы
Напаўняюць кожны кут.
Вокны затканы анучай,
Так і кажуць: – Ўсюды бруд.

Другі падпявае:

Край наш бедны, край наш родны,
Гразь, балота ды пясок!

[…]

У канцы нехта чуткі з роспаччу крычыць:

Край ты мой родны,
Як выкляты Богам.

Супакойцеся, ягамосці, край наш не такі страшны, не такі сумны, брудны і бедны. Жывой красы ў прыродзе нашага краю, у людзях многа, хіба толькі тое сумна, што мы яе падмеціць, падгледзець не ўмеем. Я разумею яшчэ (ды і то з нацяжкай) енкі і плачы тых нашых белетрыстаў і паэтаў, каторыя (цыбуляй хіба крыху паціраючы вочы) плачуць над доляй селяніна […]. Але, дзякаваць Богу, ёсць жа ў нас ужо імёны, каторыя маюць шырокую славу не толькі ў нашай бязграматнай і безінтэлігенцкай бацькаўшчыне, а і далёка па-за межамі яе. Ад гэтых апошніх мы, чытаючае і думачае беларускае грамадзянства, у праве вымагаць чагось для сваёй душы, мерыць іхню творчасць меркай еўрапейскай, якую прыкладаюць усе народы на свеце да творчасці сваіх прарокаў. […]

Можа, скажуць мне, што апрача гною, пяску, ануч і драздоў у нас няма нічога годнага ўвагі. Даруйце, ягамосці-парнаснікі, але кожны грамадзянін мае права сказаць – я беларус, я часць народа – і, карыстаючыся гэтым правам, я, ніжэй падпісаны, прылюдна на ўвесь край крычу: апрача драздоў, ануч, гною і прakляцця ў маёй душы ёсць яшчэ шмат красы, перад маімі вачамі скрозь краса, жыццё, сонца, песні і бязмернае багацце відаў. […]

Мяне цікавіць не толькі тое, што Янка сядзіць на вузкім шнурочку зямлі, але больш таго, што гэты Янка чуе ў той момант, калі ён поўнымі грудзямі хапае пах чорнай, парэзанай плугам на скібы зямлі. […]

Маё штодзённае жыццё шэрае і цяжкае, і я хачу з вашых твораў навучыцца бачыць каля сябе красу, каторую я чую, што яна ёсць, але мая душа не так чутка, каб улавіць яе.

Я прывык глядзець на паэта, як на памазанніка Божага, як на прарока, і дзеля гэтага рука мая ніколі не памкнулася ўзяцца за пяро, каб накідаць вершы, бо я ў душы сваёй чуюся нягодным гэтага высокага імені. Але вы, каторыя пачуваецеся на сілах даць красу, даць мысль, паднімаць і вясці душы, чаму не выпаўняеце свайго пасланніцтва, чаму маўчыце, калі забіваюць у душах – незапісаных картах, красу, чаму не вучыце нас любіць і разумець гоман бору, плеск вады ў сонцы, задуму змеркаў, яснату ўсходаў, – чаму не распаляеце душ нашых пажарам любові, не сыпіце

чырвонцаў у жар гэты? Плакаць і сыпаць словамі сцёртымі, як дробная медзяная манета, як бачыце, і я ўмею, і гэтага з мяне годзе, але за вамі, калі вы не апраўдаеце паложаных на вас надзей, народ будзе лічыць доўг, і доўг гэты будзе чысліцца за вамі давеку.

"Наша ніва", 1913, № 26–27.

**Wymagania ogólne i szczegółowe**
Wykaz wymagań ogólnych i szczegółowych, sprawdzanych w wypracowaniu, znajduje się na s. 135. *Informatora*.

**Zasady oceniania**
Opis zasad oceniania zadań otwartych rozszerzonej odpowiedzi (wypracowań) znajduje się na s. 138.–152. *Informatora*.

**Przykładowe ocenione rozwiązania**

Przykład 1.

У сваёй працы я паспрабую адказаць на пытанне аб тым, ці беларуская літаратура сплаціла доўг красы, пра які піша Вацлаў Ластоўскі ў прыведзеным фрагменце. У сваёй аргументацыі я буду абапірацца на фрагмент артыкула Вацлава Ластоўскага "Сплачвайце доўг" і два мастацкія творы: "Беларусь для мяне – мая родная маці..." Янкі Золака, "На Беларусі Бог жыве" Уладзіміра Караткевіча.

На мой погляд, беларуская літаратура сплаціла доўг красы, які заключаўся ў тым, каб славіць прыгажосць Беларусі (яе людзей, прыроду і г.д.) у розных творах. Да ўзнікнення гэтага факту вельмі прычыніўся Вацлаў Ластоўскі і яго артыкул "Сплачвайце доўг". Пісьменнік быў першым, хто ў сваім артыкуле сказаў чытачу, што бачыць многа красы ў прыродзе і ў народзе Беларусі. ("Супакойцеся, ягамосці, край наш не такі страшны, не такі сумны, брудны і бедны. Жывой красы ў прыродзе нашага краю, у людзях многа".) Ён таксама быў першым, хто публічна раскрытыкаваў творчасць беларускіх пісьменнікаў за тое, што яны ў сваёй дзяржаве бачаць толькі бруд, гора, беднасць, абесслаўляюць яго прыроду, якая ў сапраўднасці бязмерна прыгожая ("Спомніліся мне вершы нашых беларускіх паэтаў, каторыя заместа ўслаўляць нашу, папраўдзе харошую прыроду, абесслаўлялі яе") і гэтым падкрэсліваюць штодзённае шэрае і цяжкае жыццё селяніна, не вучаць яго бачыць каля сябе красы, нематэрыяльнага багацця. Дзякуючы крытыцы Вацлава Ластоўскага, беларускія пісьменнікі пачалі сплачваць доўг красы. У сваіх творах яны пачалі славіць нематэрыяльнае багацце Беларусі (прыроду і г.д.).

Доўг красы сплаціў таксама верш "На Беларусі Бог жыве" Уладзіміра Караткевіча. Паэт у ім славіць прыроду Беларусі, кажа, што там многа рэк ("У нас дваццаць з лішнім тысяч рэк / Адзінаццаць тысяч азёр"), дубоў, васількоў ("У хмарах дубоў / У вясёлках агнёў"). Усё гэтае цудоўнае багацце – праца Бога, таму сам пісьменнік сцвярджае, што "На Беларусі Бог жыве". Уладзімір Караткевіч сцвярджае таксама, што Беларусь багатая гасціннымі людзьмі, якія вітаюць усіх з распасцёртымі рукамі ("Гэта край раскрытых душ і дзвярэй"), там многа прыгожых жанчын і верных сяброў. ("А няма нідзе / Вярнейшых сяброў / І прыгажэйшых жанчын").

Трэцім творам, які прычыніўся да сплаты даўгу ёсць верш "Беларусь для мяне – мая родная маці" Янкі Золака. Твор з'яўляецца своеасаблівым гімнам у гонар краю, у якім паэт нарадзіўся ды жыве. У ім аўтар пералічыў шмат розных багаццяў Беларусі –

ад прыроды і прадуктаў чалавечай працы да беларускіх, заслужаных пісьменнікаў, як Купала, Багушэвіч і іншыя. Калі б яго чытаў хтосьці, хто ніколі не бываў у Беларусі, то напэўна падумаў бы, што гэта краіна малака і мёду. Для Золака Беларусь – самае важнае і каштоўнае месца ў свеце, іншага такога няма.

Спадзяюся, што я правільна разгледзела праблему, прадстаўленую ў тэме сачынення. На мой погляд, беларуская літаратура сплаціла доўг красы. З таго моманту, калі ў "Нашай Ніве" паявіўся артыкул Ластоўскага, пісьменнікі пачалі пісаць больш вясёлыя і ўзнёслыя вершы. У іх заключалася радасць, дзякуючы якой бедны беларус мог на хвіліну забыць аб сваіх праблемах і цяжкім жыцці. Яны таксама давалі надзею на тое, што будзе лепш, і вучылі беларусаў шанаваць і захапляцца красою, якая была і ёсць вакол іх.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 15 pkt – w pracy trzy teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, argumentacja rzeczowa, pogłębiona, poparta trafnymi przykładami. Funkcjonalne wykorzystanie kontekstu historycznego i literackiego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi, podział wypowiedzi – zarówno w skali ogólnej, jak i w zakresie podziału na akapity – jest poprawny i funkcjonalny; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 7 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, precyzyjne słownictwo; ortografia – 2 pkt – praca bezbłędna pod względem ortograficznym; interpunkcja – 2 pkt – 2 błędy interpunkcyjne.

Przykład 2.

Вацлаў Ластоўскі нарадзіўся ў 1883 г. у засценку Калеснікі Дзісенскага павету Віленскай губерні. Быў грамадскім і палітычным дзеячам, пісьменнікам, гісторыкам, філолагам і этнографам. Вучыўся на Пецяргбурскім універсытэце. Быў Другім Старшынёй Рады Міністараў БНР, членам Беларускай сацыялістычнай грамады і Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У 1909-19014 г.г. сакратар газеты "Наша Ніва". Рэдагаваў таксама часопісы "Саха", "Беларускі сцяг", газету "Гоман".

У "Нашай Ніве" ў 1913 г. быў надрукаваны яго артыкул пз. "Сплачвайце доўг", у якім гаворыцца пра красу беларускай зямлі і ролю паэта ў жыцці чалавека. У гэтым тэксце звяртаецца ўвагу на тое, што паэтам трэба быць памазнікамі Божымі і прарокамі, якія павінны дапамагчы душам звыклых людзей улавіць красу сваёй зямлі і ўсяго, што ёсць навокал іх. Аднак паводле артыкула рэчаіснасць ёсць іншая – аўтар прыводзіць творы паэтаў, у якіх гаворыцца пра тое, што беларуская зямля ёсць беднай і бруднай (асабліва першы прыведзены твор абесслаўляе яе) і сцвярджае, што ў такі спосаб творыцца доўг красы якой народ дамагаецца ад пісьменнікаў (і няма ў гэтым нічога дрэннага) і які павялічваецца ад пісаня непрыгожых твораў. Ці з цягам часу беларуская літаратура сплаціла гэты доўг? Мне здаецца, што так, але справа ёсць крыху складаная. Дык пачнем ад пачатку.

У беларускай літаратуры было (напрыклад "Песня пра зубра" М. Гусоўскага), ёсць і напэўна будзе шмат прыгожых твораў, якія гавораць пра незвычайную прыгажосць

беларускай зямлі. Такія творы пісаў нават Янка Купала, які жыў ў час нашаніўскага перыяду, а прыкладам няхай будзе тут верш “Лета”. У гэтым творы расказваецца пра прыгажосць беларускай прыроды ў час летняй пары. Трэба аднак заўважыць, што ў цяжкія часы перад вайной нялёгка было пісаць такія творы, таму што трэба было ўсведамляць людзей, асабліва сялян (верш “Мужык”) сцеражчыся царскіх чыноўнікаў (адгэтуль узяліся псеўданімы пісьменнікаў), а потым змагацца за айчыну.

З цягам часу доўг красы быў сплачваны, паяўлялася больш твораў пра прыгажосць Беларушчыны. Я мог бы тут прыгадаць выдатную “Новую зямлю” Якуба Коласа, але хачу паглядзець на крыху навейшыя творы (тым больш, што з увагі на спецыфічную сітуацыю вобраз беларускай зямлі не быў прыгожы ў нашаніўскіх творах) і праверыць, як чарговыя пакаленні “сплацілі доўг”. Тут я хачу прыгадаць цікавы твор Уладзіміра Караткевіча – “На Беларусі Бог жыве”. Гэты словы, тую праўду, паводле твора кажуць простыя людзі. Але гэта толькі пачатак, Божая моц і незвычайная прыгажосць выліваюцца з усіх элементаў Беларушчыны і беларускасці: мовы, зор, дубоў, людзей, а нават і з расы. Беларусь – гэта краіна раскрытых душ і дзвярэй, тысячы рэк і азёр. А калі Бог шле на гэтую зямлю кару і гнеў, гэта толькі доказ яго сужыцця з беларусамі. Як бачым, у гэтым вершы няма сказанага нічога дрэннага пра Беларусь.

Хачу таксама прыгадаць верш Янкі Золака “Беларусь для мяне мая родная маці”, у якім таксама ніхто на зневажае Беларусі. Яна для лірычнага героя ёсць проста айчынай, у якой элементах ён бачыць хараство. У вершы звяртаецца ўвагу на беларускую прыроду і багатую гісторыю.

Падсумоўваючы – беларуская літаратура сплаціла доўг красы, але не назаўсёды. Негледзячы на тое, ці ёсць вайна, акупацыя ці пакой, душы чалавека трэба (больш ці менш) духоўнай стравы, якая знаходзіцца ў выдатных (нават і на свой спосаб) творах, а яе імя: прыгажосць.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 12 pkt – w pracy dwa teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, a trzeci – częściowo funkcjonalnie, bogata argumentacja, funkcjonalne wykorzystanie kontekstu biograficznego i literackiego. Wypowiedź świadczy o erudycji zdającego.
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 3 pkt – układ i sposób przedstawienia treści pomaga w zrozumieniu wypowiedzi; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – jest stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 5 pkt – zróżnicowana składnia i leksyka, poprawna frazeologia, 7 błędów językowych; ortografia – 0 pkt – 4 błędy ortograficzne; interpunkcja – 1 pkt – 5 błędów interpunkcyjnych.

Przykład 3.

Беларуская краса гэта перад усім прыгажосць яе прыроды, гасцінныя і добрыя людзі, працавітасць беларускага народа. Гэта вялікае натхненне для мастакоў, але не ўсе з іх умелі гэта паказаць. Некаторыя з іх пісалі пра тое як брыдкай краінай ёсць Беларусь. Яны не шанавалі сваёй айчыны. Часта паказвалі яе беднай і адсталай краінай. Былі таксама пісьменнікі, якія сплацілі даўгі гэтых людзей і расхвалілі беларускую красу ва ўсім свеце. Тэкст Юркі Верашчакі “Сплачвайце доўг” выклікае іншых мастакоў, штобы яны паказвалі прыгажосць Беларусі ў сапраўдны спосаб. Гэта праблема вельмі важна таму, што людзі з-за мяжы кажуць пра красу беларускага краю, а родны народ яе не бачыць. Аўтар заклікае, штобы гэта змяніць і кахаць простые рэчы, як пах зямлі, гасціннасць, хлеб і соль ці вышываныя ручнікі на іконах. Сам піша, як цудоўнае месца на зямлі гэта Беларусь. Гэты край ёсць самым цікавым паэтычным
і таямнічым. Тут добра жыць і працаваць. Зямлю бацькоў і сваю айчыну выхваляе ў вершы “Зямля бацькоў” Людміла Воранава. Лірычнае “я” кажа пра сялянскія сімвалы Беларусі і яе прыгожую прыроду. Апісвае традыцыі і месцы у якіх бачыць свае ўспаміны. Яе бацьку і дзеда клічуць беларусамі і гэта самы гонар. Вяртанне да айчыны гэта шчасце, а родная зямля гэта самые добрые вартасці: жыццё, багацце вера і любоў. Для лірычнага героя няма месца якое мае ў сабе больш красы як бацькаўшчына, дзе неба яснае а на яго блакіце ляціць птушка бусел. Гэтай красы без канца і яна будзе вечна трвала. Так чалавек адчувае сябе “лёгкім” і проста “ляціць”. “Беларусь для мяне – мая родная маці... ужо сам загаловак верша паказвае любоў да роднага краю – Беларусі. Яна ёсц карміцелькай цэлага беларускага народа. Тут жывуць мужыкі, але таксама паны ці мастакі. Усім гэтым лудзям на Беларусі хватае места. Яны маюць дамы і яны тут маюць працу. Усе згодна жывуц. Беларусь гэта багаты край авоцамі і булбай. Яна добрая маці, якая дбае і занімаецца пра все дзеці.

Беларуская літаратура хіба сплаціла доўг красы. Пісьменнікі і паэты ў сваіх творах малююць вобразы прыгожай Беларусі. Іх апісы захапляюць, чытачу здаецца, што час там затрымаўся, жыццё спакойнае і людзі вельмі шчаслівыя. Прыйшоў час, калі Беларусь ёсць гонарам тварцоў і яны смела выхваляюць яе красу.

**1. Spełnienie formalnych warunków polecenia:** 1 pkt – forma wypowiedzi zgodna z formą wskazaną w poleceniu – wypowiedź argumentacyjna; zostały uwzględnione wszystkie elementy polecenia.
**2. Kompetencje literackie i kulturowe:** 10 pkt – w pracy dwa teksty wykorzystane w pełni funkcjonalnie, a trzeci – częściowo funkcjonalnie, zadowalająca argumentacja, kontekst wykorzystany częściowo funkcjonalnie
**3. Kompozycja wypowiedzi:** struktura wypowiedzi – 2 pkt – usterki w zakresie podziału tekstu na akapity; spójność wypowiedzi – 3 pkt – wypowiedź stanowi logiczną i uporządkowaną całość; styl – 1 pkt – w przeważającej części stosowny.
**4. Język wypowiedzi:** zakres i poprawność środków językowych – 0 pkt – składnia i leksyka stosowne, 16 błędów językowych; ortografia – 0 pkt – 5 błędów ortograficznych; interpunkcja 1 – pkt – 8 błędów interpunkcyjnych.

# Uchwała Rady Głównej Nauki i Szkolnictwa Wyższego oraz Konferencji Rektorów Akademickich Szkół Polskich o informatorach maturalnych od 2023 roku

Rada Główna Nauki i Szkolnictwa Wyższego

KONFERENCJA REKTORÓW KRASP AKADEMICKICH SZKÓŁ POLSKICH

**Uchwała**
**Rady Głównej Nauki i Szkolnictwa Wyższego**
**oraz**
**Konferencji Rektorów Akademickich Szkół Polskich**
**z dnia 19 listopada 2020 r.**
**w sprawie informatorów o egzaminie maturalnym od roku 2022/2023**

Rada Główna Nauki i Szkolnictwa Wyższego oraz Konferencja Rektorów Akademickich Szkół Polskich systematycznie i z uwagą obserwują egzamin maturalny, który stanowi podstawowe źródło informacji o poziomie przygotowania kandydatów na studia w polskich uczelniach. W zgodnej opinii obu instytucji przedstawicielskich środowiska akademickiego polski system egzaminacyjny dostarcza w tym zakresie w pełni wiarygodnych i opracowanych na czas danych. Zaufanie do tego systemu przekonująco potwierdziła KRASP wiosną tego roku, deklarując wolę odłożenia rekrutacji do szkół wyższych do czasu, gdy będzie możliwe bezpieczne przeprowadzenie egzaminu maturalnego w roku pandemii.

Drugim, bardzo istotnym zadaniem, które konsekwentne realizuje polski system egzaminacyjny jest wskazywanie za pomocą publikowanych materiałów kierunku rozwoju kształcenia w poszczególnych przedmiotach w stronę umiejętności złożonych, niezbędnych zarówno na studiach, jak i – w coraz większym stopniu – w życiu codziennym.

Ważną rolę w tym procesie odgrywają informatory o egzaminie maturalnym. Z jednej strony wydobywają oraz ilustrują za pomocą zadań najważniejsze wymagania podstawy programowej kształcenia ogólnego. Z drugiej strony, wiarygodnie informują kolejne pokolenia maturzystów o strukturze egzaminu maturalnego oraz o sposobie oceniania ich prac. W naszej opinii, przedłożone do zaopiniowania informatory dobrze realizują te cele.

Środowisko akademickie docenia starania systemu egzaminacyjnego o to, by systematycznie doskonalić swoją pracę i deklaruje dalsze wsparcie merytoryczne tych działań.

prof. dr hab. Zbigniew Marciniak
Przewodniczący Rady Głównej
Nauki i Szkolnictwa Wyższego

prof. dr hab. Inż. Arkadiusz Mężyk
Przewodniczący Konferencji Rektorów
Akademickich Szkół Polskich

**EGZAMIN MATURALNY**

# Język białoruski

## *Z opinii Recenzentów:*

*Informator o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej od roku szkolnego 2022/2023* został opracowany niezwykle skrupulatnie i starannie. Informacje na temat egzaminu są przejrzyste. Wymagania są zgodne z podstawą programową. W zadaniach przewidziano sprawdzanie umiejętności odbioru tekstu nieliterackiego (publicystycznego, popularnonaukowego), analizy tekstów literackich (proza, poezja, dramat) oraz tekstów ikonograficznych (np. obrazy plastyczne/ sztuka malarska). Na wyróżnienie zasługują tematy wypracowań dotyczące wartości, zarówno narodowych (np. język, niezależność, mała ojczyzna, tradycje narodowe), jak i uniwersalnych (np. miłość, wolność, matka).
Treści zawarte w informatorze zawierają wartościowe wskazówki dla uczniów przygotowujących się do egzaminu maturalnego z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej.

**dr hab. Jadwiga Kozłowska-Doda**

Informator przedstawia przykładowe zadania egzaminacyjne wraz z rozwiązaniami oraz wskazuje odniesienie zadań do wymagań podstawy programowej. Składa się z dwóch części: w pierwszej znajdują się zadania dla poziomu podstawowego, w drugiej – dla poziomu rozszerzonego. Zadania testowe sprawdzają różne umiejętności z nowej podstawy programowej. Na uwagę zasługują zadania na poziomie rozszerzonym do tekstów krytycznoliterackich, które pozwalają nie tylko na sprawdzanie znajomości obowiązkowych tekstów literackich, ale również tekstów kultury, umiejętności interpretacyjnych oraz umiejętności mających duże znaczenie w różnych sytuacjach komunikacyjnych.

**prof. dr hab. Mikałaj Chaustowicz**

EM 23

ISBN 978-83-66725-13-3